№ 4 (458) 27 студзеня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Мілінкевіч ідзе на абвастрэньне

«Галасуем а 12-й — і на цягнік». Старонка 4.

## Лукашэнка прасіў сустрэчы з Салянам

Такую інфармацыю мы атрымалі ад крыніцы ў пасольстве адной з эўрапейскіх краінаў. Гэтая просьба была перададзеная міністрам замежных справаў Сяргеем Мартынавым. **Старонка 4.**

## Тры Аляксандры, Сяргей і Зянон

Слабейшыя кандыдаты сыходзяць з дыстанцыі. **Старонка 4.**

## Мэркель запрасіла Мілінкевіча ў Нямеччыну

Графік паездак новага лідэра апазыцыі. **Старонка 5.**

## Што Казулін рабіў у Маскве?

Таямнічы візыт доўжыўся тыдзень. **Старонка 7.**

# Справа Касьпяровіча



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Актывіст нацыянальнага руху садраў чырвона-зялёны сьцяг з даху Менгарвыканкаму. Цяпер яму пагражае год «хіміі». Як усё было насамрэч? **Старонка 14.**

**Падпішыся сёньня!** Каб гарантавана чытаць «НН», дашліце ў Рэдакцыю свой адрас. Дэталі, сьпіс ахвярадаўцаў «НН» — **старонка 9**.

Вынікі збору ахвяраваньняў за сьнежань — **старонка 11.**

## Бялорусі нікт не здусі



AG

**У Польшчы ўздымаецца хваля салідарнасьці з Свабоднай Беларусьсю. Старонка 22.**

# Карлікі й ліліпуты беларускага мовазнаўства

Правёўшы фанэтычны аналіз, скажыце: хто меншы па памерах — карлік ці ліліпут? Адказаць на гэтае пытаньне мусілі ўдзельнікі абласных алімпіядаў. **Старонка 20.**

## Янка Лайкоў: «Мы жывём у вольнай краіне»

26-гадовы паэт перайшоў у Чаргінцоў саюз. **Старонка 7.**



# у нумары

## факты і камэнтары


Тры Аляксандры, Сяргей і Зянон .......... 4
«Галасуем а 12–й — і на цягнік» .......... 4
Лукашэнка прасіў сустрэчы з Салянам .......... 4
Мэркель запрасіла Мілінкевіча .......... 5
Рэйтынг Адзінага можа дасягнуць… .......... 5
«Юрыдычныя моманты — не галоўнае» .......... 6
Каму выгадная рэгістрацыя Пазьняка? .......... 6
Што Казулін рабіў у Маскве .......... 7
Янка Лайкоў: «Мы жывём у вольнай краіне» .......... 7
Муж Натальлі Пяткевіч узначальвае «Лятарэі» .......... 7
Балтыйскі «Gallup»: у Менску Мілінкевіч і Лукашэнка набіраюць пароўну .......... 8
Згарэлі кнігі Быкава і Гілевіча .......... 17
Ліліпуты і карлікі беларускага мовазнаўства .......... 20


## мы самі


Шукаем падпісчыкаў «НН»!!! .......... 10
Вынікі збору ахвяраваньняў за сьнежань .......... 11


## хроніка


Сьціслая хроніка рэпрэсій і супраціву .......... 12
Справа Касьпяровіча .......... 14
Як адбываецца сачэньне .......... 16


## культура


Гангста–рэп зь Беларусі .......... 18
Дыскаграфія .......... 18
Андэграўнд: панк–канцэрт .......... 31
Шанцаваньне Кастуся Харашэвіча .......... 34


## з усіх старон


Залік па рэвалюцыі .......... 21
Ібрагім Ругова .......... 39


## аўтарскія рубрыкі


Павал Севярынец. Лісты зь лесу: Партызанская зона .......... 12
Аляксандар Класкоўскі. Палітычная кухня: Крэмль зацьвердзіў Мілінкевіча? . 24
Лёлік Ушкін. Левым вокам: Як стаць зоркай .......... 25
Віталь Тарас. Іншымі словамі: Воблака ў штанах .......... 28


## пошта рэдакцыі


Пішуць чытачы .......... 8
Лісты і водгукі .......... 26
Час волі. Артыкул Міколы Статкевіча .......... 27


## стыль жыцьця


Не шкадуючы жывата свайго. Антон Анціпаў — супэрмадэль–беларус .......... 30
З дому з ласосем на шыльдзе .......... 32
А хто іх пільнаваў, тых рэцэптаў? .......... 33


## літаратура


Паэты не паміраюць. Валянцін Тарас пра Навума Кісьліка .......... 36
Уладзімер Някляеў. Знакі прыпынку .......... 39
Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы .......... 40
Андрэй Хадановіч. Ціхі анёл над гняздом зязюлі .......... 42
Газэтка дзеткам: бавіць жабка жабяня .......... 44


## калі б…


Перавагі сэксу на марозе .......... 43
Вясёлыя карцінкі .......... 47


## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

Перадусім дзякую тым людзям, якія ў 25-градусны мароз на мінулым тыдні даносілі газэту чытачам.

У жыцьці заўжды ёсьць месца подзьвігу. Што ёсьць геройства сёньня? Якія ўчынкі зь сёньняшняга дня ўвойдуць у хрэстаматыі беларускага ўчынку? Чыімі імёнамі заўтра назавуць вуліцы нашых гарадоў?

Адказ на пытаньне “што ёсьць учынак сёньня” тоесны з адказам на пытаньне, што такое рэальная палітыка і хто такі рэальны палітык сёньня. Той, хто геройствуе языком, ці майстар неардынарных рэзанансных ўчынкаў? Як Зьміцер Касьпяровіч, які сарваў сьцяг рэжыму зь Менгарвыканкаму? “Справа Касьпяровіча” — **старонка 14**. Для мяне ў гэтым матэрыяле асабліва каштоўныя сьведчаньні ягоных сяброў. Праходзячы праз турму, чалавек пачынае ясьней бачыць.

Геройства заўжды выпадковае, эпізадычнае. Геройства не заплянуеш. Гэта адказ на момант. Але гэта вынік цьвёрда зробленага выбару, вынік настрою.

Каб у краіне памянялася ўлада, патрэбнае геройства. Узьняць людзей на геройства можа фэерыя, разьняволеная творчасьць. Свабода. Апазыцыя нясе гэтае слова на штандарах, але рэзанансных учынкаў ёй бракавала, у тым ліку і першыя чатыры месяцы пасьля абраньня Мілінкевічам новым лідэрам. Ягоныя апошнія заявы скіраваныя на абвастрэньне сытуацыі. Ці азначае гэта, што ў палітыку вернецца драйв? **Старонка 4**.

Адзін зь незалежных сацыёлягаў расказаў мне, што выявілі апошнія дасьледаваньні: 80% беларусаў пэўныя, што выбары падтасоўваюцца. І іншае — упершыню за лукашэнкаўскі час такая вартасьць, як “свабода”, стала больш важыць для людзей, чым “дабрабыт”. Гэта праява фундамэнтальных зьменаў у сьвядомасьці. Яны яшчэ не артыкуляваліся ва ўчынкі, але працэс ідзе. Зьвярну ўвагу на артыкул Міколы Статкевіча, пісаны ў высылцы, — **старонка 27**.

Гісторык — і адаратар, што немалаважна — матэрыяльнай культуры Алесь Белы раскапаў гісторыю моднага напою “Крамбамбуля”. **Старонка 32.** Дырэктар рэстарацыі “Грунвальд” Аляксандар Астрашэўскі асабіста ўзнаўляў традыцыю гатаваньня старадаўняга трунку. Журналіст “НН” выправіўся ў “Грунвальд” “Крамбамбулі” паспытаць. У такі мароз гэта надзвычай прыемна.

# у кнігарнях з 20 студзеня




Замовы ад прыватных асобаў (029) 643–57–33, arche@arche.org.by

# Тры Аляксандры, Сяргей і Зянон

Збор подпісаў завершаны. Слабейшыя прэтэндэнты пакінулі выбарчую гонку.

26 студзеня — Сяргей Скрабец. 9 студзеня — Аляксандар Вайтовіч. Валер Фралоў вагаецца. Дакумэнты на рэгістрацыю кандыдатамі ў прэзыдэнты будуць падаваць пяцёра дзядзькаў: тры Аляксандры, Сяргей і Зянон. Валер, магчыма, стане шостым дзядзькам. Усе дэкляруюць, што набралі больш за 100 тысячаў подпісаў.

Узгадайма выбары 2001 году. Да апошняга пра пасьпяховы збор 100 тысячаў подпісаў паведамлялі Зянон Пазьняк, Міхаіл Чыгір, Павал Казлоўскі, Міхаіл Марыніч, Леанід Сініцын, Леанід Калугін, Юры Шыцік (Данькаў), Аляксандар Ярашук, Віктар Цярэшчанка, Мікалай Мякека й Канстанцін Канановіч. Толькі ў Сяргея Калякіна хапіла сумленьня адразу прызнаць, што пары тысячаў усё ж не хапіла. Пасьля аказалася, што ўсе яны да ста тысячаў не дабралі.

Сабраць 100 тысячаў подпісаў сёлета, у маразы, без структураў, групай у тысячу адных і тых жа чалавек, мяркуем, ня можна ў прынцыпе. Столь — 45—50 тысячаў. Вайтовіч хутка зразумеў гэта. Каманда генэрала да канца захоўвае «добрую міну»: за вылучэньне кандыдатам у прэзыдэнты Валер’я Фралова сабрана 106 тысяч подпісаў, цьвердзіць кіраўнік ініцыятыўнай групы Ігар Азарка. І зьбіраецца здаваць попісы. Сам Фралоў ужо другі тыдзень знаходзіцца ў Расеі.

Цяпер пра галоўнае. Зянон Пазьняк паабяцаў: калі будзе зарэгістраваны кандыдатам у прэзыдэнты, дык вернецца ў Беларусь.

Мілінкевіч заявіў, што нават у выпадку нерэгістрацыі ён будзе даводзіць самастойную кампанію да 19 сакавіка.

Што прадпрыме Казулін? Тут — галоўная інтрыга на сёньня. Менавіта ад былога рэктара залежыць, ці пойдзе апазыцыя на выбары адзінай. Ягоны рэйтынг не перавышае трох адсоткаў. Але калі ягоная стратэгія палягае ў пашырэньні вядомасьці ў грамадзтве і надалей — у абраньні дэпутатам палаты прадстаўнікоў у 2008 годзе, дык тады ён ня здымецца.

Тымчасам 28 студзеня тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі распачнуць праверку подпісаў. Потым іх жа пераверыць ЦВК. Кандыдаты ж будуць прадстаўляць заявы пра згоду стаць кандыдатам, анкеты й падатковыя дэклярацыі на сябе й сваякоў. 11 лютага праверка скончыцца й пачнецца рэгістрацыя. Мікалай Лазавік кажа, што рэгістрацыя (альбо нерэгістрацыя) адбудзецца ў адзін дзень (крайні тэрмін — 21 лютага).

**Зьміцер Дрыгайла**

**Мілінкевіч мае сустрэцца з Пазьняком і Казуліным**

Магчыма, у хуткім часе ў Варшаве ўсё ж адбудзецца сустрэча Пазьняка зь Мілінкевічам. Мяркуецца, што на ёй кандыдаты дамовяцца пачакаць з рэзкімі крокамі да рэгістрацыі. Таго самага рашэньня можна чакаць ад сустрэчы Мілінкевіча з Аляксандрам Казуліным, заплянаванай на 28 студзеня.

## Мілінкевіч ідзе на абвастрэньне: «Галасуем а 12-й — і на цягнік»

Мілінкевіч радыкалізуецца. Па меры таго як становіцца ясна, што ў выбарчыя камісіі ня ўключаць ніводнага незалежнага ад уладаў чалавека, апазыцыя траціць надзею на сумленны падлік галасоў. На апошніх сустрэчы ў рэгіёнах — у Смаргонь, Ашмяны, Горадню — Аляксандар Мілінкевіч прыехаў зь ясным пасланьнем да прыхільнікаў. Ён заклікаў іх галасаваць 19 сакавіка ад 12-й да 14-й, сядаць на цягнік ці іншы транспарт і кіравацць у Менск.

«Мы выйдзем на плошчу, і нас будзе багата, у руках будуць таблічкі з назвамі розных гарадоў і мястэчак — хто адкуль прыехаў. Толькі так мы здольныя будзем адстаяць свой выбар», — падкрэсьліў Мілінкевіч.

Ягоны штаб разглядае некалькі варыянтаў збору людзей у сталіцы для сустрэчы з кандыдатам. Сярод іх — Кастрычніцкая плошча, плошча Свабоды, Прывакзальная плошча.

**ЗД**

## Лукашэнка прасіў пра сустрэчу з Салянам

Працяг са старонкі 1.

Гэты ліст прымусіў эўрапейскіх дыпляматаў зь вялікай доляй імавернасьці сьцьвярджаць, што кандыдат ад апазыцыі будзе зарэгістраваны. Інакш не было б сэнсу ў падобным дыпляматычным сыгнале.

Аднак Брусэль устрымліваецца ад любых крокаў, якія лукашэнкаўцы здолелі б выкарыстаць у прапагандысцкіх мэтах. Таму Менск паінфармавалі пра немагчымасьць сустрэчы з найвышэйшым прадстаўніком Эўразьвязу ў справах замежнай палітыкі і бясьпекі. Замест гэтага Беларусі прапанавалі прыняць супольную эўрапейска-амэрыканскую місію ў складзе Пэта Кокса, былога старшыні Эўрапарлямэнту, і Дэніэла Фрыда, былога пасла ЗША ў Польшчы, а цяпер намесьніка дзяржсакратара ЗША па пытаньнях Эўропы і Эўразіі.

Пацьвярджэньня гэтай інфармацыі ад беларускіх дыпляматаў мы ня маем.

Лукашэнкаўцы любяць рабіць двухсэнсоўныя сыгналы сусьветнай супольнасьці напярэдадні важных палітычных падзеяў. У свой час праходзіла інфармацыя, што перад выбарамі 2001 г. кіраўнік Беларусі перадаваў праз Міхаіла Гарбачова ліст да Джорджа Буша.

**Мікола Бугай**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Падчас наведваньня Жодзіна Аляксандар Мілінкевіч сустрэўся зь Янкам Лапіцкім — адзіным вучнем адзінай беларускай клясы гораду. Мілінкевіч пажадаў Янку посьпехаў і перадаў беларускія дзіцячыя кніжкі. Сустрэча адбывалася на марозе, бо мясцовая ўлада забараніла дырэктару гімназіі пускаць Мілінкевіча ў памяшканьне.**

# Мэркель запрасіла Мілінкевіча ў Нямеччыну

Аляксандар Мілінкевіч рэпрэзэнтуе Свабодную Беларусь у Эўропе. У сераду А.Мілінкевіча разам з жонкай Інай прымалі прэзыдэнт Польшчы Лех Качыньскі, сьпікеры Сэйму й Сэнату, прэм’ер-міністар. У Сэйме Адзінага сустрэлі авацыяй і вялікім бел-чырвона-белым сьцягам, а прэзыдэнт Качыньскі заявіў аб поўнай падтрымцы аб’яднаных дэмакратычных сілаў.

У чацьвер Мілінкевіч мае прысутнічаць на паседжаньні Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы, прысьвечаным выбарам у Беларусі. А пры канцы тыдня лідэр апазыцыі сустрэнецца зь менскім актывам — сябрамі ініцыятыўнай групы. Хутка надыдзе чарга і для візыту А.Мілінкевіча ў Нямеччыну, на асабістае запрашэньне фэдэральнага канцлера Ангелы Мэркель.

А.Мілінкевіч ужо спаткаўся з кіраўніцтвам Чэхіі, з Вацлавам Гаўлам, міністрамі замежных справаў Украіны й Францыі, кіраўніцтвам Дзярждумы Расеі, прэзыдэнтам Літвы.

**ЗД**

# Рэйтынг адзінага можа дасягнуць 35% ужо да пачатку агітацыі

«Калі нехта з прэтэндэнтаў, апроч Мілінкевіча, кажа вам, што ён бы зьняўся, ды электарат не зразумее — ня верце яму», — сказаў прафэсар Алег Манаеў, прэзэнтуючы вынікі чарговага сацыялягічнага апытаньня, зробленага групай сацыёлягаў пад ягоным кіраўніцтвам. Яно высьветліла, што прыхільнікі пераменаў для атрыманьня станоўчага выніку мусяць кансалідаваць свае намаганьні.

«Відавочна, што Лукашэнка застаецца галоўным гульцом на электаральным полі. Прычым ягоны рэйтынг практычна не мяняецца пры любых камбінацыях. Але ён ужо не адзіны гулец», — кажа сацыёляг. Другі такі гулец — Аляксандар Мілінкевіч. «Вынікі апытаньня сьведчаць, — кажа А.Манаеў, — што электараты Казуліна, Фралова, Пазьняка й іншых дэмакратычных палітыкаў гатовыя за яго прагаласаваць у найбольшай ступені. А ў электарату Мілінкевіча гэтага перацяканьня няма.

А.Манаеў адзначыў, што, калі апрача А.Мілінкевіча ў бюлетэнях будзе яшчэ нехта, галасы прыхільнікаў пераменаў расьцярушацца, а таксама павялічыцца колькасьць тых, хто прагаласуе супраць усіх.

У выпадку, калі А.Мілінкевіч застанецца адзіным дэмакратычным кандыдатам, ягоны рэйтынг можа дасягнуць 35% яшчэ да пачатку пэрыяду агітацыі.

Дарэчы, у аўторак Вярхоўны суд Беларусі задаволіў пазоў Мін’юсту аб спыненьні дзейнасьці грамадзкага аб’яднаньня «Беларускія фабрыкі думак», кіраўніком якой зьяўляецца якраз Алег Манаеў. Гэтая асацыяцыя арганізацый была заснаваная ў чэрвені 1997 году і ў свае лепшыя часы гуртавала 18 дасьледніцкіх арганізацыяў. Арганізацыі закідаецца знаходжаньне юрыдычнага адрасу ў жылым фондзе.

**Зьміцер Дрыгайла**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Ініцыятыўная група Пазьняка заяўляе пра збор 120 тысячаў подпісаў.**

# «Юрыдычныя моманты — не галоўнае»

Ідэя Народнага галасаваньня нерэалістычная, мяркуе штаб Мілінкевіча.

Аляксандар Мілінкевіч «пакуль не падтрымлівае» ідэі пра г.зв. Народнае галасаваньне, якую прапанаваў старшыня КХП-БНФ Зянон Пазьняк. Адказваючы на пытаньні на форуме радыё «Свабода», А.Мілінкевіч выказаў меркаваньне, што такая ідэя можа дэмабілізаваць выбаршчыкаў, пасеяць у іх нявер’е ў перамогу, замест таго каб ствараць грамадзянскую актыўнасьць. «Калі б можна было растлумачыць большасьці беларусаў сэнс ідэі, дзе ўзяць альтэрнатыўны бюлетэнь, куды занесьці афіцыйны, на нешта можна было б разьлічваць. Але такіх магчымасьцяў сёньня няма».

Сапраўды, куды бюлетэні несьці ў правінцыі, з каго ствараць «грамадзкую камісію» — няясна. Дый нават калі камісія будзе створаная, хто будзе «перадаваць уладу часоваму ўраду»? Намесьнік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч лічыць, што людзям трэба прапанаваць менш абавязвальны сцэнар. Бо ня колькасьцю бюлетэняў вырашыцца вынік гэтай кампаніі: «Галоўнае не юрыдычныя моманты доказу легітымнасьці ці нелегітымнасьці, а рэальная падтрымка з боку грамадзтва. А такая падтрымка ў альтэрнатывы можа быць, калі грамадзтва ўспрыме тры пасланьні: што апазыцыя аб’ядналася, што знайшла пэрсону, што распрацавала праграму».

В.а.старшыні КХП-БНФ у Беларусі Юры Беленькі парыруе, што НГ перадусім інсьпіруе людзей выходзіць на плошчу: «Калі мы гаворым пра крытычную масу выбаршчыкаў, якія мусяць вырашыць сытуацыю на Майдане, то яны павінны псыхалягічна сасьпець да гэтага выхаду. Давайце прапануем выбаршчыку зрабіць першы крок, зрабіць учынак, узяць гэты бюлетэнь, пакласьці ў кішэню і вынесьці».

У панядзелак кіраўнік штабу адзінага прэтэндэнта Сяргей Калякін сустрэўся з кіраўніком ініцыятыўнай групы Зянона Пазьняка Сяргеем Папковым. Дамовіліся, што да гэтай размовы варта вярнуцца пасьля здачы подпісаў у выбарчыя камісіі, бліжэй да рэгістрацыі. Але магчыма, што ўсё праясьніцца й раней. Сустрэча Аляксандра Мілінкевіча зь Зянонам Пазьняком магла адбыцца ў Варшаве ў сераду не адбылася. Але абодва ня супраць сустрэцца.

**Зьміцер Дрыгайла**

РЭПЛІКА

## Каму выгадная рэгістрацыя Пазьняка?

Бальшыня камэнтатараў паставіла крыж на рэгістрацыі Пазьняка. Маўляў, харызматыка ў кампанію ня пусьцяць. Аналітыкі старанна дакопваюцца, што Лукашэнку выгадна, а што не. Каб жа яны з такім імпэтам шукалі, што выгадна апазыцыі...

Але вернемся да Лукашэнкі. Чаму б дзейнаму лідэру было нявыгадна, каб сьледам за ім на п’едэстале гэтай кампаніі натуральным чынам апынуліся Пазьняк зь Мілінкевічам? Папершае, элегантная перамога. Па-другое, козыр у гульні з Масквой: бачыце, нацыяналісты на пяты наступаюць, ледзь стрымліваю, дайце яшчэ прэфэрэнцыяў!

Зрэшты, гэтым разам уладзе, можа, і не да элегантнасьці. У кожным разе, збор подпісаў за дзейнага лідэра ідзе пад ягоным жа дэвізам: куды вы падзенецеся!..

Некаторыя аналітыкі адзначалі, што Масква кроўна зацікаўленая ў тым, каб Беларусь заставалася ў міжнароднай ізаляцыі, а беларуская палітычная сыстэма — дэспатыяй, бо толькі ў гэтым выпадку Масква можа працягваць дамінаваць між Дняпром і Бугам. Нерэгістрацыя Пазьняка, якая пазбавіць яго магчымасьці вярнуцца ў краіну, будзе выгадная найперш Маскве. Вяртаньне лідэра нацыянальнай правіцы ў палітычны працэс наадварот было б крокам краіны да нармальнасьці.

**Мікола Бугай**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Усяго 46 літаратараў падалі заявы на выхад з Саюзу беларускіх пісьменьнікаў, каб перайсьці ў Чаргінцоў СПБ. У большасьці гэта супрацоўнікі холдынгу «Літаратура і мастацтва». Пра прычыны пераходу для «НН» распавядае супрацоўнік газэты «ЛіМ» 26-гадовы паэт Янка Лайкоў, якога Вольга Іпатава называла адной з надзеяў беларускага пісьменства.

# Янка Лайкоў: «Мы жывём у вольнай краіне»

**«Наша Ніва»: Мы размаўлялі пасьля ўстаноўчага зьезду Саюзу пісьменьнікаў Беларусі. Тады Вы казалі, што ня ўдзельнічалі ў зьезьдзе. Што змусіла перамяніць рашэньне?**

**Янка Лайкоў:** Гэта маё абсалютна самастойнае рашэньне. Мы жывём у вольнай краіне, дзе кожны чалавек мае права ўступаць у творчыя саюзы і выходзіць зь іх. Я амаль пяць год быў у складзе старога Саюзу. За гэтыя 5 год ні Іпатавай, ні Пашкевічам (пры ўсёй маёй павазе да гэтых людзей) у Саюзе для беларускай літаратуры нічога істотнага не было зроблена. Хіба што выдавалі «Дзеяслоў»... Таму я вырашыў уступіць у новы Саюз.

**«НН»: Чаго не рабіў стары Саюз і чым у гэтым пляне ад яго будзе розьніцца новы?**

**ЯЛ:** Думаю, новы Саюз будзе працаваць лепш, чым ранейшы. Там людзі, якія больш адказна ставяцца да сваёй справы.

**«НН»: Кіраўніцтва Саюзу беларускіх пісьменьнікаў — беларускамоўнае. Кіраўнік новай арганізацыі — расейскамоўны Чаргінец. Вы лічыце, гэта спрыяе беларускай літаратуры?**

**ЯЛ:** Тут нічога страшнага няма: беларуская мова жыла і будзе жыць. Усе літаратары: і тыя, якія пішуць на беларускай мове, і тыя, якія пішуць на расейскай, — належаць Беларусі. І раздражняе, калі нехта спрабуе сабе прысвоіць Беларусь: купка людзей зьбярэцца і кажа, што Беларусь — гэта мы і ніхто іншы. На самай справе, Беларусь належыць усім нам, і мы ўсе належым Беларусі.

**«НН»: У Саюз пісьменьнікаў прынята даваць рэкамэндацыі...**

**ЯЛ:** У новы Саюз пісьменьнікаў чалавек, які зьяўляюся сябрам старога Саюзу, прымаецца аўтаматычна — без рэкамэндацыяў.

**«НН»: А ў «стары» Саюз хто Вам даваў рэкамэндацыю?**

**ЯЛ:** Алесь Пісьмянкоў і Рыгор Барадулін.

**«НН»: Многія называюць новы Саюз раскольніцкім.**

**ЯЛ:** Я не падзяляю такі пункт гледжаньня. Думаю, непрынцыпова, у якім Саюзе быць. Галоўнае — творчасьць, літаратура. Для мяне гэта прыярытэт.

**Гутарыў
Адам Воршыч**

**Янка Лайкоў, з кнігі «Вогнепаклоньнік»**

* * *

Я дарма не імкнуся да веры,
за імкненьне плачу сумленьнем,
за сумленьне — вякамі,
за вякі — дарогамі,
за дарогі — пазнаньнем,
за пазнаньне — самім сабою.

ГАЗЭТНЫ ШАПІК

## Муж Натальлі Пяткевіч узначальвае «Нацыянальныя спартовыя лятарэі»

Пра гэта паведамляе «БДГ. Деловая газета». «Нацыянальныя спартовыя лятарэі» вядомыя арганізацыяй папулярнай гульні «Супэрлято». У сьнежні яна абышла паводле папулярнасьці іншую — «Ваша лято», заснаваную фірмай-канкурэнткай «Беларускія лятарэткі». Паводле ацэнкі «БДГ», толькі за 10 месяцаў мінулага году «Беларускія лятарэі» зарабілі пад 22 млрд рублёў. Аналягічную суму яны выплацілі на прызы. А прыбытак «Нацыянальных спартовых лятарэяў» мусіць быць параўнальны.

«Супэрлято» паставіла летась своеасаблівы рэкорд — 1,5 млн прададзеных квітоў перадНавагодняга тыражу. Прага лёгкага ўзбагачэньня гоніць людзей да гульні, перамагаюць у якой нямногія.

«Супэрлято» курыруецца Міністэрствам спорту й турызму. Кіраваньне такім прадпрыемствам робіць сям'ю Пяткевіч ня самай беднай у Беларусі. Нездарма, мусіць, тутэйшыя «крэмлязнаўцы» называлі намесьніцу кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі фаварыткаю палацавых раскладаў.

**Аглядальнік**

ІНТРЫГА

## Што рабіў Казулін у Маскве

Цэлы мінулы тыдзень Аляксандар Казулін правёў у Маскве й Санкт-Пецярбургу. Праз гэта, у прыватнасьці, сарвалася ягоная прамая лінія на сайце радыё «Свабода». Ягоная прэс-сакратарка Ніна Шыдлоўская пацьвердзіла, што экс-рэктар БДУ ў Маскве меў шэраг перамоваў і сустрэч. Але ад далейшых камэнтароў адмовілася. А кіраўнік ініцыятыўнай групы Мечыслаў Грыб сказаў: «Я пра гэта нічога ня ведаю. Ён мне не паведамляе. Трэба размаўляць зь ім самім». Сам заявіў наступнае: «Я камэнтаваць гэта ня буду. Проста сустракаўся. Нельга паведамляць».

**ЗД**

# Добра б нам так

Увосень я ўдзельнічала ў праекце «Навучальныя стажыроўкі ў Польшчы». Культурнае аб’яднаньне «Borussia» запрасіла мяне і іншых студэнтаў у польскі Ольштын. Здавалася б, што яшчэ я ня ведаю пра нашу заходнюю суседку...

## Як на Радзіме, але...

Польшча сустрэла беларускіх і ўкраінскіх студэнтаў цёплым восеньскім сонейкам, а 180-тысячны Ольштын — цэнтар Варміньска-Мазурскага ваяводзтва — адразу зачараваў спакоем і суладнасьцю. Пасьля Другой сусьветнай Вармія і Мазуры ўвайшлі ў склад Польшчы, і сюды — «на землі адзысканыя» — пераехала шмат рэпатрыянтаў з СССР: Беларусі, Украіны, Літвы. Магчыма, таму ў катэдральным касьцёле сваім прыхільным позіркам сустрэла з бакавога аўтара Вастрабрамская Маці Божая. Як на Радзіме…

Па прыезьдзе мы наведалі ваяводзкі соймік — так прадугледжвала праграма. У сойміку пагутарылі з шэфам канцылярыі Віктарам Маркам Лейкам. Пасьля гутаркі зразумелі, што мясцовае самакіраваньне можа мець рэальную ўладу ды састойна распараджацца прыбыткамі без агляндкі на цэнтар. У павятовым Шчытне мы пагутарылі зь людзьмі, што непасрэдна ажыцьцяўляюць мясцовае самакіраваньне. Аказваецца, што можна кіраваць ня толькі «зьверху», але й «зьнізу». Для насельнікаў былога СССР гэта нават цяжка ўявіць. Зрэшты, што казаць, калі ў мясцовым музэі, сярод рэчаў побыту сялянаў XIX ст. ёсьць прас і лядоўня.

## І ніякага БРСМ

Будынкі Ольштынскага ўнівэрсытэту — 14 факультэтаў і 40 тыс. студэнтаў — месьцяцца на ўскраіне гораду, ствараючы цэлы студэнцкі гарадок. Гэта адзіны такога кшталту комплекс у Польшчы — акрамя вучэбных карпусоў ды інтэрнатаў на яго тэрыторыі ёсьць свае крамы, банк, пошта. Сапраўдны горад (плошчай 230 га) у горадзе! Асабліва нас уразіла цішыня: няма тлуму мітусьлівага гораду, як у Менску, а возера зь лебедзямі, палі, паркі настройваюць на засяроджанасьць і плённую працу. У студэнцкім гарадку ёсьць бібліятэка, стайня, канфэрэнц-заля, касьцёл, спартыўны комплекс, рэдакцыі радыё і газэт унівэрсытэту. І тут, як у «горадзе»: студэнты маюць важкі голас у абмеркаваньні ўнівэрсытэцкіх пытаньняў, самі прапаноўваюць нейкія цікавыя праекты і атрымліваюць грошы на іх ажыцьцяўленьне.

На наступны дзень мы сустрэліся з удзельнікамі гуртка славістыкі Ольштынскага інстытуту нэафілялёгіі. Цікава было паразмаўляць з польскімі студэнтамі, што вывучаюць, акрамя расейскай, яшчэ беларускую і ўкраінскую мовы.

## Прышчэпка салідарнасьці

Едзем у Гданьск. Настрой, як і надвор’е, сонечны. Найперш накіраваліся на гарадзкую суднаверф, дзе нарадзілася «Салідарнасьць». Праходзячы цераз залі музэю прафсаюзу, думаеш, што менавіта гэтага пачуцьця не хапае зараз людзям у тваёй краіне — салідарнасьці. Адчуваньня, што за тваёй сьпінай вялікі натоўп, які думае так жа, як і ты. А пакуль гэтага ня будзе, нас ня зьдзівяць палічкі-экспанаты савецкай крамы, на якіх самотна стаіць соль і воцат, а гук «Размова кантралюецца» з тэлефоннай будкі будзе надалей палохаць і нагадваць тваю рэчаіснасьць.

Здаецца, Гданьск падобны на іншыя эўрапейскія гарады з старажытнай гісторыяй. Аднак блізкасьць да мора робіць сваю справу — і партовы горад мае сваю непаўторную атмасфэру. Можа, гэта гандляры бурштынам, дзякуючы якім горад падаецца адной вялікай ювэлірнай крамай, а мажліва, і нязвыклыя каменныя ганкі, упрыгожаныя кожны на свой манер.

* * *

Засталі мы і як у Польшчы адзначаецца Дзень усіх сьвятых. Пачынаеш лепш разумець краіну, калі ўвечары бачыш тысячы сьвечак на магілках і людзей, якія, адарваўшыся ад уласных турбот, паводле даўняга звычаю прыйшлі памаліцца за душы памерлых. У гэты момант ловіш сябе на думцы, што крыху зайздросьціш ім, бо яны добра ведаюць, чаго вартыя, і разам, грамадою дабіваюцца гэтага. Добра б нам так.

**Марыся Закрэўская, Менск**



# Ці абароніць Канстытуцыйны суд дэпутата і настаўніка?

Ад лістападу Канстытуцыйны суд не дае адказу на зварот дэпутата Гарадоцкага райсавету, сябра ЦК БСДП (Грамада) Леаніда Гаравога, які зрабіў запыт аб канстытуцыйнасьці й адпаведнасьці Закону аб статусе дэпутата мясцовага савету й практыцы звальненьня дэпутата па заканчэньні кантракту без папярэдняй згоды мясцовага Савету.

У жніўні Леаніда Гаравога звольнілі з пасады дырэктара Вархоўскай базавай школы без уладкаваньня на працу настаўнікам ды без папярэдняй згоды райсавету.

Дэпутат не пагадзіўся са звальненьнем і цяпер адстойвае свае правы ў Вярхоўным судзе, адначасова чакаючы заключэньня Канстытуцыйнага суду. Але ці стане на абарону працоўных правоў дэпутата вышэйшы суд краіны, які маўчыць два месяцы?

**Цікаўны**

# Балтыйскі «Gallup»: у Менску лідэр апазыцыі і Лукашэнка набіраюць пароўну

Паводле зьвестак «Gallup Media — Baltic Surveys», на 15 студзеня ў пары Аляксандар Лукашэнка — Аляксандар Мілінкевіч у Менску склаўся «сацыялягічны парытэт»: за кожнага з гэтых палітыкаў гатовыя галасаваць па 39,4% выбарнікаў. Па краіне сытуацыя іншая: А.Лукашэнка набірае 57,3%, А.Мілінкевіч — 24,6% (пры закрытым рэйтынгу).

Што да г.зв. «адкрытага рэйтынгу» (інтэрвіюэр задае рэспандэнту пытаньне «За каго б вы прагаласавалі?» і не прапануе сьпісу з прозьвішчаў), у ім лідзіруе А.Лукашэнка з 54,6%. Другі — А.Мілінкевіч з 16,8% (пры канцы лістапада было 9,2%), трэці — А.Казулін (2,9%), далей — С.Гайдукевіч (2,4%) і З.Пазьняк (2,2%)... Ня ведаюць, каму аддаць свой голас, 17,6% апытаных.

**Зьміцер Дрыгайла**

### Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьненa. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. А квіток ахвяраваньня трапляе да нас толькі праз 3—10 дзён.

## Газэта «Наша Ніва» шукае кур'ераў-распаўсюднікаў

у Віцебску, Гомелі, Берасьці, Маладэчне, Полацку й Наваполацку.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир — Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

Кассир М.П. — Плательщик

лицензия № 02330/0056637 от 27.03.2004 УП «УСЛУГА» Зак. 3504 тир 50 000

### Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

### Калі вы не атрымалі газэты

да панядзелка ўключна, а ў Менску — да суботы ўключна, канечне тэлефануйце ў Рэдакцыю. **ПЫТАЦЦА АЛЯКСАНДРУ.** Тэлефоны:
(017) 284-73-29
(029) 618-54-84
(029) 260-78-32

### На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць. На банкаўскай квітанцы ў графе «Ад плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» — 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

# Шукаем падпісчыкаў!!!

Калі хто ведае наступных чытачоў «НН», просьба падказаць ім скантактавацца з газэтай.

**Чытач з Зарніцы Спасава**, дашліце свой дакладны адрас і прозьвішча.
**Чытачы Мацко, М. Белячэўская**, адрасы, якія вы падалі, няслушныя. Падайце, калі ласка, правільныя адрасы.
**Сп. Пашкевіч**, паведаміце Ваш новы адрас.
**Леанід Мікалаевіч Н.** з вул.Калініна, удакладніце свой адрас.
**Алеся Юр’еўна М**. з Наваполацку, зь якой Вы вуліцы?
**Зьміцер К., Натальля А., Лідзія К.** зь Менску, што пералічылі ахвяраваньні, мы ня ведаем вашых адрасоў.
**Сп.Аўчыньнікаў з вул.Маладзёжнай**, удакладніце свой адрас.

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

## Дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

1) Просім усіх чытачоў «Нашай Нівы» **дасылаць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны.**
Т.: (017) 284-73-29, (029) 707-73-29, (029) 618-54-84, e-mail: nn@promedia.by, a/c 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перараказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас.**
Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы.
Хто ж мае магчымасьць пераказаць
36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

# Вынікі збору ахвяраваньняў за сьнежань

Бухгальтэрыя «НН» падсумавала ахвяраваньні, што паступілі на рахунак газэты за 12-ты месяц 2005 году, першы месяц збору ад падпісчыкаў «НН». Усяго з 1 да 31 сьнежня на рахунак газэты залічана ахвяраваньняў ад чытачоў на 34 мільёны 672 тысячы 630 рублёў. Шчыры дзякуй усім.

Вынікі паступленьня ахвяраваньняў за студзень будуць апублікаваныя ў другой палове лютага. Для нармальнага выхаду й дастаўкі газэты трэба, каб кожная хата падпісчыкаў «НН» перказала ахвяраваньне з разьліку 6000 рублёў на месяц.

Просьба да тых, хто пераказаў ахвяраваньне ў памеры толькі 6000 рублёў, пераслаць новую суму не пазьней за 30 студзеня.

## Ахвяраваньні ад падпісчыкаў

Дзякуем Натальлі Я. зь Менску, якая ахвяравала на выданьне газэты 200 тысяч рублёў.

Вялікі дзякуй

Аляксандру К., Ірыне Л., Івану В., Віктару Ф., Леанарду М., Андрэю І., Сяргею Б., Валер’ю Б., Ігару Ш., Аляксандру П., А.П., Мікалаю Б. зь Берасьця.

Анатолю Г. зь Берасьцейскага раёну.

Алене Дз. з Наваградку.

І.М. з Астраўца.

Аўгіньні К., Г.Н., Ірыне Б., Яні Дз., Уладзіславу І. зь Віцебску.

Уладзімеру Ш. зь Віцебскага раёну.

Алене Х., Аляксандру Ш., Уладзімеру Д., Мікалаю Ч., Андрэю Г. з Наваполацку.

А.А. з Полацку.

Уладзіславу Л. з Шаркаўшчыны.

Зьмітру Ж. з Воршы.

Сяргею Д. з Талачынскага раёну.

Уладзімеру А. з Вушацкага раёну.

Ганьне Б. з Пастаўскага раёну.

Віталю Ц. з Жлобіна.

Валер’ю М. зь Сьветлагорску.

Тамары Г., Глебу С. з Салігорску.

Ж.К. зь Менскага раёну.

Міхаілу Т. з Слуцку.

Надзеі Р. зь Вялейкі.

Івану С. з Горадні.

Мікалаю К. з Лунінецкага раёну.

Ірыне С. з Жабінкі.

Уладзімеру З. зь Пінску.

С.К. з Кобрынскага раёну.

Сяргею П., Лідзіі А., Віктару М. з Баранавічаў.

Мікалаю В. з Пружанскага раёну.

Уладзімеру Д. з Мазыра.

Аляксандру К. з Маладэчна.

Галіне Ч. з Рэчыцы.

Аўгену К., В.С. з Магілёва.

Аляксею Н. з Бабруйску.

Тацяне Л. з Мастоў.

Валянціне С. з Жодзіна.

Паўлюку С. з Горак.

Ігару П. з Гомелю.

Іне З. з Турава.

Івану Д. зь Мядзельскага раёну.

А.Ф., Ф.Г., Аксане Г., Генадзю В., Міхасю Ф., В.К., Уладзімеру К., Маргарыце Х., Тамары Ц., Анатолю Я., Ігару В., Валер’ю М., М.Б., В.М., Натальлі Ц., Аляксею Л., А.Н., С.Ч., Сяргею Г., Алене С., В.С., Галіне В., К.С., Ю.М., П.К., Дз.Н., Р.М., Івану Б., Уладзімеру К., Неаніле Е., Зьмітру К., У.Ш., Андрэю Ш., Віктару Л., Уладзімеру Ш., А.С., Уладзімеру Г., Р.М., Алегу С., Ільлю Ч., Р.П., Р.Г., Віктару П., А.М., А.Т., Сяргею П., Любові С., Тацяне М., Алегу К., Олісю П., Мікіту З., Дар’і С., Зьмітру Л., Канстанціну З., А.Б., Уладзімеру Г., Валер’ю К., Марыі С., Алене Г., А.Г., Дз.Ш., Валер’і К., Людміле П., Віталю Х., Юр’ю С., Івану М., Ірыне Б., Алегу Т., М.К., Леаніду Дз., Андрэю С., Тацяне Л., І.Л., Алегу Ф., Натальлі А., Аляксею П., Натальлі Я., Неаніле А., Казімеру Г., Ю.Ф., Аляксандру Б., Сяргею З., Канстанціну З., Вячаславу П., А.І., Т.Л., Аляксандру Н., Анатолю В. зь Менску.





**Пытайцеся ў кнігарнях кнігу Сяргея Балахонава «Імя грушы» Пытайцеся ў кнігарнях кнігу Сяргея Балахонава «Імя грушы»**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Высланы на поўнач Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Партызанская

На алёшчынскай эстакадзе, зваранай з чыгуначных рэек, ля сходняў, дзе прыбіты плякат «Пабочным асобам уваход забаронены», любы ахвочы можа памацаць жалезнае сьведчаньне партызанскае мэнтальнасьці беларусаў. Меншая за савецкі стандарт рэйка з штампам «Krupp», сымбалем з трох колцаў і датай — 194... У 194... якім годзе прамысловасьць Трэцяга Райху вырабіла гэты чыгунны Drang nacht Osten, высьветліць немагчыма — рэйка абрэзаная на самым інтрыгоўным месцы.
Лясная Полаччына ў II сусьветную была адным з цэнтраў партызанскага руху. Праўда, аповеды тутэйшых старажылаў розьняцца ад мітаў афіцыйнае савецкае прапаганды.
У 1941 г., калі немцы атачылі на матацыклах у полі першых «партызанаў» — мясцовых камсамольцаў, якім партыйцы выдалі паляўнічыя дубальтоўкі, пасьля загаду «Зброю ў кучу!» прагучала нечаканае «А ну дахаты, да маткі!». Аднак пасьля таго, як з Масквы сюды закінулі энкавэдэстаў і пачаліся дывэрсіі, фашысты пачалі плянамерны тэрор сярод мірнага насельніцтва. Кажуць, што ў 1942-м закінутую каляіну чыгункі на Невель, якой немцы не карысталіся й, натуральна, не ахоўвалі, партызаны ўзрывалі найбольш ахвотна — і да 1943 г. зьнішчылі амаль цалкам. Затое ў Маскву штотыдня ішлі шыфроўкі: «узарвана яшчэ столькі й столькі мэтраў чыгуначнага палатна».
Адзін зь мясцовых жыхароў перадаў мне некалькі цікавых дакумэнтаў 1942—1944 гг., што тычаць партызанскага руху на Полаччыне. Сярод іх — даведка па-расейску: «Рэзкін П.І. ёсьць камандзірам партызанскай групы. Даведка дзейная па 15 верасьня 1942

## ХРОНІКА

### Пацярпелі за Мілінкевіча

У Воршы 3 студзеня загадчыца садка №2 Тацяна Качагарава зьнішчыла падпісныя лісты з 40 прозьвішчамі, сабранымі **Вольгай Францішкевіч.**

У вёсцы Яглевічы (Івацэвіцкі р-н) 10 студзеня міліцыянты ўварваліся ў дом **Клаўдзіі Садкоўскай**: маўляў, было ананімнае тэлефанаваньне, што яна зьбірае подпісы супраць прэзыдэнта. Канфіскаванае пасьведчаньне зьбіральніка подпісаў і блянкі ўдалося вярнуць толькі пасьля ўмяшальніцтва кіраўніка ініцыятыўнай групы.

У Дзятлаве зьбіральніка подпісаў **Пятра Цярэшку** 17 студзеня затрымалі міліцыянты-аўтаматчыкі: хтосьці з жыхароў дому паведаміў, што па кватэрах ходзяць невядомыя.

18 студзеня адміністрацыйная камісія Пінскага гарвыканкаму вынесла папярэджаньне **Алесю Аўсеенку** за тое, што нібыта перашкаджаў мінакам ісьці на рынак. Аляксандра Рамановіча пакаралі штрафам у 1 базавую велічыню (29 тыс.) за распаўсюд інфармацыйных матэрыялаў без выходных зьвестак.

На **Пятра Явідовіча** (Ашмяны) заведзена 19 студзеня адміністрацыйная справа за датэрміновую агітацыю й заклік на несанкцыяваны сход. Выклік у пракуратуру адбыўся напярэдадні прыезду адзінага кандадата.

**Ірыну Лаўроўскую, Сяргея Вакуленку, Канстанціна Турчаняка** й **Аляксея Шарэнду** ў Берасьці 20 студзеня спрабавау затрымаць міліцыянт, які зьвінаваціў зьбіральнікаў подпісаў, што яны плацяць грошы за подпіс.

21 студзеня ў Сьвіслачы ў **Генадзя Радзецкага** міліцыянты канфіскавалі партрэт Мілінкевіча.

### ...і Пазьняка

Сябар КХП-БНФ **Ян Дзяржаўцаў** 16 студзеня падаў скаргу ў пракуратуру Першамайскага раёну Віцебску: яму забараняюць зьбіраць подпісы ў інтэрнатах тэлезаводу «Віцязь» і ліцэю №1.

22 студзеня ў Менску затрыманыя кіраўнік ініцыятыўнай групы **Сяргей Папкоў, Тацяна Цяцёркіна, Ангеліна Масюта, Валеры Забродзін,** якія распаўсюджвалі інфармацыю пра акцыю Народнае галасаваньне. **С.Папкова** затрымалі й 23 студзеня.

### Перадвыбарчыя мітрэнгі

Зьбіральнікі подпісаў **Валер Шаўчэнка** й **Міхаіл Чадаеў** 18 студзеня зьвярнуліся ў пракуратуру: адміністрацыя Полацкага ўнівэрсытэту не пускала іх у інтэрнаты. 13 студзеня пракуратура адказала, што пытаньне ў кампэтэнцыі гарадзкой выбарчай камісіі. 18 студзеня камісія адказала, што разгляд прапускнога рэжыму ў інтэрнатах — у кампэтэнцыі пракуратуры й іншых наглядных органаў.

19 студзеня ініцыятыўная група Казуліна заявіла пра перасьлед актывістаў у Верхнядзьвінскім раёне. Да **Лідзіі Вейп** участковы зьявіўся на працу, да **Тацяны Пірог** — дадому, **Тацяне Барысавай** тэлефанавалі 3 студзеня з КДБ.

20 студзеня **Андрэя Клімава** афіцыйна папярэдзілі ў пракуратуры Крупскага раёну за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, перадвыбарную агітацыю, зьнявагу і паклёп на службовых асобаў Беларусі, заклікі да гвалтоўнай зьмены канстытуцыйнага ладу. Падставай стала інтэрвію палітвязьня на сайце euramost.org.

У Рэчыцы 23 студзеня адбыўся пажар у гаражы, дзе стаіць машына **Алега Шабетніка** — актывіста групы Валер'я Фралова. Актывіст лічыць здарэньне падпалам.

### Палякі

17 студзеня а 6-й раніцы да рэдактара часопісу «Magazyn Polski na uchodzstwie» **Андрэя Пачобута** прыйшлі міліцыянты — даставіць бяз позвы ў пастарунак. А.Пачобута дома не аказалася, але ў той жа дзень ён і **Анджэй Лісоўскі** былі затрыманыя пад Скідзелем, калі везьлі наклад новага нумару. Канфіскавана 50 асобнікаў.

17 студзеня затрыманая машына з кіраўнічкай непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў **Анжалікай Борыс**: міліцыянты праверылі дакумэнты ва ўсіх, хто ехаў у аўтамабілі.

### Моладзевыя актывісты

У Менску 16 студзеня на Дзень салідарнасьці затрыманыя **Натальля Вушка** і **Аляксей Ляўковіч**. **Сяргея Марчыка** ў Баранавічах 18 студзеня пакаралі за ўдзел у Дні салідарнасьці ў сьнежні. Вырак — 20 б.в. (580 тыс.).

Уначы 22 студзеня ў Магілеве затрыманы **Сяржук Нягацін**: яго зьвінавацілі ў непадпарадкаваньні супрацоўнікам міліцыі, калі

# зона

г.». Дата — 1 верасьня 1942 г., подпіс начштабу, і штамп: «Даплаціць. Юравічы». Пасьля вайны паводле даведкі з двухсэнсоўным зьместам камандзіра групы прызначылі кіраўніком участку Полацкага леспрамгасу. Да стырна БССР прыходзіў «партызанскі клан».

Партызанская генэтыка сіценцаў невыкараняльная. Калі пару гадоў таму сюды прыехаў міліцэйскі нарад утаймоўваць некалькіх мясцовых, тыя зладзілі аблогу, прымусілі ахоўнікаў правапарадку расстраляць усе патроны з табэльных пісталетаў, саму зброю паадбіралі, «захопнікаў» павязалі, упіхнулі ў «козьлік» і давай штурхаць да бліжэйшага возера. Паглядзець, ці паплыве... Небаракаў выратаваў егер, паабяцаўшы «партызанам» гарэлку. А зусім нядаўна ля вёскі даішнікі спынілі машыну лесавікоў, што ішла юзам, і запатрабавалі ў захмялелага вадзіцеля правы. У адказ «лясныя браты» завялі бэнзапілы. Больш посту аўтаінспэкцыі там ня бачылі...

Партызанка — адказ загнанага ў кут беларуса. Нацыянальны супраціў тоіцца ў глыбіні душы, сярод гушчароў і балотаў, у самых нетрах. Таму ён непераможны. Але сыход у лес сам па сабе ня ёсьць выйсьцем — ён хіба здольны зрабіць невыносным жыцьцё і ворага, і мірнага насельніцтва, і саміх «партызанаў».

Вось і зараз многія з нас так і сыходзяць, бы ў лес — хто ў *сябе*, хто ў запой, хто ва ўласныя мроі, хто ў кансьпірацыю... І сядзяць у гэткай *партызанскай зоне*, чакаючы «вызваліцеляў».

Савецкія энцыкляпэдыі паведамляюць, што ўвосень 1943 г. беларускія партызаны кантралявалі 60% плошчы Беларусі. Вось такі нацыянальны парадокс, большасьць тэрыторыі — партызанскія зоны, а ў краіне гаспадарыць акупант.

Дык вось, каб беларусы не прасядзелі *ў партызанах* усё сваё жыцьцё — 19 сакавіка трэба перамагаць.

*Малое Сітна*

Сыход у лес — ня выйсьце. Ён хіба здольны зрабіць невыносным жыцьцё і ворага, і мірнага насельніцтва, і саміх «партызанаў»

## ХРОНІКА

ён нёс з сабой налепкі «Яны хлусяць».

### Графітысты

Моладзевым актывістам **Аляксандру Казакову** й **Зьмітру Зубру** 17 студзеня прад'явілі пастанову аб прызнаньні іх падазраванымі ў крымінальнай справе паводле арт.363 ч.2 КК (супраціў работніку міліцыі). Хлопцам, якіх затрымалі па падазрэньні ў графіці, пагражае да пяці гадоў турмы.

Суд Цэнтральнага раёну Гомелю даў 15 сутак **Сяргею Касьцючэнку**: якога затрымалі 2 студзеня за графіці «Беларусь без...».

### Працэс над Скрабцом

На судовае пасяджэньне 17 студзеня выклікалі доктара. **Сяргей Скрабец** заявіў, што пастаянна траціць прытомнасьць. 18 студзеня экс-дэпутат заявіў пра катаваньні ў турме: нібыта ў халодным памяшканьні яго распранаюць, ладзячы асабісты надгляд, у СІЗА невядомыя ў масках зьбіваюць тых, хто знаходзіцца пад сьледзтвам (зьбілі сукамерніка палкоўніка Восіпава). 19 студзеня суд адмовіўся зьмяніць Скрабцу меру стрыманьня на час прэзыдэнцкай кампаніі.

### «Кур'еру» адмовілі

Берасьцейская філія «Белпошты» 18 студзеня адмовілася дастаўляць у раёны недзяржаўную газэту «Брестский курьер».

### «Радзе» канец

Вярхоўны суд 17 студзеня паведаміў сакратарыяту Беларускага саюзу моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб'яднаньняў «Рада», што з ініцыятывы Мін'юсту пачатая справа па ліквідацыі аб'яднаньня. Разгляд прызначаны на 28 студзеня.

### Рэчыца

Улады Рэчыцы 10 студзеня скасавалі прадпрымальніцкае пасьведчаньне спн.Невар. Яе муж **Леанід Невар** зьвязвае ліквідацыю сямейнага бізнэсу зь ягонай грамадзка-палітычнай дзейнасьцю: ён намесьнік старшыні рэспубліканскага аб'яднаньня прадпрымальнікаў «Пэрспэктыва».

### Віцебск

11 студзеня віцебскія ўлады правялі сход філіі **ГА «Саюз палякаў Беларусі»**, дзе прызначылі новага кіраўніка (сп.Даманеўскага заміж Аліцыі Галуставай) і прыпынілі дзейнасьць Польскага дому: аблвыканкам забараніў праводзіць там якія-кольвек імпрэзы.

### Пэнсіянэры

Сябру ініцыятыўнай групы па стварэньні аб'яднаньня беларускіх пэнсіянэраў **Леаніда Цялегіна** 29 сьнежня зьбіў невядомы: малады чалавек загаварыў зь ім пра палітыку, а потым ударыў па галаве палкай і ўцёк, нічога ня ўзяўшы. Праз некалькі дзён у Цялегіна, аднагалосна абранага старшыні савету вэтэранаў пры ЖЭС-45 Менску, супрацоўнікі ЖЭСу забралі ўсе дакумэнты савету, спаслаўшыся на тое, што «паступіла ўказаньне».

### У Баранавічах

11 студзеня ў Баранавічах судзілі **Сяргея Марчыка** за ўдзел у «незаконным сходзе» на мінулы Дзень салідарнасьці. Адвакат пераканаў судзьдзю, што сходу не было: справу накіравалі ў міліцыю на дапрацоўку. Новае разьбіральніцтва прызначанае на 18 студзеня.

У той самы дзень **Аркадзя Блінкоўскага** асудзілі на 800 тыс. руб. за «несанкцыяваны пікет»: ён удзельнічаў у акцыі ў падтрымку забароненых газэтаў.

### Бабруйск

11 студзеня дырэкцыя прадпрыемства «Ліфттранс» у Бабруйску пазбавіла гарадзкую філію БСДП(Г) офісу, заявіўшы, што памяшканьне ў аварыйным стане.

### Вялейка

Актывіста АГП **Уладзімера Малярчука** адміністрацыйная камісія Вялейскага райвыканкаму 9 студзеня аштрафавала на 5 базавых велічыняў за распаўсюд 12 лістапада інфармацыйнага бюлетэню пра Дзень салідарнасьці.

### Прафсаюзы

13 студзеня адміністрацыя прадпрыемства «Лёс» прад'явіла ўльтыматум суполцы Свабоднага прафсаюзу мэталістаў, даўшы 3 дні на высяленьне з памяшканьня. Між тым, у калектыўнай дамове пазначана, што памяшканьне даецца прафсаюзу бясплатна.

Кіраўніцтва ВА «Беларуськалій» 13 студзеня адмовілася падпісваць калектыўную дамову зь Незалежным прафсаюзам гарнякоў.

### Штраф за распаўсюд

11 студзеня ў Горадні аштрафавалі **Ўладзімера Леванеўскага** на 87 тыс.руб за распаўсюд выданьняў без выпускных зьвестак.

**АШ**

# Справа Касьяровіча

17 студзеня а 22-й актывіст беларускага руху садраў чырвона-зялёны сьцяг з даху Менгарвыканкаму. Цяпер яму пагражае год «хіміі». Як усё было насамрэч? Піша **Аркадзь Шанскі.**

Зьмітра Касьяровіча, Паўла Батуева і Зьмітра Гаўрусіка затрымалі каля Менгарвыканкаму, зьвінаваціўшы ў зьнявазе дзяржаўнага сьцяга. Доказам стаў штандар, сарваны Зьмітром Касьяровічам з даху гарвыканкаму. Хлопцу пагражае год абмежаваньня волі («хімія») — яго вінавацяць у «зьнявазе дзяржаўных сымбаляў» (арт. 339, ч.1 КК). Батуева з Гаўрусікам выпусьцілі ўначы з 20 на 21 студзеня, цяпер яны праходзіць па справе як сьведкі.

24 студзеня Павал Батуеў пераслаў Касьяровічу перадачу: кілбасу, сала, печыва, гарбату, цыгарэты. «Гарбата й цыгаркі аж пахнуць, калі ты ў турме».

«Пацярпелымі» апрача затрыманых хлопцаў апынуліся й сваякі Гаўрусіка: у яго дома правяліператрус. Жонка Таццяна кажа, што міліцыянты напалохалі іх дзьвюхмесячную дачку ды Зьмітровага 78-гадовага бацьку. Канфіскавалі паперы з асабістага архіву ды стары самвыдат.

Хлопцаў першыя двое сутак трымалі ў КПЗ Маскоўскага РУУС. У пастарунку іх сфатаграфавалі, зрабілі адбіткі пальцаў, запісалі голас, прымусіўшы чытаць тэкст пра Нацыянальную бібліятэку.

Камэры ў КПЗ не прызначаныя для доўгага ўтрыманьня, таму за двое сутак хлопцы пасьпелі ўбачыць безьліч народу. «Сядзелі мы ўсе ў розных камэрах, хаця нас з Гаўрусікам, як пазьней высьветлілася, трымалі ў суседніх. Але перагаворвацца ўсё адно не было магчымасьці», — для Батуева затрыманьне сталася шокам, ён — студэнт-завочнік БАТУ — прыехаў з Салігорску здаваць сэсію.

Самым цяжкім было адчуваньне бясконца доўгага часу. Прасіліся выйсьці ў прыбіральню, каб толькі не сядзець бессэнсоўна ў камэры гадзінамі. Якая пара дня — невядома: вулічнага сьвятла ў камэры няма, увесь час гарыць бляклая лямпачка. Міліцыянты, праўда, ставіліся карэктна й добразычліва — адчувалі істотную розьніцу ў параўнаньні з сваім традыцыйным «кантынгентам». Некаторыя ахоўнікі нават «стралялі» для іх цыгарэты. «Думаю, ёсьць сэнс павышаць кваліфікацыю й пачаць вывучаць нейкі курс турэмнага этыкету», — разважае Батуеў. Для яго затрыманьне было ня першым: нават у мінулую восень яго затрымлівалі двойчы, але — па адміністрацыйных справах, за несанкцыяваныя акцыі. А вось крымінальнае абвінавачаньне было ўпершыню. Цяпер Павал мяркуе павысіць сваю адукацыю ў гэтай галіне...

Цяжка ў КПЗ было ўначы: зь неахайна (ці адмыслова?) пакладзеных цагляных сьценак страшэнна сыфоніла. Пагатоў, што ўзялі хлопцаў сама перад тым, як ударылі маразы. «Кладзесься спаць, ухутаўшыся ў паліто, а праз паўгадзіны падымаесься — ад калатуна. Зробіш кругоў 40 па камэры — і зноў на паўгадзіны ўкладаесься».

Ізалятар часовага ўтрыманьня, куды іх перавялі 20 студзеня, падаўся ледзь ня раем у параўнаньні з гэтым: там было цёпла. Цёпла і ў СІЗА, дзе цяпер трымаюць Касьяровіча…

Батуеў кажа, што першыя гадзіны на волі адчуваў незвычайную эўфарыю: «Адчуваў, што магу рабіць, што хачу». Праўда, многія рэчы (мабільнікі, грошы, шапкі, нават матузкі на абутак) пры вызваленьні хлопцам аддалі не адразу, а толькі праз некалькі дзён. Маўляў, калі не падабаецца, можаце пасядзець тут да панядзелка.

Па вызваленьні хлопцы вярнуліся да актыўнае працы. «Цяпер трэба здаваць сэсію: прапусьціў некалькі лябараторных. Думаю, ці пераздаваць іх платна, ці ўсё ж узяць даведку зь міліцыі, што я прапусьціў іх з паважнай прычыны», — Батуеў не губляе аптымізму. Вучыцца ён на электрыка, але хіба што толькі паводле сямейнай традыцыі: па бацькавай лініі ўсе былі ці электрыкамі ці працавалі на шахтах. А Павал, кажа, крыху расчараваўся ўжо ў гэтай сфэры й хацеў бы заняцца вывучэньнем славянскіх моваў.




**22-гадовы Зьміцер Касьяровіч летась скончыў Унівэрсытэт культуры па спэцыяльнасьці «музэйная праца». Захапляўся гісторыяй, ладзіў моладзевыя вандроўкі па Беларусі. Сябра Партыі БНФ, актыўны ўдзельнік палітычнага жыцьця. Фота з архіву «НН».**

Ён «захварэў на беларушчыну» ў 1999 г., калі пачуў энэрэмаўскую «Песьню пра каханьне». Потым пабачыў улётку «Краю» — і стаў «краёўцам». У 2001 г. у рамках мабілізацыйнай кампаніі прайшоў пешшу ўсю Берасьцейшчыну, займеў шмат сяброў — у тым ліку й Зьмітра Гаўрусіка. З 2003 г. — намесьнік старшыні менскай абласной філіі ПБНФ.

25 гадовы Зьміцер Гаўрусік — таксама «тэхнар»: пасьля заканчэньня ліцэю БДУ вывучыўся на радыёфізыка. «Сярод нацыянальных актывістаў многа людзей з тэхнічнай адукацыяй», — кажа ён.

Для Паўла Батуева выхад на волю стаў самым жаданым падарункам: 21 студзеня ён акурат адзначаў свой 24-ты дзень нараджэньня. «Падарункі ўсе сябры падбіралі адмысловыя: адзін прынёс сьцяжок лукашэнкаўскі на падстаўцы, сяброўка падаравала грабеньчык з надпісам «Зь Сібіры зь любоўю», — сьмяецца ён.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Павал Батуеў (справа) і Зьміцер Гаўрусік.**

# Як адбываецца сачэньне

На прыкладах Зарамбюка й Кацоры можна раіць: думайце, перш чым гаварыць па мабільніку.

У СМІ зьяўляюцца зьвесткі пра чарговую канфіскацыю інфармацыйных матэрыялаў. Студэнта Яўгена Скрабутана 12 студзеня міліцыянты спынілі на вакзале ў Мастах, як толькі ён выйшаў з электрычкі. З сумкі забралі 5000 каляндарыкаў з выявай Мілінкевіча. Не дапамагло нават заступніцтва дэпутата райсавету Алеся Зарамбюка, які заявіў міліцыянтам, што сумка ягоная.

Адкуль міліцыя ведала, у кага шукаць матэрыялы? Зарамбюк мяркуе, што міліцыя праслухоўвала яго тэлефонныя размовы з Скрабутанам.



**Уладзімер Кацора падмануў міліцыю дзьвюма падшыўкамі «Советской Белоруссии».**

Такія ж перасьцярогі выказвае кіраўнік гомельскага выбарчага штабу адзінага Ўладзімер Кацора: «Па мабільніку чалавека можна адсачыць з дакладнасьцю да 1 м». Ён распавядае, як Андрэй Кара вёз 20 тыс. календароў з партрэтам Мілінкевіча. Пад'яжджаючы да Гомелю, па мабільніку паведаміў Кацору, што вязе два пачкі, спытаў, на які адрас прывезьці. Кацора назваў адрас — на гэтай вуліцы аўтамабіль Кары і затрымалі. Пасьля аднаго тэлефанаваньня затрымалі з каляндарыкамі й яшчэ аднаго гомельскага актывіста — Валера Рыбчанку.

Аўтамабіль Кацоры неаднаразова затрымлівалі падчас перавозкі каляндарыкаў — штораз ля Жлобіна. Ён лічыць, што за ім адмыслова сочаць. Каб праверыць вэрсію, Кацора дэманстрацыйна вынес з офісу ў машыну дзьве скрынкі з падшыўкай «Советской Белоруссии», заехаў у іншы офіс, дзе яму перадалі вопратку з гуманітарнай дапамогі. «Мяне затрымалі, я запатрабаваў, каб афіцыйна склалі пратакол. Але ж яны ня сталі канфіскоўваць «Советскую Белоруссию» ды панчохі», — кпіць Кацора.



**Дэпутат Алесь Зарамбюк мяркуе, што яго мабільнік праслухоўваюць.**

Апошнім разам за Кацорам сачылі 16 студзеня. І зноў-такі каля Жлобіна. Гэтым разам чырвоны «мэрсэдэс»: «Калі я заехаў на запраўку, то дэманстратыўна адкрыў багажнік. Яны пабачылі, што нічога не вязу, і ня сталі затрымліваць».

Аўтамабіль кіраўніка віцебскага выбарчага штабу Хрыстафора Жаляпава затрымалі, калі ён ехаў зь Мілінкевічам у Наваполацак і вёз інструкцыі для зьбіральнікаў подпісаў: «У супрацоўніка ДАІ быў запісаны на руцэ нумар аўтамабіля». Жаляпаў кажа, што міліцыянты не абцяжарваюць сябе адмысловым «хвастом». «Аўтамабіль затрымліваюць у Віцебску для дагляду кожны дзень адзін-два разы». Тое самае неаднаразова рабілі з аўтамабілем адказнага за збор подпісаў Кастуся Смолікава, покуль ягоная машына не зламалася. «Таму цяпер мы ня возім з сабой ніякіх матэрыялаў», — кажа віцебскі актывіст.

Улады пільнуюць дэмакратычных актывістаў. Але й тыя пільнуюцца, каб шпегам на прэмію не зарабіць. Прынамсі, у краіне канфіскоўваецца толькі малая частка самадрукаў.

**АШ**

## ПАЛЕМІКА

# Сэрцам і розумам

Да дыскусіі **Сяргея Дубаўца** і **Андрэя Дынька.**

У палеміцы нашаніўскіх рэдактараў («НН», №3), як здараецца ў падобных спрэчках, пераплятаюцца значнае й малазначнае, агульнае й прыватнае. Менавіта ў прыватнасьці — але істотнай — хачу паправіць Андрэя Дынька. Не было пасьля выбараў-2001 «кароткага, але плённага пэрыяду лібэралізацыі». Так, размовы вяліся. Але яны скончыліся наступам на Курапаты, уціскам прафсаюзаў і закрыцьцём газэты «Пагоня». А вось «НН» (8 кастрычніка 2001) выдавала пажаданае за сапраўднае, назваўшы сьвежапрызначаных міністраў Шымава, Гуляку, Падгайнага «лібэраламі». Час паказаў, якія зь іх свабодалюбцы.

Сэрцам жадаючы, каб прароцтва С.Дубаўца аб надыходзе «клясычнага таталітарызму» выявілася памылкай, розумам цямлю, што падставы для такога прагнозу грунтоўныя як ніколі. Чаго вартае ўвядзеньне крымінальнай адказнасьці за дыскрэдытацыю дзяржавы — нават не само, а як сымптом сацыяльнай хваробы. Яе прыкметы — нечуваная нецярпімасьць да іншадумства ў носьбітаў улады, апатыя ў большасьці суграмадзянаў.

Чаму таталітарызм у Беларусі магчымы «толькі пасьля Расеі» — аўтар «Адказу Сяргею Дубаўцу» не патлумачыў. На мой одум, мажлівы і ў «асобна ўзятай Беларусі». Адкрытасьць межаў мала што мяняе, бо, вядома, мацнейшыя тыя межы, якія ў людзкой сьвядомасьці. Кастраўскі рэжым трымае плянку, хоць пускае ў Гавану турыстаў бадай з усіх краёў.

Лукашэнкаўцам цяжка поўнасьцю «перакрыць інфармацыйныя плыні». Гэтага й ня трэба. Дагэтуль перакрывалі і перакрываць муць у той ступені, каб суцішыць рэальных працаўнікаў. Паралельна інфапрастора забіваецца азаронкаўска-кісялёўскім тлумам, які сее ў абываталяў недавер да будзь-якіх меркаваньняў аб палітыцы. А значыць — і да зьменаў.

Насупор апанэнту Дубаўца, формы таталітарнага ладу ня зводзяцца да «фашызму, нацызму або сталінізму». Што калі гадоў праз дваццаць студэнтам-палітолягам давядзецца вывучаць лукашызм — мо як праяву нэасталінізму, а мо як фэномэн *sui generis*? Дый «вельмі сучасная дыктатура» не здаецца мне нашмат лепшым варыянтам, чым таталітарызм. Яна ўжо скараціла век сотням людзей, пры нагодзе скароціць і тысячам.

С.Дубавец чакае ад інтэлектуалаў «эзопавай мовы», А.Дынько — стварэньня культуры, альтэрнатыўнай афіцыёзу. Наўрад ці ў гэтым пункце дыспутанты моцна разыходзяцца. І эзопава мова, і простыя словы здольныя прасьвятліць розум. Тут важная дарэчнасьць, а яшчэ — маральная пазыцыя таго, хто прамаўляе.

Найважнейшае адрозьненьне сёлетняй палітычнай кампаніі ад выбараў-2001 у тым, што яна ладзіцца без Васіля Быкава. Другога «мудрага старога» (ці старой) на грамадзка-палітычнай сцэне не зьявілася. Таму, як любіць казаць адзін гарадзенскі паэт, «канец, кропка».

**Уладзімер Паўловіч, Менск**

# Згарэлі кнігі Быкава й Гілевіча



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У ноч з аўторка на сераду дашчэнту выгарала таварыства «Кніга», што тыдзень таму адзначыла сваё 30-годзьдзе. Згінула 200 асобнікаў кнігі Васіля Быкава, 150 асобнікаў кнігі Ніла Гілевіча з выдаванай «Кнігай» сэрыі «Народная бібліятэка», каля 500 кніжак з сэрыі «Скарбы беларускай літаратуры і фальклёру», кампутары арганізацыі і ўся дакумэнтацыя — аж да працоўных кніжак. Застрахаваная маёмасьць не была. «Гэта канец. Трэба ўсё пачынаць з нуля», — кажа дырэктар таварыства Андрэй Лапцёнак. Сытуацыя для «Кнігі» тым больш прыкрая, што таварыства нядаўна самаліквідавалася, таму нават атрымаць кампэнсацыю за маёмасьць ня ўдасца.

«Кніга» месьцілася ў мансардзе будынку па вуліцы Захарава, 42, які займае пераважна Ўпраўленьне статыстыкі па горадзе Менску. Будынак быў ва ўласнасьці ЖРЭА, надбудовы належалі розным уласьнікам. Усяго на тым паверсе пажар зьнішчыў каля дзесяці офісаў. Тыя, што былі ніжэй, пажарнікі залілі вадой, калі гасілі агонь. Пажар пачаўся з офісу арганізацыі, якая здавала ў арэнду памяшканьні ў тым будынку. Афіцыйная прычына — кароткае замыканьне.

**СМ**

# Шагал і крыху глямуру

БТ прэзэнтавала цыкль перадачаў пра слынных беларускіх суайчыньнікаў.

16 студзеня на канале БТ паказалі першую сэрыю з цыклю «Эпоха». Праект мусіць распавесьці пра знакавыя гістарычныя постаці: Эўфрасіньню Полацкую, Францыска Скарыну, Адама Міцкевіча. Вядоўца **Алег Лукашэвіч (на фота)** кажа: «Мы задумалі адкрыць невядомыя раней факты». Першыя чатыры сэрыі прысьвечаныя Марку Шагалу.

Аўтары фільму пагутарылі з сынам мастака Дэвідам Макнілам, рабілі здымкі ў амэрыканскіх музэях. Удала выкарыстоўваецца поліэкран, старая хроніка і зжаўцелыя фатакарткі. Але глямурны стыль уваходзіць у канфлікт з эстэтыкай Шагала. Аўтарам не заўжды хапае такту адысьці ўбок і вывесьці на першы плян самога творцу. «А.Лукашэвіч у Бэрліне», «А.Лукашэвіч у Парыжы» выглядае для БТ крута, але хацелася б болей Шагала ў гэтых гарадах.

З 5-й хвіліны мігценьне кадраў пачынае раздражняць, як і навязьлівая клясычная музыка.

Праграма цалкам па-расейску (хоць вядоўца выдатна ведае беларускую) — і гэта канфармісцкая практыка шэрага тэлебачаньня. Але «Эпоха» — рэдкая перадача, якую можна на БТ глядзець.

**Андрэй Расінскі**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Гангста-рэп зь Беларусі

Лідэр хіп-хоп праекту «Чырвоным па беламу» Кроў запісвае першы легальны альбом і выходзіць на эўрапейскі рынак.




«Пасьля выхаду сольнага альбому ўзровень беларускага хіп-хопу ўздымецца», — упэўнена кажа Кроў.

Дагэтуль бескампрамісны хіп-хоп ад «ЧпБ» распаўсюджваўся праз Інтэрнэт. «Мы на 100% андэрграўндавы праект. Адсюль і якасьць запісу, гуку, музыкі. Мы ня маем магчымасьці выкладаць грошы на гітовыя фанаграмы, якія каштуюць некалькі тысяч даляраў».

Кроў даказаў: рэп па-беларуску можа быць папулярны. Цяпер хоча давесьці, што беларускамоўны рэп можа зацікавіць спонсараў. Кроў зацікавіў творчасьцю польскі лэйбл *WJ Records*, які пагадзіўся выдаць сольны альбом музыкі. Гэта легальны праект, для большага кола слухачоў, зь бюджэтным кліпам у падтрымку дыска і тыражаваньнем па ўсёй Эўропе. За музычны бок будуць адказваць бітмэйкеры з Польшчы і Нямеччыны. Усе песьні — па-беларуску. Кроў вядзе перамовы зь вядомымі эўрапейскімі і расейскімі рэп-выканаўцамі, каб узялі ўдзел у праекце.

«У Амэрыцы на хіп-хопе зарабляюцца агромністыя грошы, сёньня гэта адна з самых прыбытковых галінаў шоў-бізнэсу, дык чаму беларусы ня могуць такім жа чынам?» Напады пра непрыдатнасьць беларускай мовы Кроў годна адбівае: «Беларускія рэпэры чакаюць, пакуль нашы бандзюганы-гангстэры загутараць па-беларуску... Але я ўжо сустракаў гангстэраў з «галдой» на шыі, вялікай і злобнай мордай, якія шпараць па-беларуску».

Пра сябе Кроў казаць ня хоча: «Напішыце, што беларус». Крова можна сустрэць на гульнях менскага «Тарпэда» ды акцыях апазыцыі. Разам з футболам і музыкай у кола зацікаўленьняў уваходзіць палітыка. Рэпэр лічыць сябе крайнім лібэралам і ўяўляе ідэальнае для краіны кіраўніцтва: Мілінкевіч — прэзыдэнт, Клімаў — прэм’ер-міністар. Але рэп-агіткі пісаць не зьбіраецца: «Лепей напісаць у падтрымку пэўнай ідэі, чым рэклямаваць пэўную асобу».

**Сяргей Будкін**

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Drum Ecstasy



«Drum Ecstasy». «H.D.M.». 2005, West Records.

Новы альбом ад музыкаў, якія 14 год зацята гвалцяць бубны, за што атрымалі прызнаньне за мяжой.

У сваёй краіне «Drum Ecstasy» афіцыйных выступаў ня мае, як і інтэрвію ў дзяржаўных СМІ.

Застаецца толькі выдаваць дыскі і трымаць сябе ў форме. Музыка «бубнаў» сапраўды прызначана для падрыхтаванай грамады, гэткі якасны нефармат — цяжкі барабанны інструмэнтал. Альбом слухаецца як адна вялікая п’еса: бубны мэтадычна сьвідруюць мозг, а бас робіць у ім акуратныя дзірачкі. З кожнай песьняй гучаньне нібыта ўскладняецца. Філ кажа, што ў альбоме гурт зьмяніў сваю «канцэртную» тактыку: на жывых выступах бубначы спачатку ціснуць на слухача, потым крыху адпускаюць, а потым дабіваюць, а на альбоме — забаўляюць, ціснуць і зноў жа дабіваюць. Бедны слухач потым яшчэ доўгі час ня можа пазбавіцца таго назойлівага барабаннага бою. Альбом «H.D.M.» здольны як абудзіць, так і ўвагнаць у дэпрэсію. Гледзячы якую душэўную арганізацыю вы маеце.

Проціпаказана слухаць пасьля наведваньня стаматалягічнага кабінэту.

### beZ bileta



«beZ bileta». «popravka 22». 2005.

Чароўныя гукі флейты замянілі на сэмплы.

«Bez bileta» з тых камандаў, дыскі якіх чакаеш. Пры канцы сьнежня, нарэшце, дачакаліся. Праўда, толькі сынглу зь дзьвюма новымі песьнямі і чатырма пераасэнсаванымі.

Што да новых: «Ніколі не ўмірай» — ня надта характэрная песьня для групы — ні па музыцы, ні па тэксьце, у якім можна разгледзець вобразы, характэрныя для творчасьці расейскага гурту «Калинов мост»: «волосы твои в колыбели трепались». Аднак прыпеў змушае падтупваць нагой.

Частка старых песень папрыгажэла, у «Лодках» стала болей гітовасьці і куплетаў, у «Нарысавана» (тэлефонвэрсія) дадалося трагічнасьці. А вось у рэмікс, зроблены па матывах гімну ўсіх «безьбілетнікаў» — «Мая краіна Беларусь» — дадалася бязглуздая чытанка, а чароўныя гукі флейты замянілі сэмплы, якія нагадваюць саўндтрэк да «Брыгады».

**Сяргей Будкін**

# The UNB




«The UNB». «Гибискус!». (р) «Aist Music», 2004.

А па-беларуску — слабо.

Апошнім часам усю айчынную папулярную музыку можна падзяліць на афіцыйна прызнаную і неафіцыйна прызнаную. Аднак нават у межах гэтага жорсткага падзелу існуюць выканаўцы, здольныя існаваць па-за рамкамі першай і другой сыстэм. Да іх належыць група «The UNB». Яе стваральнік хаваецца пад артыстычным псэўданімам Дольнік і, наколькі мне вядома, базуецца недзе ў Гомелі. Час ад часу прыяжджае ў Менск, зьбірае найлепшых музыкаў (І.Люты, К.Гарачы, Д.Бударын), наігрывае ім падрыхтаваны матэрыял. Пасьля ў студыі робіцца сумесныя аранжыроўкі — і чарговы альбом гатовы!

«Гібіскус!» — ня першы плод фантазій, іроніі, сарказму і месцамі вытанчанага сьцёбу безумоўна адоранага прыродай Дольніка. Музыка — самая разнастайная, аж да шыкоўных імітацыяў нашталт «Танга Месяца» (!!!). Дольнік удала гуляе расейскім словам. Ён часам нагадвае раньніх «Дзюбэляў», адно што не настолькі рэзкі і не абмежаваны стылёвай выразнасьцю музыкі, не настолькі дакладна выразны, што да сродкаў выказваньня. Гэта — не для вялікіх заляў, не для «Тузінаў». Пра выйсьце на шырэйшыя прасторы папулярнасьці Дольнік ня думае. Ён проста робіць тое, што яму падабаецца. Але тое, што гэта заслугоўвае самай пільнай увагі, — бясспрэчна. «Я цяпер кампазытар», «Лачплесіс», «Так гаварыў Пеця Клыпа», «Сшытак №5 (Калыхальнінг)», «Некалькі slow» — гэтыя творы могуць даць поўнае ўяўленьне пра тое, на што здольны загадкавы Дольнік.

А па-беларуску — слабо? Ото было б!

**UNBнуты Слухач**

# Тузін гітоў




«Прэм'ер-тузін-2005». Розныя выканаўцы. (р) «Тузін гітоў», «Вестрекордс-Плюс».

Побач песьні пра «не пайшоў нам клафэлін» і пра «цяпер за Радзіму адказвае кожны з нас».

Ускормлены тутэйшымі эфэмамі, слухач ня знойдзе на дыску ні чорных бумэраў, ні чарнічных разьбітых сэрцаў, ні далі-чужбінушкі, якія сталі ўвасабленьнем масавай беларускай музыкі безь беларускага слова. На дыску толькі беларускае — па мове, настроі, ідэалёгіі. Гэта праўдзівы тузін процілегласьцяў, якія імкнуцца спалучыцца, парадаксальна дапоўніць адна адну, ня ведаючы слова «фармат». Таму побач песьні пра «не пайшоў нам клафэлін» («Крамбамбуля» — «Турысты») і пра «цяпер за Радзіму адказвае кожны з нас» («UltraВожык» — «Атлянтыда»), пра «вецер на тваіх далонях» («J_Морс» — «Так-цік-так») і пра «схавай у мяне сваіх салдат» («Нэўра Дзюбэль» — «Жыцьцё»). Сьмех і грэх, каханьне і патрыятызм — усё ў адным «тузінаўскім» фляконе. Да ўсяго варта адзначыць прагрэсіўнасьць тузінаўцаў (Wiecier Mechaniczny, Сяргей Будкін, Аляксей Мінчонак): адчуваючы нястачу на беларускім рынку айчынных кружэлак з mp3-запісамі, яны дапоўнілі свой выніковы прадукт мэгабонусам з трыццацёх песень акурат у mp3. У мэгабонусе датрыманы той самы прынцып спалучаных супрацьлегласьцяў. «Тузін гітоў» даўно стаў правобразам добрага беларускага музычнага радыё заўтрашняга дня. Слухач жа, не зважаючы ні на што, ужо пасьпеў.

# J_Морс




«J_Морс». «Моё солнце». (р) 2000—2005 «J_Морс».

Не знайшлося месца для надзвычайнай беларускамоўнай песьні «Маё дзяўчо».

«J_Морс» не сядзяць, склаўшы ручкі, не адпачываюць на ляўрах, як сьцьвярджаюць зайздросьнікі. Яны працуюць на тое, каб пастаянна прыцягваць увагу стракатай і капрызьлівай беларускай аўдыторыі. Пад аранжава-чорную вокладку дыска сабрана ўсё, што хоць некалі ў творчасьці «J_Морс» зрабілася гітамі (ад віртуальна-фатальнага «Web-дызайну» да бізнэс-рамантычнага «Так-цік-так»). Адчуваючы рост цікавасьці слухача да сябе, музыкі гурту рызыкнулі прэзэнтаваць шэраг рэдкіх і нават невыдаваных кампазыцый: дэмбельска-шалапутлівы «Кастрычнік», постдэкадэнцкі «LSD ці чай?», каляжныя «Партызаны». Але чамусьці не знайшлося месца для надзвычайнай беларускамоўнай песьні «Маё дзяўчо», якая выдавалася толькі аднойчы. Як і на папярэдніх альбомах ды сынглах, на «Маім сонцы» зьмяшчаецца некалькі рэміксаў. Сюрпрызам жа для любога аматара «J_Морс» стане відэабонус зь пяцьцю кліпамі. Але вось здаецца, што галоўных сюрпрызаў варта чакаць трошкі пазьней — у наступным арыгінальным альбоме.

**P.S.** Амаль анэкдот з нагоды.

У адной гомельскай дыскарні. Паказваю дыск «Прэм'ер-тузін» і пытаю:

— Колькі?

— 7500, — адказвае хлопец-прадавец.

— А гэты? — паказваю «Маё сонца» «J_Морс».

— Таксама 7500. У нас усе расейскія дыскі па 7500.

**Сяргей Балахонаў**

# Карлікі й ліліпуты беларускага мовазнаўства


АРЦЁМ ЛЯВА

Правёўшы фанэтычны аналіз, скажыце: хто меншы па памерах — карлік ці ліліпут?

Гэта не з калёнкі Лёліка Ушкіна: адказаць на гэтае пытаньні мусілі сёлета дзевяціклясьнікі на абласных алімпіядах па беларускай мове. Пытаньні, зацьверджаныя Міністэрствам адукацыі, рыхтавалі сёлета супрацоўнікі Белдзяржунівэрсытэту.

Адказаць на іх ня лёгка нават падрыхтаванаму чалавеку. «Ліліпутам і карлікам» аўтар гэтых радкоў азадачыў многіх адукаваных людзей: рэдактара часопісу «Роднае слова» Міхася Шавыркіна, паэта й выкладчыка БДУ Андрэя Хадановіча і яшчэ дзясятак чалавек з вышэйшай філялягічнай адукацыяй. У тым ліку і сяброў клюбу «Што? Дзе? Калі?».

Бальшыня (правёўшы «фанэтычны аналіз») рабіла выбар на карысьць «карліка»: ён меншы, бо ў ім 6 гукаў. Да таго ж, мае памяншальны суфікс «-ік». Частка казала, што «ліліпут» меншы, бо такімі гэтых стварэньняў апісаў Суіфт.

Які ж правільны адказ, пацікавіцеся вы? Ліліпут!

Што праўда, адназначна патлумачыць гэты «правільны» адказ складана. Напрыклад, журы Віцебскай вобласьці прапанавала 2 (!) абгрунтаваньні.

Першае. У беларускай мове назвы больш дробных істотаў гучаць больш мякка. Таму «ліліпут» зь дзьвюма мяккімі [л'] драбнейшы, чым «карлік» зь цьвёрдым [р].

Другое. Прадстаўніца журы патлумачыла, што ва ўдзельнікаў павінна ўзьнікаць асацыятыўная гукавая сувязь «лілі—мілі». Таму «ліліпут» па сугуччы зь «мілімэтрам» і «міліграмам» будзе меншы за «карліка».

Грушы на вярбе! Калі першы варыянт аргумэнтацыі слушны, то «леў» (мяккае гучаньне [л']!) драбнейшы за «яшчарку» (яна і «шыпіць», і «рычыць»), а «зьлейшы» гучыць больш пяшчотна за «дабрэйшага». Пра «лілі—мілі» я ўвогуле маўчу.

Галоўны інспэктар упраўленьня агульнай сярэдняй адукацыі Тамара Саўчук зьдзівілася майму тэлефанаваньню: «А чаму вам гэтае пытаньне падаецца недарэчным?»

Аўтар пытаньня дацэнт БДУ Уладзімер Кулікові паведаміў мне, што 80% школьнікаў інтуітыўна выбіраюць «ліліпута». Прынамсі, такія вынікі паказала менская абласная алімпіяда. А што рабіць астатнім 20%, у якіх няма такой «інтуіцыі»? І як можна, пардон, інтуіцыю закласьці ў навуковы паказьнік?

Аўтар тлумачыць, што «ліліпут» гучыць больш мякка, што ліліпутаў прыдумаў і апісаў Суіфт, а карлікі — гэта людзі, ніжэйшыя за 150 см. Усё так, але пры чым тут фанэтыка?!

Магчыма, калі б аўтар пытаньня ўзяў выдуманыя словы (якую-небудзь «жажагабу» і «банікусю»), без трывалай сэнсавай прывязкі, пытаньняў да яго кампэтэнтнасьці не ўзьнікала б. Вялася б гаворка пра фонасэмантыку, псыхалінгвістыку й іншыя рэчы, якіх у школе яшчэ не вывучаюць.

У азначаным жа выпадку маем, што нават «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» паведамляе пра сынанімічнасьць словаў «ліліпут» і «карлік»: «Ліліпут — чалавек вельмі маленькага росту; карлік».

Ня думайце, што праблема «ліліпута й карліка» — адзіная прэтэнзія школьнікаў да алімпіяды. Якога роду назоўнік «валі» (з націскам на першы склад)? Вы ня можаце бяз слоўніка адказаць, хто гэта? Генэрал-губэрнатар у Іране! Толькі не пытайцеся, чаму гэта павінны ведаць школьнікі на адімпіядзе па беларускай мове. Гэта вялікая службовая таямніца супрацоўнікаў Міністэрства адукацыі й выкладчыкаў БДУ!

Затое не выклікае сумневаў іншая «таямніца» алімпіядаў. Навошта трэба раздаваць удзельнікам алімпіядаў загадзя падрыхтаваныя асадкі (на віцебскай абласной алімпіядзе было зроблена менавіта так)? У савецкі час у школах асадкі з стрыжнямі аднолькавага колеру (альбо аднолькавы атрамант) практыкаваліся на кантрольных і выпускных работах для таго, каб настаўнік мог незаўважна зрабіць праўкі. Звычайна для паляпшэньня працы фаварыта. Не хачу беспадстаўна вінаваціць работнікаў адукацыі, але ўсё ж не разумею: нашто аднолькавасьць асадак?

Вось такія алімпіядныя развагі. «Лілі-мілі, тралі-валі»...

**Адам Воршыч**

# Залік па рэвалюцыі

Амэрыканскія асьпіранты распрацоўваюць на сэмінарах «аранжавыя сцэнары» для Беларусі. Піша **Алесь Кудрыцкі.**

Натыкнуўшыся на гэтыя тэксты ў сеціве, я спачатку падумаў: перадвыбарчая правакацыя. На афіцыйным сайце Кенцкага каледжу права (Чыкага, ЗША) у сьпісе працаў накшталт «Пэрспэктывы народнага паўстаньня ў Тыбэце», «Перакуленая карупцыя: эканамічныя выгады хабарніцтва і эканамічны рост у Кітаі», «Палітычныя і юрыдычныя зьмены ў Іраку і іх рэгіянальны ўплыў» раптам трапляюцца дзьве назвы, якія адразу чапляюць беларускае вока: «Канец апошняй дыктатуры ў Эўропе: чатыры ключы для пасьпяховай каляровай рэвалюцыі ў Беларусі» (аўтар Джэралд Дж. Бэкерман) ды «Дабрачынныя фонды ЗША і Нямеччыны як рухавік фінансаваньня паўстаньняў, такіх як магчымая Аранжавая рэвалюцыя ў Беларусі ды магчымае паўстаньне ў Тыбэце» (Енс Візнэр). Прычым, выглядаюць працы ня проста як навуковапазнавальныя артыкулы, а як дэталёвыя інструкцыі да дзеяньня.

Як выявілася, за працамі стаяць не экспэрты рэжыму па контрпрапагандзе, а маладыя амэрыканскія асьпіранты. Прафэсар Гэнры Пэрыт прапанаваў ім напісаць справаздачы для сэмінару «Закон нацыябудаўніцтва». Хлопцы заданьне выканалі. У аднаго выйшла «настольная кніжка маладога рэвалюцыянэра», а ў іншага «памятка для аранжавага фінансіста».

## Рэвалюцыйна-сеткавы маркетынг

Праца Джэралда Дж. Бэкермана «Канец апошняй дыктатуры ў Эўропе: чатыры ключы для пасьпяховай каляровай рэвалюцыі ў Беларусі» пачынаецца эмацыйным нарысам пра сумнае жыцьцё ў «апошняй дыктатуры ў Эўропе». Аўтар карыстаецца мэтафарамі, пашыранымі сярод заходніх журналістаў — зрэшты, як інакш, калі праца пабудаваная найперш на зьвестках, атрыманых з газэтных артыкулаў. Паводле Бэкермана, Лукашэнка, валадар «пляцдарму тыраніі», бачыць будучыню Беларусі ў абʼяднаньні з Расеяй — і гэта першая тэза, зь якой можна спрачацца, тым больш, што Бэкерман грунтуе яе на артыкуле з газэты «Вашынгтон Пост» гадовай даўніны. Яшчэ адна пэрліна Бэкермана — парадаксальны тэрмін «неадукаваныя вясковыя эліты» — менавіта яны, на яго думку, аказваюць Лукашэнку падтрымку ў правінцыі.

Аўтар мяркуе, што мірныя рэвалюцыі апошняга часу (да іх ён чамусьці прылічае і рэвалюцыю ў Кыргызстане) далі надзею на паўтарэньне такога сцэнару і ў Беларусі. «Дарожная мапа» для рэвалюцыі, паводле асьпіранта, мусіць мець чатыры складнікі. Першы — моладзевы рух, арганізаваны паводле прынцыпу ўкраінскай «Поры», які карыстаецца найноўшымі тэхналягічнымі прыдумкамі для самаарганізацыі, другі — абʼяднаная апазыцыя, да якой гэты моладзевы рух далучыцца, трэці — незалежная прэса, якая будзе супрацьстаяць дзяржаўнай прапагандзе, і чацьвёрты — замежная падтрымка апазыцыі, а пры патрэбе — умяшальніцтва (відаць, так трэба перакладаць тэрмін «intervention», якім карыстаецца аўтар) у падзеі ў Беларусі.

Бэкерман прызнае, што ня ўсё так гладка, як выглядае на паперы. Гэтак, моладзевы рух не такі моцны, як у той жа Ўкраіне. Зубрам і іх калегам бракуе «гарызантальнай сеткавай структуры» — тут аўтар дае цэлы воз практычных парадаў па яе разбудове, многія зь якіх, аднак, выглядаюць малярэальнымі (напрыкад, ладзіць рок-канцэрты для прыцягненьня новых сяброў у рух). У нечым стратэгія Бэкермана нагадвае сеткавы маркетынг — карацей, рэвалюцыя па прынцыпах распаўсюднікаў «Гэрбалайфу». Як быццам, лягічна, але ў беларускіх умовах наўрад ці спрацуе так, як таго жадае аўтар.

## Навуковая рэвалюцыйная публіцыстыка

Па ўсім відаць, што Джэралд Дж. Бэкерман — старанны асьпірант, але гэтая стараннасьць яго і падводзіць. Ён дэталёва вывучае крыніцы, для таго каб зрабіць высновы, аднак не заўважае, што чэрпае інфармацыю з аднаго калодзежа — заходнеэўрапейскай ды амэрыканскай публіцыстыкі. А замежныя журналісты пасьпелі ўжо выпрацаваць асаблівы стыль напісаньня артыкулаў пра «апошнюю дыктатуру ў Эўропе» ды адмысловую сыстэму штампаў, якія хоць і дапамагаюць лягчэй «прадаваць» матэрыял газэтам ды аблягчаюць спажываньне інфармацыі непадрыхтаваным замежным чытачам, аднак занадта прымітывізуюць беларускую сытуацыю. Лукашэнка ў іх заўжды паўстае мiталягізаваным жудасным і адначасова батлеечным дыктатарам, якому супрацьстаіць апазыцыя, нярэдка ўвасобленая менавіта тымі дзеячамі, якія робяць сабе ў момант напісаньня артыкулу найлепшы піяр за мяжой ды маюць непасрэдны кантакт з самім карэспандэнтам.

«Якога колеру будзе беларуская рэвалюцыя? — пытаецца Бэкерман у канцы сваёй працы. — Зялёнага, чырвонага ці белага, традыцыйных колераў беларускага сьцяга?» Тут, як кажуць, без камэнтароў. Так ці інакш, шанцы на рэвалюцыйныя зьмены ў краіне Бэкерман ацэньвае як «выдатныя». Праца чытаецца з дваістым уражаньнем — з аднаго боку, адчуваецца, што аўтар зь беларускім жыцьцём сутыкаўся толькі ўскосна, а зь іншага — падкупае яго шчырая вера ў перамогу дэмакратыі ў Беларусі. Яму б «вытворчую практыку» ў РБ прайсьці, каб праца зайграла жывымі фарбамі.

Працяг на старонцы 22.

# Залік па рэвалюцыі

Працяг са старонкі 21.

## Карпарацыя для інсургента

Калі праца Бэкермана, хутчэй, публіцыстыка, дык навуковы (прынамсі, па форме) аналіз Візнэра — сапраўдная залатая жыла для аўтараў тэлевізійных антыапазыцыйных страшылак для электарату. «Што трэба для таго, каб фінансаваць паўстанцаў?» — пытаецца ў пачатку сваёй працы Енс Візнэр. І сам на гэтае пытаньне адказвае: «На першы погляд — грошы!» Аднак, паводле аўтара, адказ не такі просты — усё залежыць ад абставінаў. На думку Візнэра, фінансаваньне рэвалюцыі ня дужа адрозьніваецца ад фінансаваньня карпарацыі — плянаваньне, пошук грошай і іх разьмеркаваньне. Розьніца, хіба што, у дывідэндах, якія атрымлівае інвэстар.

У першай частцы працы Візнэр робіць тэарэтычныя выкладкі у галіне грашовага забесьпячэньня дзейнасьці паўстанцаў любога кшталту. Ён пералічвае асноўныя каналы, па якіх тыя грошы можна атрымліваць. Гэтак, у якасьці прыкладаў ён прыводзіць і разьбірае плюсы і мінусы фінансаваньня аранжавай рэвалюцыі ва Украіне заходнімі нафтавымі карпарацыямі ды Тыбэцкага ўраду ў выгнаньні — нямецкай дзяржавай.

Вялікую ўвагу аўтар надае пытаньню стварэньня сеткі пошуку патэнцыйных донараў — у якасьці пасьпяховых прыкладаў прыводзіць Армію вызваленьня Косава ды... «Аль-Каіду». Швайцарскім банкам, якія граюць значную ролю ў патаемным перапампоўваньні фінансаў, Візнэр прысьвячае цэлы разьдзел, гэтаксама як і эўрапейскай сыстэме змаганьня з адмываньнем грошай.

Потым пачынаецца самае цікавае. «Давайце ўявім, — піша аўтар, — што два кліенты зьвярнуліся да нямецкага юрыста з просьбай арганізаваць фінансаваньне двух паўстанцкіх рухаў: аднаго ў Беларусі, іншага — у Тыбэце». У наступнай частцы працы Візнэр распрацоўвае гіпатэтычныя дзеяньні таго юрыста. У адрозьненьне ад Тыбэту, дзе фінансавацца «будзе», хутчэй за ўсё, узброенае паўстаньне, у Беларусі грошы «пойдуць» на мірную Аранжавую рэвалюцыю: спачатку на падтрымку студэнтаў, потым — усіх астатніх незадаволеных групаў, а таксама мэдыяў, а ў выніку — на непасрэднае матэрыяльнае забесьпячэньне пратэстных акцыяў.

У якасьці мадэляў фінансаваньня аўтар параўноўвае нямецкую дабрачынную карпарацыю ды амэрыканскі дабрачынны траст і прыходзіць да высновы, што для беларускіх рэвалюцыянэраў найлепшы варыянт фінансаваньня — менавіта стварэньне «пад сябе» дабрачыннай карпарацыі ў Нямеччыне. У дадатку Візнэр дэталёва пералічвае ўсе патрэбныя для гэтага дакумэнты.

Меркаваць пра навуковую вартасьць працаў складана — тым больш што пісаліся яны, гледзячы зь іншага берагу акіяну... Але вось сам факт таго, што дасьледаваць тэму магчымай рэвалюцыі ў Беларусі бяруцца ўжо ня толькі гуру паліталёгіі, але і асьпіранты, наводзіць на пэўныя думкі. Тым больш, што пішуць яны не сухія справаздачы, а інструкцыі для рэвалюцыянэраў. Вось толькі наколькі яны для Беларусі прыдатныя? Прынамсі, з выстаўленьнем адзнак прафэсару давядзецца пачакаць да поўнай перамогі дэмакратыі ў краіне «апошняга эўрапейскага дыктатара».

**З працамі кенцкіх студэнтаў можна пазнаёміцца тутака:**

http://www.kentlaw.edu/perritt/courses/seminar/jerry–bekkerman–BELARUS%20THESIS.htm

http://www.kentlaw.edu/perritt/courses/seminar/jens–wiesner–seminar%20final.htm



AG

**16 студзеня ў Варшаве, Беластоку і іншых гарадах Польшчы прайшлі маніфэстацыі салідарнасьці з Свабоднай Беларусьсю. Маніфэстанты зь бел-чырвона-белымі сьцягамі пракрочылі вуліцамі Варшавы, Беластоку і інш. Яны несьлі транспаранты «Памятаем аб ахвярах рэжыму Лукашэнкі», «Салідарныя зь Беларусьсю», сьпявалі беларускія песьні, гукалі «Вольныя выбары — вольная Беларусь», «Так — Беларусі, не — Лукашэнку», «Bialorusi nikt nie zdusi» («Беларусь ніхто не задушыць»).**

# Джэралд Бэкерман: «Мае парады прыдаліся б у «ідэальны момант» для рэвалюцыі»

Аўтар рэвалюцыйнага «ноў– хаў» марыць займацца беларускім пытаньнем у Вашынгтоне

**«НН»: Спадар Бэкерман, раскажыце крыху пра сябе.**

**Джэралд Бэкерман:** Мне 24 гады. Сваю вучобу я пачаў ва ўнівэрсытэце штату Ілінойс, дзе вывучаў паліталёгію і гісторыю. Там я атрымаў ступень бакаляўра. Акрамя гэтага я год навучаўся ў Жэнэўскім унівэрсытэце ў Швайцарыі, дзе вывучаў міжнародныя адносіны і правы чалавека. Там я пачаў цікавіцца гэтай тэматыкай усур'ёз і вырашыў паступіць у магістратуру юрыдычнага каледжу Кент (Чыкага), дзе вучуся ўжо другі год. Мая спэцыялізацыя — міжнароднае права і міжнародны бізнэс.

**«НН»: Чаму Вы выбралі такую тэму для сваёй працы?**

**ДжБ:** Я вырашыў напісаць сваю працу пра Беларусь, бо адтуль паходзіць мая сям'я. Дарэчы, сам я нарадзіўся ў Менску ў 1981 г. Мае бацькі пераехалі ў ЗША, калі мне было 7 год, і з таго часу мы ўвесь час жылі ў Чыкага. Я амаль цалкам згубіў усялякую повязь зь Беларусьсю, але ў апошнія некалькі год зноў пачаў цікавіцца краінай, у якой нарадзіўся. Апошнім часам дужа зацікавіўся палітычнай сытуацыяй у Беларусі, да гэтага дадалося жаданьне лепей зразумець прычыны Аранжавай рэвалюцыі ды ўвогуле зьменаў ва Ўсходняй Эўропе. Гэта і натхніла мяне на напісаньне гэтай працы.

**«НН»: Калі Вы апошні раз былі ў Беларусі?**

**ДжБ:** Я ні разу ня быў там пасьля пераезду ў ЗША, але мае дзядуля з бабуляй нядаўна наведалі радзіму ды паказалі мне свае відэазапісы. Дзяды — людзі, якія дапамагаюць мне трымаць кантакт зь Беларусьсю.

**«НН»: Вашая праца надта нагадвае правакацыю. Так і бачыцца вядучы тэлепраграмы, які дрыготкім голасам распавядае пра тое, што на замежным інтэрнэт-сайце зьявіўся дапаможнік па рэвалюцыі...**

**ДжБ:** Ну што вы, я зусім ня меў на мэце выклікаць нэгатыўны розгалас у Беларусі. Не хацелася б, каб працу паказвалі па тэлебачаньні ў мэтах палітычнай прапаганды!

**«НН»: Але што гэта за заняткі, на якіх трэба пісаць кіраўніцтвы па «зьмене дэмакратычнага ладу»?**

**ДжБ:** Я пісаў яе для сэмінару, прысьвечанага нацыябудаўніцтву, дэмакратызацыі і міжнароднай палітыцы. Гэты сэмінар радыкальна адрозьніваўся ад нашых звычайных заняткаў па праве: студэнтам далі шмат свабоды і магчымасьць самім выбіраць тэму. Галоўнае, каб яна асьвятляла палітычную сытуацыю ў той ці іншай краіне. Я меў на мэце не навуковы аналіз, а даходлівае тлумачэньне палітычнага клімату Беларусі сваім аднагрупнікам і прафэсару. Бо, калі па шчырасьці, пра падзеі ў Беларусі ўвогуле мала хто ведае, і яшчэ менш людзей імі сапраўды цікавяцца.

**«НН»: Ад гэтага і Ваша эмацыйнасьць, якая праглядае ў працы?**

**ДжБ:** Я быў моцна ўражаны тым, як украінцы здолелі дасягнуць палітычных зьменаў у атмасфэры страху і карупцыі. Я вырашыў дасьледаваць магчымасьці ўзьнікненьня падобнага мірнага руху пераменаў у Беларусі. Пачаўшы зьбіраць матэрыял, я быў уражаны тым, наколькі разьвіты беларускі моладзевы рух. Калі я ацаніў яго патэнцыял, то вырашыў напісаць працу ў выглядзе дапаможніка «як дасягнуць палітычных зьменаў у Беларусі». Пры гэтым я дасюль ня ўпэўнены, ці будзе гэтая мэта насамрэч дасягнутая. Але я настолькі натхніўся магчымасьцю зьменаў, што ў выніку выйшла нешта накшталт «інструкцыі» для рэвалюцыянэраў. Натуральна, я ўжо зразумеў, што Беларусь не ва ўсім падобная да Ўкраіны. Хутчэй, мае парады прыдаліся б у «ідэальны момант», найбольш спрыяльны для рэвалюцыі. Але ці прыйдзе ён у Беларусі — прагназаваць не бяруся.

**«НН»: Вы, бадай, ні словам не ўзгадалі задушэньне Лукашэнкам беларускай нацыянальнай культуры. Лічыце гэта няважным?**

**ДжБ:** Вы правільна заўважылі, я практычна не закрануў гэтай праблемы ў сваёй працы. На гэтую памылку, дарэчы, мне ўжо ўказаў мой дзед, які напісаў за сваё жыцьцё больш за 500 навуковых артыкулаў. Я лічу гэтую праблему важнай, але не вызначальнай для таго, каб абудзіць людзей у палітычным пляне. Думаю, людзям больш баліць парушэньне рэжымам правоў чалавека, шпіёнства, парушэньне Канстытуцыі, прыцісьненьне незалежных мэдыяў. Але, натуральна, я магу памыляцца. Так ці іначай, спадзяюся, што народ Беларусі зможа выкарыстаць свой нацыянальны гонар, каб дасягнуць зьменаў. Так, зрэшты, адбылося ва Ўкраіне.

**«НН»: Якія маеце пляны на будучыню?**

**ДжБ:** Праз год я скончу ўнівэрсытэт. Пакуль тое, летам думаю яшчэ павучыцца дзе-небудзь у Эўропе. Ва ўнівэрсытэце Кент я заснаваў праект, які мае на мэце спрыяньне дэмакратызацыі ў сьвеце і ў прыватнасьці ва Ўсходняй Эўропе і Цэнтральнай Азіі. Спадзяюся знайсьці дзяржаўную працу ў Вашынгтоне, калі ня ўдасца, то ў адным з НДА — галоўнае, каб мая дзейнасьць была зьвязаная з краінамі былога СССР. Мая мара — працаваць ва ўрадзе ў сфэры дачыненьняў зь Беларусьсю. Спадзяюся, Беларусь калі-небудзь ссуне сфэру сваіх інтарэсаў на Захад і пачне набіраць палітычнай ды эканамічнай моцы.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

# Крэмль зацьвердзіў Мілінкевіча?



Паводле адной з вэрсіяў, Захад знаходзіць з Крамлём паразуменьне, што да пэрсоны лідэра беларускай апазыцыі. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Вось кажуць: сумныя выбары, усё ўжо вядома. Але гэта — калі бачыць толькі надводную частку айсбэрга. Між тым вынік электаральнай кампаніі шмат у чым вызначаюць падводныя плыні.

Паводле парыскай «Монд», ня хто-небудзь, а францускі міністар замежных справаў Ф. Дуст-Блязі, які быў у Маскве зь візытам 18—19 студзеня, падштурхнуў Крэмль паўплываць на Лукашэнку, каб той запрасіў на выбары назіральнікаў АБСЭ.

Думаеце, Захад пераацэньвае сваю дыпляматыю?

Але й сапраўды — сачыце за датамі! — 18 студзеня беларускае замежнапалітычнае ведамства абвесьціла праз БелТА пра запросіны назіральнікаў толькі ад СНД, ЭўрАзЭСу ды АДКБ (жалезныя таварышы!). І раптам праз дзень, 19-га, на брыфінгу ў МЗСе становіцца вядома, што ў сьпісе запрошаных фігуруе ўжо і цяжкавымаўляльнае БДІПЧ АБСЭ. Мо напярэдадні «машыністка памылілася» (так выкручваліся за часамі Палітбюро)?

Ідзём далей. Згадайце: з кім трохі раней сустракаўся Дуст-Блязі ў Парыжы? Правільна, зь Мілінкевічам! Гэта нагадвае ўжо лягічны ланцужок.

А вось і наступнае зьвяно. Днямі «Московские новости» далі зразумець, што між Захадам і расейскім кіраўніцтвам, бадай, вымалёўваецца кансэнсус датычна фігуры Мілінкевіча. Ён, маўляў, падаецца кампраміснай кандыдатурай — дэмакрат, але без пазьняковаўскага радыкалізму ў нацыянальным пытаньні. Маскоўскае выданьне падкрэсьлівае: так, выйграць у Лукашэнкі на гэтых выбарах нерэальна, але рэальна вярнуць апазыцыю ў прававое палітычнае поле.

Крэмль, бадай, насамрэч не хацеў бы класьці ўсе яйкі ў адзін кошык. Іншае пытаньне, ці здолее апазыцыя падрыхтаваць другі кошык. Вынікам мінулай прэзыдэнцкай кампаніі былі толькі разьбітыя ночвы. Адзіны кандыдат 2001 г. праглынуў паразу, распусьціў зародкавы «Майдан» на Кастрычніцкім пляцы — і лёг на дно.

Цяпер рубам паўстае пытаньне, ці будзе Мілінкевіч сапраўды адзіным. Іначай кажучы, ці пойдзе на саступку яму Казулін (які відавочна адстае паводле рэйтынгу ды каманднага патэнцыялу, але разам з тым адцягвае долю небагатага апазыцыйнага рэсурсу). Дарэчы, далучэньне да лягеру аб’яднаных дэмакратаў стала б для Казуліна найлепшым абвяржэньнем вэрсіі, што ён ёсьць крэатурай кіроўнай каманды.

Калі ж адзіны набярэ дэ-факта адсоткаў 30, то яго ўжо так проста ня згорнеш з палітычнае дошкі. Фактычна, ён набывае тады імунітэт, шмат мацнейшы ад дэпутацкага. І здольны стаць ядром далейшай крышталізацыі апазыцыйных сілаў.

У такім разе, паводле выразу аднаго з аналітыкаў, 19 сакавіка ўсё толькі пачнецца. У краіне можа скласьціся іншая палітычная канфігурацыя. Апанэнты ўлады ўжо ня будуць выглядаць такімі маргіналамі. Зьявіцца шанец пакрысе выпрастаць праклятую сьпіраль маўчаньня.

Калі рэйтынг адзінага дасягне адсоткаў 30, яго ўжо так проста ня згорнеш з палітычнае дошкі. Фактычна, ён набудзе імунітэт, шмат мацнейшы ад дэпутацкага.





Лістаўніца ў Акопах, бліз хутару, што належаў Купалавай сям'і.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Як стаць зоркай



Парады Тані Сулімавай і газэце «Беларусь сегодня» дае фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

Днямі краіна адсьвяткавала гадавіну гістарычнай пастановы аб 75% беларускай музыкі, што заклала фундамэнт беларускай «Фабрыцы зорак».

Сацыяльна арыентаванай краіне — сацыяльна-арыентаваны Бэвэрлі Гілз. Урадам пастаўлена заданьне: нашы поп-прымадонны павінны гэтак жа гучна грымець біжутэрыяй, як абарыгены Рублёўкі. Але ў гэтай сфэры ў нас шмат недахопаў.

«Саўбелка» піша пра настаўніцу музыкі Сьняжану Лазарэнку, што атрымлівае 240 тыс. тугрыкаў і якая замярзае ад маразоў — ейную кватэру ня топяць. Побач — калёнка зоркі радыёэтэру Тацяны Сулімавай, якую перакліміла словамі «Віетнам? Чаму б не», пасьля чаго яна ўкацілa ў Сайгон і цяпер ня ведае, куды падзецца ад смажанага паху сьмярдзючай віетнамскай ежы.

Думаеце, Сьняжана, прачытаўшы пра тур «першай бляндынкі краіны», скажа хвораму на астму сыну, апранутаму ў 2—3 швэдры: «Бедная Таня, добра, што мы таксама не паехалі ў Віетнам»? У ейнай душы заварушыцца гліст клясавай нянавісьці. Сулімавы швэндаюцца па Канах, а настаўнікі музыкі са стольнікам баксаў заробку, чытаючы пра іх заскокі, маўчаць у анучу.

На маю думку, тут трэба зьвярнуцца да вопыту Элачкі-Людажэркі, якая прыдумала арыгінальную сыстэму кампэнсацыі матэрыяльнай няроўнасьці. Прыдбаўшы заячае футра і пафарбаваўшы яго ў зялёны колер, яна пераканала сябе, што гэта мэксыканскі тушкан.

Тое ж самае трэба рабіць і цяпер. Кожны чарговы прагон Сулімавай пра новыя туры трэба сканчаць парадамі: «Як уцерці нос Тані». Напрыклад, на сулімаўскае «ў роце маркапане тае, і вочы пажыраюць Рым», трэба адказваць: «Набудзьце марозіва «Гоша» і паглядзіце па тэлеку які-небудзь італьянскі фільм». Сулімава задушыцца ад зайздрасьці. Кампэнсацыйная мадэль Элачкі дазваляе захаваць сацыяльную ляяльнасьць грамадзтва.

Аднак на ўсялякі выпадак я б на месцы Якубовіча сказаў бы Тані: «Пішы пра тое, што ў роце тае, але пэрыядычна нешта кшталту: учора а палове 9-й праехала мэтром ад Кунцаўшчыны да Магілёўскай. Кууууууул!!!»

Мы друкуем падборку лістоў чытачоў на перадвыбарную тэматыку. У падтрымку Лукашэнкі не выказваецца ніхто, а вось у пытаньні тактыкі аднаўленьня дэмакратыі ў Беларусі меркаваньні разыходзяцца.

## Прапанову Петрушэнкі падтрымаю

Прапанова Мікалая Петрушэнкі («НН», №1) — прыхільнікам пераменаў прыйсьці на выбарчыя ўчасткі ўсім ад 12-й да 14-й — мне падабаецца. Прапанова ж Пазьняка — наіўная. Хто там будзе лічыць тыя афіцыйныя бюлетэні і каму іх здаваць? Чыстыя аркушы паперы «члены избиркома» пусьцяць на патрэбы, а адсотак падтрымкі нашага ўсенародна абранага мужыка пераўзыдзе нават назарбаеўскі.

**Віктар, Капыль**

## Галоўнае — правільна лічыць

Мяне зьдзівіла сьцьверджаньне В.Станкевіча («Каму Беларусь дарагая, той ня будзе супраць дэмакратыі», «НН», №2): «Хто будзе прэзыдэнтам, скажа беларускі народ». Народ даўно раскалоўся на дзьве роўныя часткі. Старэйшае пакаленьне, затумканае дзяржпрапагандай (гэта 30—35%), будзе галасаваць «за». Аж да самаспаленьня. Будуць змушаныя галасаваць «за» чынавенства, студэнты, вайскоўцы, міліцыянты — людзі падняволеныя. Гэта яшчэ 10—15%.

Работнікі на будаўніцтве моста ў Віцебску маюць заробак 200—300 тыс. Напэўна, гэта сярэдні заробак па краіне, насуперак тэлепрапагандзе. І гэтым людзям не давядзеш, што яны жывуць добра. Не паверыць. У вёсцы заробак яшчэ меншы. Напэўна, адзіны горад, дзе сярэдні заробак большы за 200—300 тыс., — гэта Менск. Але наўрад Менск будзе галасаваць «за». Усіх такіх жыхароў набіраецца каля 50%.

Што з таго, што яны супраць? Назіральнікаў павыганяюць з участкаў і «як трэба» падлічаць бюлетэні.

75% не паверац, надта круглая лічба. А 83% — проста бліскучая лічба.

**Сяргей Дарашэнка, Віцебск**

## Я за Народнае галасаваньне

Выбараў ня будзе! Іх ужо няма, бо няма роўных умоваў для кандыдатаў. Твой голас нават лічыць ня будуць, і тады чым твой непалічаны голас за Мілінкевіча будзе адрозьнівацца ад непалічаных галасоў у 2001-м? Нічым.

Адзіны шлях перамагчы — сарваць выбары. Але байкот ня выхад. Я байкатаваў у свой час выбары й скажу: больш у гэтым казіно гуляць нельга. Перад закрыцьцём участку колькасьць тых, хто прагаласаваў, «дакручваецца» да патрэбнага працэнту вядомымі спосабамі. Дадайце датэрміновае галасаваньне і адмацавальныя талёны. Байкот ня мае дакумэнтальных наступстваў. Працэнт байкатоўцаў нельга зафіксаваць і даказаць.

Байкот на выбарах-2006 не рэальны і таму, што больш за 50% выбаршчыкаў усё роўна прыйдуць на ўчасткі — насельніцтва ў нас палітызаванае.

Адзіны шлях — Народнае галасаваньне. Хаця б 20—30% бюлетэняў сабраць — вынікі выбараў пад сумневам. А калі 50% +1 (і гэта рэальна!) — аўтаматычны імпічмэнт. Народнае галасаваньне ломіць у мэханізьме рэжыму дасыць важны вузел — «галасавальную машынку». Не працуе адзін вузел — спыняецца ўся сыстэма.

Уявім: на ўчастку вываварочваецца на стол скрыня, а там — палова белых аркушаў замест бюлетэняў. Падпісаўшы спушчаны згары пратакол, кожны чалец камісіі — а асабліва старшыня — падпіша сабе прысуд у справе фальсыфікацыі выбараў і спробе неканстытуцыйнага захопу дзяржаўнай улады. А доказы да гэтай справы — на руках у выбаршчыкаў (Народнай грамадзкай камісіі). Прычым доказы важкія — з подпісамі гэтага ж старшыні і чальцоў камісіі і пячаткай.

Нават прыхільнікі Лукашэнкі ня хочуць цярпець маніпуляцый і гатовыя праверыць чысьціню сыстэмы. Я сустрэў такое, размаўляючы зь людзьмі (зараз толькі й размоваў, што пра выбары): «Напішуць то яны напішуць, а я пагляджу, ці пра мяне напішуць! Паперына ж тутай!» — кажуць такія людзі. Прынамсі ў трох рабацяг я выкупілю іх бюлетэні за пляшку чарніла.

І тых, хто аспрэчвае моц Народнага галасаваньня, варта запытаць пра іншыя даступныя шляхі да Перамогі. Я пакуль такога ня бачыў. Часу засталося — менш чым два месяцы. Толькі й хопіць, каб паведаміць пра ідэю галасаваньня мільёнам тром-чатыром.

**Вацлаў Заякот, Менск**

## Народнаму галасаваньню — не, байкоту — так!

Пазьняк прапануе Народнае галасаваньне са зборам 50% бюлетэняў адмысловай Народнай грамадзкай камісіяй на Цэнтральнай плошчы ў Менску. Магчыма, нават ужо знайшлі месца для грузавіка, які будзе вывозіць некалькі тысячаў тонаў бюлетэняў з плошчы? Можа, зробленыя адпаведныя заходы, каб бараніцца ад розных там «алмазаў» і «беркутаў», што ў масках і іншых прычындалах будуць накіраваныя на плошчу для «падтрыманьня грамадзкага парадку і недапушчэньня дэстабілізацыі абстаноўкі»?

Год таму ўжо была падобная ініцыятыва Гары Паганяйлы [з адарваньнем кавалку бюлетэня]. Кожны, хто адгукнуўся на заклік і вынес частку бюлетэня з выбарчага ўчастку, фактычна аддаў свой голас за прадвызначаны вынік рэфэрэндуму.

Няўжо няясна, што ўсе падобныя рэчы толькі садзейнічаюць і спрыяюць выбару ўладаў, бо заклікаюць да прыняцьця ўдзелу ў выбарах? Трэба паважаць сябе і няўдзелам ў выбарах не дазволіць несанкцыянавана выкарыстоўваць свой голас у непатрэбным накірунку.

Таму я падтрымліваю тых прэтэндэнтаў, што адмовіліся ад удзелу ў выбарчым фарсе з-за відавочнай бессэнсоўнасьці мерапрыемства, што праводзіцца па сцэнару рэжыму. Зьберажом сілы і нэрвы свае і сваіх прыхільнікаў.

**Эльяш Банэль, Менск**

## Нью-Васюкі

«Як мяркуе Аляксандар Лукашэнка, Докшыцы могуць стаць важным турыстычным цэнтрам: «Выгоднае разьмяшчэньне, значны экалягічны патэнцыял (найперш — Бярэзінскі запаведнік), культурная спадчына, гераічная мінуўшчына — маецца ўсё, каб ператварыць Докшыцы ў важны турыстычны цэнтар краю». БелТА.

Сотні тысяч людзей, багата забясьпечаных людзей, будуць імкнуцца ў Васюкі.

**Вінт, tut.by**

## УДАКЛАДНЕНЬНІ

Сабінэ Дёнінггаўз, якая цытавалася ў №2, не дэкан факультэту славістыкі ў Фрайбургу, а прэтэндэнтка на гэтую пасаду, прафэсарка Фрайбурскага й Базэльскага ўнівэрсытэтаў.

Валеры Максімовіч — доктар навук, а не кандыдат навук, як паведамлялася ў ў артыкуле «Літаратары і іншыя ідэалягічныя работнікі» ў №3. Прыношу прабачэньні за недакладнасьць. Аркадзь Шанскі.

## Зварот Таварыства беларускай мовы

Апошнім часам у Менску назіраецца сьвядомае абмежаваньне канстытуцыйных правоў беларускамоўных чытачоў. У газэтных шапіках «Белсаюздруку» і «Белпошты» амаль немагчыма знайсьці газэту альбо паштоўку на дзяржаўнай беларускай мове. «Менгарсаюздрук» не заключыў дамоваў на продаж у сталіцы вядомых незалежных беларускамоўных выданьняў — «Нашага слова», «Нашай Нівы» і «Рэгіянальнай газеты». У нязначнай колькасьці паступаюць у продаж газэты «Літаратура і мастацтва», «Культура» і «Звязда». У адрозьненьне ад аддзяленьняў сувязі і Галоўпаштамту, у шапіках «Белсаюздруку» практычна зьніклі беларускамоўныя паштоўкі, календары і дзіцячая літаратура.

Мы зьвяртаемся да сяброў і прыхільнікаў ТБМ, усіх неабыякавых грамадзян і гасьцей нашай сталіцы рабіць адпаведныя запісы ў кнігу заўваг і прапаноў, якая павінна быць у кожным шапіку, альбо непасрэдна зьвяртацца да сп. І.В. Дудзіча, дырэктара Менгарсаюздруку па адрасе: 220050 Менск, вул. Валадарскага, 16.

**Сакратарыят ТБМ**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@promedia.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# Час волі

У 1990-х менавіта на вуліцах Менску, дзякуючы самаахвярнасьці дзясяткаў тысячаў простых грамадзянаў Беларусі, былі спынены ганебны гандаль нашай Незалежнасьцю. Дэмакратыя таксама можа быць здабыта толькі на вуліцах, піша з высылкі **Мікалай Статкевіч**.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Відавочна, што зьмена ўлады ў Беларусі праз выбары пры гэтым рэжыме ўжо немагчымая. Відавочна таксама, што вяртаньне Беларусі да дэмакратыі мэтадамі, законнымі з гледзішча сёньняшняга рэжыму, таксама немагчымае. Ён усталяваў такія законы, якія дазваляюць кваліфікаваць любое дзеяньне, скіраванае да дэмакратыі, як незаконнае ці нават «злачыннае».

У такой сытуацыі дэмакратычныя сілы ня маюць іншага выйсьця, як шукаць альтэрнатыўныя, ня выбарчыя сродкі дэмакратызацыі. Вопыт дэмакратызацыі краінаў Усходняй Эўропы ў канцы 1980-х дае вялікі досьвед магчымых варыянтаў пераходу ад дыктатуры да дэмакратыі. Дэмакраты абавязаны скарыстоўваць любую нагоду... Безумоўна, яны ня маюць права не скарыстаць для адной з такіх спробаў арганізаваны рэжымам рытуал пралянгацыі ім свайго існаваньня пад умоўнай назвай «прэзыдэнцкія выбары». Гэты рытуал палітызуе грамадзтва, спараджае ў яго спадзеў на зьмены і разьмяшчае Беларусь у фокусе міжнароднай увагі. Таму дэмакратычныя сілы краіны аб'ядналіся, вылучылі адзінага кандыдата і заявілі аб гатоўнасьці «бараніць сваю перамогу» на вуліцах Менску. Далейшае разьвіцьцё падзей можа ісьці па двух сцэнарах.

**Сцэнар А.** Улада рэгіструе адзінага кандыдата.

Пры разьвіцьці падзей па такім сцэнары дэмакратычным сілам неабходна весьці дзьве кампаніі. Адна зь іх — звычайная электаральная. Яе мэта — карыстаючыся нагодай, прэзэнтаваць перад беларускім грамадзтвам альтэрнатыўны, эўрапейскі шлях разьвіцьця краіны і сілы. Трэба адразу разумець, што гэтая кампанія аніяк ня здольная паўплываць на афіцыйныя вынікі «выбараў». Нават сацыялягічным апытаньням нельга верыць, бо яны ня ўлічваюць усё большы «рэйтынг страху» апытаных, калі людзі баяцца шчыра адказваць на пытаньні сацыёлягаў. А ёсьць яшчэ «рэйтынг страху» саміх сацыёлягаў, і ён таксама расьце.

Другая, асноўная кампанія павінна быць скіравана на актыўную, дэмакратычна настроеную маладую частку насельніцтва Менску і буйных гарадоў. Мэта гэтай кампаніі — мабілізацыя як мага большай колькасьці людзей, гатовых адстойваць свой выбар.

**Сцэнар Б.** Улада не рэгіструе адзінага кандыдата. У такім выпадку дэмакратычныя сілы маюць права абвесьціць байкот. Яны атрымоўваюць магчымасьць сканцэнтраваць усе свае рэсурсы на арганізацыю вулічных акцый. Праводзіць гэтыя акцыі можна будзе не чакаючы завяршэньня «выбарчай кампаніі».

Рэгістрацыя іншых кандыдатаў, якія таксама пазыцыянуюць сябе як дэмакраты, нічога не мяняе. Усе гэтыя кандыдаты ўжо пасьпяшаліся заявіць, што будуць скарыстоўваць толькі «законныя» мэтады. Іхнія заявы — гэта найперш мэсыдж да ўлады, згода на ролю «тэхнічных» кандыдатаў. У лепшым выпадку потым яны будуць здольныя абвесьціць аб скрадзенай у іх перамозе, у горшым — павіншаваць кіраўніка рэжыму з «сумленнай перамогай».

Воля для Беларусі будзе здабыта на вуліцах Менску. Час для гэтага прысьпявае. У канцы 1990-х менавіта на вуліцах Менску, дзякуючы мужнасьці і самаахвярнасьці дзясяткаў тысячаў простых грамадзянаў Беларусі, былі спынены ганебны гандаль нашай Незалежнасьцю.

Тады мы не маглі ісьці да канца, бо адчувалі нетрываласьць беларускай дзяржавы, за якой тады не было Нацыі. Незалежнасьць дасталася нам выпадкова, як падарунак пакаленьню, якое яе не заслужыла. Але тысячы людзей пад ударамі міліцэйскіх дубінак і на нарах Акрэсьціна аплацілі гэты рахунак.

Як мы і спадзяваліся, пануючы рэжым, дзякуючы непазьбежнаму імкненьню любой улады да самазахаваньня, даў беларускай нацыі час дафармавацца. Не сакрэт, што галоўнай праблемай масавай беларускай самаідэнтыфікацыі ў пачатку 1990-х гадоў была яе неасобнасьць ад расейскай.

Сам факт 14-гадовага існаваньня асобнай беларускай дзяржавы вырашыў гэтую праблему. Нават палітыка і прапаганда рэжыму спачатку міжволі спрыяла «дэрасеізацыі» масавай сьвядомасьці, а зараз спрабуе ўжо сьвядома скарыстоўваць патрыятычныя пачуцьці. Незалежнасьць — незваротная, бо зараз яна абапіраецца на пачуцьце беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці большасьці насельніцтва краіны, на адчуваньне асобнасьці нашага супольнага лёсу.

Пануючы рэжым, наадварот, зрабіўся перашкодай на шляху разьвіцьця нацыі. Ён перашкаджае мадэрнізацыі народнай гаспадаркі, закрывае нам шлях у Эўропу, перасьледуе нацыянальную культуру. Урэшце, увесь будынак сёньняшняй улады збудаваны на да-вальнай далоні Крамля, які сваімі мільярднымі датацыямі спрыяў захаваньню і ўмацаваньню беларускага рэжыму, а зараз патрабуе разьлічыцца. Пальцы гэтай далоні цяпер сьціскаюцца вакол стратэгічна важнага «Белтрансгазу» і нацыянальнай валюты, пагражаючы ператварыцца ў нафта-газавы кулак.

У нас ужо ёсьць свой Дом — незалежная Дзяржава. Прыйшоў час наводзіць парадак у сваім доме. Калі Беларусь стане вольнай — залежыць толькі ад мужнасьці, самаахвярнасьці і волі яе сыноў і дачок. Усё вызначыць наша воля і наша прага да Волі.

*Баранавічы*

*Скарочана. Поўны тэкст артыкулу будзе надрукаваны на сайце* ***www.bsdpng.info***

# Воблака ў штанах

У рэвалюцыяў павінны быць свае сымбалі. Але перш, чым яны зьявяцца, патрэбныя рэвалюцыйная сытуацыя ў грамадзтве ці хоць бы рэвалюцыйныя настроі. Піша **Віталь Тарас.**

Цяжка не пагадзіцца са спадарыняй Длатоўскай, якая надрукавала сёлета ў трэцім нумары «Нашай Нівы» артыкул пад назвай «Джынсы — не найгоршы варыянт». Шчыра кажучы, калі пісаў пра «джынсы» й «джынсу» на старонках «НН», не разьлічваў на сур'ёзную палеміку вакол тэкстыльных вырабаў ды іхнага значэньня ў гісторыі сучаснасьці. Дальбог, зусім не хацелася ні з кім спрачацца наконт прадметаў вопраткі. Але слова не верабей! Відавочна, мая іронія ў дачыненьні да джынсаў як нейкага сымбалю не была пачутая, і аўтар быў залічаны калі не ў контрарэвалюцыянэры, дык у рэтраграды, ворагі прагрэсу й моды. Зразумела, няма ў тым вялікай бяды. Але ж размова была не пра вопратку...

### Паголеныя чарапы

Адразу адкрыю вялікую таямніцу. Аўтар гэтых радкоў амаль усё сваё сьвядомае жыцьцё, гадоў з 14-ці, носіць джынсы. І мой сын таксама. І магчыма, мая ўнучка будзе іх насіць, калі падрасьце. Паводле сваёй зручнасьці джынсы — сапраўды геніяльная рэч. Вось толькі ніколі мне ці майму сыну не прыходзіла да галавы, што надзець штаны — значыць, зьдзейсьніць гераічны ўчынак.

Прыходзіць на памяць эпізод з майго школьнага маленства. Недзе на пачатку 1970-х гадоў у школе, дзе я вучыўся, здарыўся скандальны выпадак. Некалькі хлопцаў-выпускнікоў — чалавек шэсьць — прыйшлі на заняткі, аднолькава стрыжаныя «пад нуль». Памятаю, як яны стаялі на школьнай лінейцы з абсалютна лысымі, паголенымі чарапамі, з задаволенымі тварамі, ледзь стрымліваючы ўсьмешкі. Настаўнікі былі ў шоку. Некалькі дзён запар перад тым яны патрабавалі ад старшаклясьнікаў пастрыгчы валасы, бо яны падаваліся школьнаму начальству занадта даўгімі. Такой радыкальнай альтэрнатывы яны не чакалі й разгубіліся.

Насіць прычоскі а-ля «Бітлз» у школе за тым часам катэгарычна забаранялася, гэта лічылася ідэалягічнай дывэрсіяй. (Гэтаксама не было чаго й думаць тады прыйсьці ў школу ў джынсах.) А вось пра слова «скінгэды» тады яшчэ, мабыць, ня чулі ні школьнікі, ні нават большасьць настаўнікаў. Інакш, вядома, хлопцам іхны жарт не даравалі б. А так усё абышлося без наступстваў. Школьны ваенрук нават быў рады і ставіў паголеных хлопцаў іншым у прыклад: вось, маўляў, як трэба рыхтавацца да службы ў савецкім войску!

А хлопцы, безумоўна, пра войска ў той момант ня думалі. І дысыдэнтамі, змагарамі з савецкай сыстэмай таксама сябе не лічылі. Яны проста зрабілі ўчынак, падпарадкоўваючыся ўнутранаму руху душы, адчуўшы сябе свабоднымі людзьмі.

З таго часу мінула больш за трыццаць гадоў. Здавалася б, усё вярнулася да канонаў тых 1970-х гадоў. І палітынфармацыі вярнуліся, і школьныя лінейкі, і змаганьне начальства з «ідэалягічнай заразай». І школьнікі па-ранейшаму часам любяць пажартаваць ці пахуліганіць. А частка маладога пакаленьня, здаецца, адкрыла для сябе, што «фарсіць» можна ня толькі імпартнай вопраткай, але й перайманымі думкамі, ладам паводзінаў, стылем жыцьця. Іх таксама, як выявілася, можна прымяраць на сябе, як тую модную вопратку. Сёньня панасіў бясплатна — заўтра выкінуў. Сёньня гаворыш па-беларуску, заўтра стаў дарослым, салідным чалавекам, зрабіў кар'еру — і на мову забыўся.

### Сьвечка ў кішэні

Выявілася, што быць рэвалюцыянэрам (а гэта таксама зрабілася модным у пэўных колах моладзі, дый ня толькі моладзі) няцяжка. Дастаткова надзець джынсы ці запаліць сьвечку ў акне.

Выкажу тут сваю асабістую думку, якую нікому, зноў жа, не навязваю. Хоць і разумею, што ад абвінавачваньняў у рэтраградзтве й рэакцыйнасьці мяне гэта ўсё адно не ўратуе. Запаліць сьвечкі ў памяць аб загіблых або зьніклых — рэч выскародная. Можна сказаць, што гэта нават сьвяты абавязак для кожнага сумленнага чалавека, і дзякуй тым, хто прыдумаў гэткую форму салідарнасьці. Але абвяшчаць нармальны чалавечы ўчынак актам грамадзянскай мужнасьці, падлічваць колькасьць запаленых сьвечак у вокнах, рабіць з гэтага палітычную кампанію неяк непрыгожа. Можа быць, за мінулыя гады крытэры мужнасьці зьмяніліся? Ведаю, што журналістка Ірына Халіп магла б павучыць мужнасьці многіх маладзейшых за яе прагрэсіўных журналістаў.

Увогуле, патлумачыць, чым менавіта несымпатычныя згаданыя вышэй «акцыі салідарнасьці», мне цяжка. Паспрабуйце патлумачыць чалавеку, які хваліцца сваёй сьціпласьцю й высакароднасьцю, што ён паводзіць сябе нясьціпла й невысакародна. Ён вас не зразумее ды яшчэ ўзьненавідзіць, як асабістага ворага.

Альбо паспрабуйце баязьліўцу



Мала сказаць: «Свабода. Праўда. Справядлівасьць». Трэба адчуць гэтыя словы ня звонку, а знутры, як маральны імпэратыў. І ніякія зьнешнія сымбалі, нават самыя высокія й сьвятыя, самі па сабе нам не дапамогуць.




сказаць у твар, што ён баязьлівец.

Называць усіх, хто сёньня носіць джынсы, рэвалюцыянэрамі альбо свабоднымі людзьмі — значыць, займацца імітацыяй рэвалюцыі, прафанацыяй ідэі свабоды.

Чаму б тады не абраць, напрыклад, у якасьці прыкметы рэвалюцыйнасьці акуляры, капялюш ці проста наяўнасьць пад капелюшом галавы.

Ніхто не спрачаецца — у рэвалюцыяў павінны быць свае сымбалі. Але перш чым яны зьявяцца, патрэбныя рэвалюцыйная сытуацыя ў грамадзтве ці хоць бы рэвалюцыйныя настроі. Нічога падобнага ў Беларусі сёньня няма. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова адарвацца ад кампутара і зірнуць у акно.

Хутчэй можна гаварыць аб контрарэвалюцыйных настроях. Пакуль бальшыня людзей, у тым ліку маладых людзей, марыць аб былых савецкіх парадках і савецкім дабрабыце (гарантаваная зарплата, кватэра, «бясплатныя» адукацыя ды мэдыцына, адпачынак у прафсаюзнай «здраўніцы»), ні аб якой электаральнай рэвалюцыі не даводзіцца марыць. Бо менавіта цяперашняя ўлада гарантуе (ці хоць бы абяцае) захаваньне такога «дабрабыту».

## Расплюшчыць вочы

Іншая справа, што ні рэвалюцыя, ні яе адсутнасьць ня маюць простага дачыненьня да стану душы чалавека, ягонай асабістай свабоды. Доказам могуць служыць падзеі 1991 году. Інакш як рэвалюцыйнымі іх не назавеш. Але распад СССР і ўтварэньне незалежнай Беларусі, скажам, адбыліся насуперак волі мільёнаў савецкіх абываталяў альбо, прынамсі, бязь іхнага ўдзелу. На іх унутранай свабодзе альбо яе адсутнасьці рэвалюцыйныя падзеі ніяк не адбіліся. Выхаваныя ў рабстве, большасьць людзей засталіся рабамі. І ніякія джынсы ці іншыя аксэсуары ня могуць кампэнсаваць адсутнасьць унутранай свабоды.

Здавалася, праўда аб сталінскім ГУЛАГу і злачынствах расейскай імпэрыі раскрые вочы мільёнам, і гэтая праўда гарантуе, што тыя злачынствы ніколі не паўторацца. Вочы мільёнаў расплюшчыліся... і абыякава заплюшчыліся зноў. У іх не было патрэбы ведаць. Не было імкненьня да свабоды.

Мала сказаць: «Свабода. Праўда. Справядлівасьць». Трэба адчуць гэтыя словы ня звонку, а знутры, як маральны імпэратыў. І ніякія зьнешнія сымбалі, нават самыя высокія й сьвятыя, самі па сабе нам не дапамогуць.

У пасрэднага амэрыканскага пісьменьніка Стывэна Кінга ў адным з фантастычных раманаў ёсьць неблагі эпізод, дзе сьвятар спрабуе перамагчы д'ябла з дапамогай крыжа. Але пасьля некалькіх спробаў ён з адчаем пераконваецца, што ягоныя спробы марныя: бязь веры ў душы ўкрыжаваньне страціла хросную сілу ды ператварылася ўсяго толькі ў мёртвы кавалак дрэва, што выклікала ў праціўніка д'ябальскі сьмех.

Што ўжо казаць пра сымбалі матэрыяльнай культуры — такія, як джынсы, да прыкладу? Часам непрыемна бачыць постаць якой-небудзь раскароўленай жанчыны ў джынсах, якія шчыльна аблягаюць яе тлустыя клубы. Як кажуць у такіх выпадках у народзе, «пасуе, як карове сядло». Гэтак слова «свабода» гучыць непраўдзіва, нават непрыстойна ў вуснах некаторых дэмакратычных кандыдатаў на прэзыдэнта.

Ізноў пагаджуся: джынсы — не найгоршы варыянт. Трэба ж нечым і сорам прыкрыць, і адсутнасьць амуніцыі разам з амбіцыямі. Але толькі ня трэба спэкуляваць. Ні вопраткай, ні паняцьцямі. Хай спачатку высьпее й народзіцца рэвалюцыя. А ўжо як яе назваць — вырашым як-небудзь потым.

# Не шкадуй жывата свайго

і будзеш мець прэс з «кубікамі» замест «піўнога мазаля». Як — раскажа беларускі хлопец, што здолеў зрабіцца амэрыканскай супэрмадэльлю.



«Мышцы жывата — бадай, самая моцная частка майго цела і самая заўважная».

**Антон Анціпаў**

**нарадзіўся 6 траўня 1983 у Бабруйску. Калі да ўлады прыйшоў Аляксандар Лукашэнка, ягоная сям'я падалася ў пошуках лепшай долі за акіян і асела ў Нью-Ёрку. Антону тады было 13 год. Ён скончыў школу ды паступіў у каледж. У часе вучобы пачаў падпрацоўваць у краме моднай вопраткі *Armani Exchange*. Хлопца з адкрытым беларускім тварам і яскрава акрэсьленай мускулатурай прыгледзелі, і неўзабаве ён атрымаў некалькі прапановаў ад мадэльных агенцыяў. У выніку ён падпісаў кантракт з *BOSS models*. Пачалася праца на подыюме і фатаздымкі для рэклямнай кампаніі італьянскай ювэлірнай фірмы *Pomellato*. Акрамя гэтага Антон пасьпеў зьняцца для глянцавітага альбому фотамастака Кэл І (Kal Yee), які спэцыялізуецца на фатаграфаваньні мужчынаў у стылі «ню». Фота і парады Антона зьмяшчаюцца таксама на амэрыканскіх інтэрнэт-сайтах *Allamericanguys* і *Sixpacknow*.**

Той, хто ходзіць за сахой, мала задумваецца пра стан сваіх цягліцаў. Але ці шмат хто з нас сапраўды штодня займацца фізычнай працай? Калі вы, як той Ясь, у апошні раз касілі канюшыну? А за кампутарам па колькі гадзінаў у дзень седзіцё? Пакаленьне мэнэджэраў мае пальцы без мазалёў, але расплочваецца за гэта крывымі сьпінамі ды адкладаньнямі тлушчу. На думку амэрыканскай супэрмадэлі беларускага паходжаньня Антона Анціпава, змагацца з гэтай трасцай можна, нават калі няма грошай ці часу хадзіць у трэнажорную залю. Вось парады, якімі Антон падзяліўся з інтэрнэт-часопісам *Sixpac-know*.

## Без фанатызму

«Мышцы жывата — бадай, самая моцная частка майго цела і самая заўважная, — распавядае Антон. — Я трэнірую іх 2—3 дні на тыдзень. Вельмі важна неператамляць цягліцы, бо, як вядома, яны пачынаюць расьці не падчас заняткаў, а ў перапынках паміж імі. Цягліцам таксама трэба адпачываць.

Для таго, каб умацаваць цягліцы жывата, я раблю звычайныя пад'ёмы корпусу, седзячы на падлозе. Аднак сакрэт у тым, што я раблю іх павольна — адзін пад'ём з падлогі павінен займаць 2 сэкунды, пасьля трэба 2—3 сэкунды ўтрымліваць верхнюю частку цела вэртыкальна, а потым так сама павольна (2 сэкунды) апусьціць яго на падлогу. Я раблю тры заходы па 12—14 пад'ёмаў, але калі вы пачатковец, то рабеце ня больш 8—10 пад'ёмаў за адзін раз. Адпачывайце 45—60 сэкундаў паміж заходамі. Гэтае практыкаваньне ўмацоўвае верхнія мышцы жывата.

Для ніжніх мышцаў я раблю на турніку пад'ёмы сагнутых у каленях ног як мага вышэй да грудзёў. Таксама павольна. Галоўнае тут — ня колькасьць, а якасьць».

## Аўсянка, салаты, стадыён і басэйн

«Для таго, каб пазбавіцца тлушчу на жываце ды баках, варта трымацца здаровай дыеты. Забудзьцеся пра паўфабрыкаты — гатуйце ўсё самі. Намагайцеся спажываць ежу, якая ўтрымлівае пратэін. Я ем аўсянку, шмат разнастайных малочных прадуктаў, салаты, яйкі, бульбу, зь мяса — кураня, індыка, ялавічыну, рыбу. Няблага таксама 2—3 разы на тыдзень рабіць прабежкі, яшчэ лепш — плаваць у басэйне. Гэта выдатна трэніруе ўсе мышцы цела. Спадзяюся, мае парады дапамогуць вам трымаць форму. Посьпехаў!»




Чарговы падпольны канцэрт у адным зь менскіх клюбаў. Іграе гурт «Срэбнае вясельле». Такія мерапрыемствы варта наведваць, калі хочаш пакаштаваць сапраўднага андэграўнду. Памяшканьне — былая банкетная заля з банкетнаю ж апаратураю. Ніякіх шыльдаў. Сьвятла амаль няма. Заля поўная тынэйджараў. Тыя, хто спазьніўся на тэатралізаваную частку (вакалістка гурту паказвала лялечны спэктакль), ня здолеў уціснуцца ў дзьверы. Кожная песьня ідзе на «ўра», энэргетыка шыбае цераз край.

# З дому з ласосем на шыльдзе

Напачатку крамбамбуля была джынам. Прыйшла яна да нас з захаду, адкрыў гісторык матэрыяльнай культуры **Алесь Белы**.

Гісторыя гэтага напою пачынаецца ў канцы XVI стагодзьдзя. Галяндзкі мэнаніт Амброзі Вэрмёлен, ратуючыся ад рэлігійнага перасьледу, прыехаў у Гданьск. На новым месцы ён заснаваў бровар. Ягоная вера яму гэта не забараняла. Справы ў прадпрыемства ўвесь час ішлі ўгару, і ў 1704 годзе гарэльня перабралася на самую прэстыжную вуліцу гораду — Breitgasse (Шырокую), у дом з ласосем на шыльдзе.

Прадпрыемства праіснавала да 1922 г., калі эканамічны крызіс і цяжкасьць камунікацыі з асноўнымі рынкамі збыту прымусілі перакінуць яго ў Бэрлін. Прадпрыемства існуе і дагэтуль (пад назвай «Hardenberg-Wilthen». Разбураны ў другую сусьветную дом «Пад Ласосем» аднавілі, і цяпер тут рэстарацыя «Пад Ласосем» (ul. Szeroka, 52—54).

Два прадукты гданьскага бровару ў XVII стагодзьдзі атрымалі вядомасьць як у Рэчы Паспалітай, так і Нямеччыне. Адной зь іх была гданьская гарэлка («гданьская водка», «гальдвасэр»), традыцыйная настойка на зёлках і карэньнях. Прывабнасьць ёй надавалі некалькі лісткоў тонкай залатой фольгі, што плавалі ў кожнай фляшцы. Гданьскай гарэлцы прыпісваліся ледзь не цудатворныя ўласьцівасьці. Шматвекавая слава забясьпечыла ёй месца ў паэме А.Міцкевіча «Пан Тадэвуш».

Судзьдзя шкатулку ў гонар той аблавы
Дастаў, адкрыў, і пляшак бліснулі галовы.
Ён выняў самы большы буталь адмысловы
(Багаты падарунак ад ксяндза Рабака).
Гарэлка з Гданьску, дарагая для паляка.
«Няхай жыве! —
сказаў Судзьдзя з паднятай чашай. —
Наш горад Гданьск,
зноў быць яму ва ўладзе нашай!»
І па чарзе ўсім наліваў лікёр срабрысты.
Пакуль дно залатым не заблішчала лістам.

Менш вядомы спачатку быў ядлаўцовы лікёр *Krambambuli*. Слова паходзіць ад слоў Krandewitt (дыял. «ядловец») і Blamp (жарг. «алькагольны напой», «пойла»). Пачаткова крамбамбуля была ядлаўцовай гарэлкай — джынам! Але паступова мода на крамбамбулю парадзіла мноства імітацый, якія ў Нямеччыне круціліся вакол інтэнсіўнага чырвонага колеру арыгінальнага прадукту (праўда, яго крыніцай часьцей былі вішні).

У нас ня дбалі і пра колер, і крамбамбуля зрабілася пераважна жоўтай. Дробны шляхціц, які хацеў жыць, як магнат, імкнуўся вырабляць усё «як у людзей» у хатняй гаспадарцы, ня трацячы ані шэлегу грошай. Так арыгінальны джын далёка ад Гданьску саступіў месца саматужным кактэйлям ды пуншам. І для сучаснай масавай сьвядомасьці ў нямецкамоўных краінах і далей на Захадзе «крамбамбулі» — гэта самаробны пунш або глінтвайн.

Сапраўдную папулярнасьць *Krambambuli* набыў ня ў Рэчы Паспалітай, дзе ў яго былі моцныя спаборнікі — мёд ды крупнік, а ў Нямеччыне. У нямецкім студэнцкім жаргоне XVII—XIX ст. слова *Krambambuli* ўжывалася для азначэньня алькагольнага кактэйлю, а пазьней як сынонім любога алькаголю. На пачатку XVIII ст. зьявілася студэнцкая песьня «Krambambuli», што праслаўляла адвечныя каштоўнасьці бесклапотнага студэнцкага жыцьця і ў некаторых варыянтах налічвала больш за 100 куплетаў, кожны зь якіх канчаўся клічам «Krambimbambambuli, Krambambuli»! «Кананічны» варыянт быў напісаны ў 1745 г. паэтам Крыштафам Вэдэкіндам. Азнаёміцца з тэкстам у расейскай мове можна тут: www. livejournal.com/users/audiart/98866.html.

Пазьней зьявілася песьня «Der Krambambulist». Музыка спадарожнічае крамбамбулі ўсю яе гісторыю. У нямецкамоўных краінах ёсьць прынамсі два гурты, якія называюцца «Крамбамбуля»: Нямецкая «Крамбамбуля» грае настальгічныя танга ды сўінг. Швайцарская — аддае перавагу Моцарту ды Шуману.

Чарговае пераасэнсаваньне слова масавай сьвядомасьцю зьвязанае з апавяданьнем аўстрыйскай пісьменьніцы XIX ст. Марыі фон Эбнэр-Эшэнбах. Яе галоўны герой — сабака, якога завуць Krambambuli. Станоўчаму пэрсанажу, егеру Хопу, таямнічы абадранец Руды дорыць яе ў кнайпе за выпіўку, і празь нейкі час яны сутыкаюцца ізноў, па розныя бакі Закону: Руды выяўляецца правадыром рабаўнікоў акругі, забойцам лесьніка, а сабаку даводзіцца рабіць пакутлівы выбар паміж старым і новым гаспадарамі.

Апавяданьне тройчы экранізавалася: у 1940 Карлам Кёстлінам, у 1955 пад назвай «Радзіма» Францам Антэлем (у абодвух фільмах ролю егера Хопа граў Рудольф Прак). Апошняя экранізацыя адбылася ў 1998 г. (рэж. Ксаўер Шварцэнбэргер).

Легендарны напой часоў ВКЛ вярнулі ў Беларусь дзякуючы зьбегу акалічнасьцяў і непаразуменьняў, што ня ставіць пад сумненьне яго легітымнасьць. І калі музычны праект «Крамбамбуля» будзе разьвівацца, яго аўтарам варта зьвярнуць увагу на нямецкую культурную гісторыю крамбамбулі, перадусім на традыцыйную студэнцкую песьню.

**Крамбамбуля клясычная**
шляхецкая саматужная (з кнігі Ганны Шымандэрскай «На польскім стале», 2005):

**20 г цынамону, 15 г чорнага перцу (зерне), па 10 г кардамону і гвазьдзікоў, 4 г мускатнага арэху, 3 шклянкі сьпірту, 2 шклянкі гарэлкі, 1 шклянка кіпеню, 1 кг мёду.**

**Патоўчаныя прыправы складаюць у слоік, залiваюць гарэлкай і сьпіртам. Закаркоўваюць і пакідаюць у цяпле на 8—10 дзён, штодзень моцна трасучы слоік. Мёд разводзяць у кіпені, вараць, здымаюць шум. Здымаюць з агню і асьцярожна даліваюць зьмесьціва слоіка, увесь час памешваючы. Хутка ахалоджваюць у рондалі з халоднай вадой. Фільтруюць, разьліваюць па бутэльках, закаркоўваюць і пакідаюць у цёмным халодным месцы на 4—6 месяцаў.**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# А хто іх пільнаваў, тых рэцэптаў!

Гаспадар кавярні «Грунвальд» Аляксандар Астрашэўскі вынайшаў сваю крамбамбулю спосабам «навуковага тыку».

У цэнтры Менску можна пакаштаваць крамбамбулю, вараную не прамысловым, а саматужніцкім спосабам. У кавярні «Грунвальд» (вул. Маркса, 19) 50 г напою каштуе каля 4 тыс. рублёў. Пабывала «грунвальдзкая» крамбамбуля нават на аднайменным полі падчас штогадовага фэсту. Рыцарскі інтэрнацыянал ацаніў.

У кавярні крамбамбулю вараць другі год. «Людзі хваляць, — кажа дырэктар «Грунвальду» Аляксандар Астрашэўскі. — Гэты напой жаночы. Мужчыны кажуць, што дужа складаны смак — сьпярша мяккі, пяшчотны, салодкі. Потым — спэцыі. Затым востры рэшткавы смак, але імгненны — каб не хацелася запіваць, як гарэлку... Дзяўчатам падабаецца!»

Рэцэпт крамбамбулі, апублікаваны Эдвардам Зайкоўскім і Галінай Тычкай, зь якога пачалася гісторыя музычнага праекту, Астрашэўскі крытыкуе: «Калі пакладзеш столькі гвазьдзікоў, як напісана, атрымаеш парфуму «Чырвоная Масква». Сваю крамбамбулю ў «Грунвальдзе» вынайшлі спосабам «навуковага тыку». «А хто іх пільнаваў, тых рэцэптаў, па шляхецкіх дварах! Варылі, як хто ўмеў, — кажа сп.Аляксандар. — Са спэцыямі можна экспэрымэнтаваць, як хто сам любіць: некаму падабаецца лаўровы ліст — на здароўе, нехта больш цынамону ці перцу дадасьць — таксама не забараняецца...» Адзінае: суайчыньнікі могуць пабаяцца «сапсаваць» варкай гарэлка. Але й на гэта ёсьць «паратунак», усьміхаецца дырэктар «Грунвальду»: «Трэба ўсё аддаць у жаночыя рукі».

Крамбамбуля кожнае варкі розьніцца ад іншае. Як лак у старых скрыпічных майстроў. У нейкую трапляе больш адных спэцыяў, у нейкую — іншых. Залежыць ад мёду. Грэцкі смак больш гаркавы, ліпавы — салодкі.

Спэцыфічны напой патрабуе спэцыфічнага заедку. У рэстарацыі Астрашэўскага на Пціčы такім заедкам сталі піражкі зь мясам (ялавічына, сьвініна, нават пячонка). У **«Грунвальдзе» (на фота)** падаюць грэнкі з шмальцам. Намазваеш прасмажаную хрусткую чорную грэнку сумесьсю, у якой на смак угадваеш скваркі, цыбулю, яблыкі, — і не разумееш грэцкіх багоў: навошта нэктар і амброзія, калі ёсьць такая смаката?! І губляесься ў выбары: ці то зрабіць яшчэ глыток крамбамбулі, ці то зьесьці яшчэ грэнку.

**Адам Воршыч**

**Рэцэпт крамбамбулі паводле Астрашэўскага:**

Узяць паўлітра гарэлкі, адліць 100 г, зьмяшаць з такою ж колькасьцю вады. Разбоўтаць усё зь мёдам (1—2 сталовыя лыжкі). Мускатнага арэху дадаць зусім крыху. Цынамону — ня больш за 1 чайную лыжку (лепей — менш). Гвазьдзікоў — зусім крыху і ні ў якім разе не таўчы: гвазьдзік — рэч вельмі пахкая. Чырвоных перцаў дастаткова 1—2 — толькі каб на гэтым настойвалася крамбамбуля. Усё гэта кіпяціць 10 хвілінаў. Потым асьцярожна даліць астатнюю гарэлку і пакінуць у пасудзіне на 5 хвілінаў. Працадзіць праз 4 слаі марлі ў бутэльку, дадаць каліва чорнага перцу.

# Šancavańnie Kastusia Charaševiča

U nieprycharošanaści partretu času j aŭtapartretu haloŭnaja vartaść uspaminaŭ Kastusia Charaševiča, piša **Anatol Sidarevič**.

Nie šukajcie ŭ hetaj knižcy, što vyjšła ŭ biblijatečcy časopisu «Kuferak Vilenščyny», stylovych vabnotaŭ. Jaje napisaŭ čałaviek, nie spraktykavany ŭ litaraturnaj spravie. Moža, navat treba paŭščuvać tych, chto vypuskaŭ knižku, što niaŭvažliva jaje vyčytali.

U mianie ŭžo naźbirvajecca biblijatečka ŭspaminaŭ ludziej, nie datyčnych da «vialikaje palityki». Heta i hieolah Viačasłaŭ Šydłoŭski, i vučanica Słonimskaje biełaruskaje prahimnazii Nadzieja Dziemidovič, i nastaŭnik Uładzimier Korzun, i pinskaja žycharka Nina Łuščyk… Voś i kniha Charaševiča dałučajecca da jich.

Niekali ŭ savieckaj krytycy pisali pra «vialikuju praŭdu». Jana naležała partyji Lenina—Stalina, jaje Centralnamu Kamitetu. Svaju «maleńkuju praŭdu» kožnamu aŭtaru naležała dapasavać da «vialikaje praŭdy». A ŭsio, što nia ŭpisvałasia ŭ cekoŭskija schiemy («akopnaja praŭda» Bykava), było skažeńniem historyčnaje praŭdy, paklopam na savieckuju rečajisnaść.

Udakładniu: z cekoŭskaha hledzišča «maleńkaja praŭda» nie abaviazkova naležała «maleńkamu čałavieku», «prostym savieckim ludziam». Maleńkaju praŭdu nazyvali tady, kali čałaviek apaviadaŭ pra svajo, asabistaje, pryvatnaje — toje, što nazyvajuć historyjaj štodzionnaści. Nu jak, kazali aŭtaru, možna pisać pra takoje, kali SSSR atrymaŭ suśvietna-historyčnuju pieramohu, kali jon siamimilnymi krokami idzie da kamunizmu?..

Kastuś Charaševič — taksama nie «maleńki čałaviek»: jon mastak. I ŭ mastackuju historyju Maładečna užo ŭpisany raździeł, źviazany ź jaho jimiem, z imionami Jadvihi Raździałoŭskaj, Jurasia Hierasimienki-Žyźnieŭskaha, Leanida Dudarenki dy jinšych tvorcaŭ. Kali ž zhadać, što mastaki pracavali pobač z historykami Mikołam Jermałovičam i Hienadziem Kachanoŭskim, dyk Maładečna, u adroźnieńnie ad jinšych haradoŭ-statysiačnikaŭ, maje kim pachvalicca. (Tut dadam: Maładečna — adzin z redkich haradoŭ, u jakim pracavali i bolš-mienš admietnyja načalniki: pieršy sakratar abkamu Siarhiej Prytycki dy sapraŭdnyja — bo abranyja — mer i vice-mer Hienadź Karpienka i Viktar Hančar.) Ale nia heta




**Кастусь Харашэвіч. Зьведанае і перажытае.** — Маладэчна: Куфэрак Віленшчыны, 2004.

Маладэчна — адзін з рэдкіх гарадоў, дзе працавалі і больш-менш адметныя начальнікі: Сяргей Прытыцкі, Генадзь Карпенка, Віктар Ганчар.



**Мой Кастусь Каліноўскі. 2000 г., кардон, алей.**

hałoŭnaje ŭ knizie K.Charahaševiča — štodzionnaść, dośvied pryvatnaha čałavieka.

«Heta było ŭ 1936—1937 hadach. Pracavać davodziłasia mnoha, ale źjaviłasia peŭnaja perspektyva». Aŭtaraŭ baćka, pravasłaŭny, sialanski syn, niahledziačy na pieraškody, što čynilisia polskimi ŭładami, mieŭ na toj čas svajŭ kramu, kupiŭ 2,7 ha ziamli, paŭhektara sienažaci i spadziavaŭsia na lepšaje. «Vialikaja palityka» ŭryvajecca ŭ hetuju štodzionnaść zabojstvam łazutčyka, jaki pryjšou z uschodu, hazetaju «Звязда», pa jakoj 10-hadovy Kastuś vučycca čytać pa-biełarusku, źbićciom kurjera, jaki hetyja hazety prynosiŭ, vialikimi maneŭrami Vojska Polskaha… Niahledziačy na hetyja maneŭry, pačatak Druhoj suśvietnaj, pryznajecca aŭtar, «byŭ niečakanaściu dla ŭsich nas». Niečakanaściu byŭ i prychod Čyrvonaj Armiji. Žančyny płakali, «bratočkami, synočkami zvali i abdymali sałdata i kamandzira». I pačuli: «Плакали вы одни, сейчас поплачем вместе». Pa-śviatočnamu apranutaha 19-hadovaha dziadźku Janku aryštavali, bo pryniali jaho za panskaha synka… Karystajučysia mahčymaściu (1 rubel za 1 złoty), čyrvonaarmiejcy raskupili ŭsiu baćkavu kramku. I Kastusioŭ baćka pačuu: «…вы уже не наполните свои полки новым товаром». Heta aznačała nia tolki zabaronu pryvatnaha handlu. U Zachodniaj Biełarusi taksama pačynaŭsia čas deficytu — chraničnaje chvaroby savieckaje ekanomiki. I pačaŭsia čas chapunu (zabrali dziadźkavu siamju: baćkoŭ i trajich dziaciej). I čas rabavańnia (u susiednim majontku ačyścili brovar i sažałku ź lustranymi karpami). Čas spojvańnia narodu (u sielpoŭskich kramach «źjaviłasia čyrvonaje tannaje vino, jakoha my pry Polščy nia bačyli»), čas masavaha paleńnia (źjaviłasia i tannaja machorka, jakoje nie było za Polščaj), čas chamstva («rezaŭ słych i rasiejski «trochpaviarchovy» mat»)… Ale ŭsio heta i navat represiji «nie paŭpłyvali na ahulny pazytyŭny nastroj»: balšaviki adkryli sacyjalnuju perspektyvu — mahčymaść atrymać adukacyju.

Z takich «miascovych» nazirańniaŭ i składajecca



**Кастусь Харашэвіч.**

Шмат хто ў Беларусі і Літве чакаў, як збавеньня, вайны паміж Захадам і СССР ды прыходу амэрыканцаў.

knižka ŭspaminaŭ. I taki fakt: pry nacystach, jakija pryjšli na miesca balšavikoŭ, «padatki i roznyja pabory byli na pieršy čas nia bolšyja, čymś pry Savietach». I takaja vysnova: u čas niamieckaj akupacyji polnaj miascovaści narod paciarpieŭ mienš, čym u lesavoj. Tak było na Maładečanščynie. Toje ž ja čuŭ na Słuččynie. Treba dumać, hetak było i ŭ jinšych rehijonach Biełarusi.

K.Charaševiču pašancavała. U jaho byli dobryja pedahohi. Mahčyma, nastaŭnik Hieorhi Viaršycki byŭ «vinavaty» za nastupnyja prykraści, što napatkali aŭtara pa vajnie. Heta jon narajiŭ svajmu vučniu praciahvać vučobu ŭ Maładečanskaj handlovaj škole, jakuju adčyniŭ Barys Kit. Ale nia kožnaha vučać takija nastaŭniki, jak doktar Kit. Aŭtaru pašancavała i tamu, što jon, faktyčny siabar SBM, nia skłaŭ prysiahi dy nia stau siabram arhanizacyji jurydyčna. Kali b skłaŭ, jamu pahražała b źniavoleńnie, darma što niepaŭnaletni. Dyj ź niepaŭnalećciem taksama pašancavała: nia trapiŭ u 1944 h. u Čyrvonuju Armiju, nia kinuli jaho, jak sotni tysiač nieabvučanych biełarusaŭ, u samaje piekła.

Vučoba ŭ handlovaj škole i siabroŭstva ŭ SBM dalisia K.Charaševiču ŭ znaki: adličyli z BDU, staŭ «klijentam» NKVD… Nie dapamahli i piarebary ŭ Vilniu: vyklučyli z Mastackaha instytutu — i tam dastali «orhany».

Pieraśledavany ŭładaju, aŭtar, jak ni paradaksalna, byŭ u peŭnaj miery apalityčnym čałaviekam. Jon, napryкład, ździviŭsia, čamu śmierć Stalina, śmierć, jakaja, jak vyśvietlicca, pryniasie jamu palohku, mahčymaść atrymać adukacyju, «tak uzbudaražyła hramadztva». Jon viedaŭ siaho-taho ź lasnych bratoŭ i śviedčyć pra jich, čuŭ pra patryjatyčnaje padpolle, viedaŭ, što šmat chto ŭ Zachodniaj Biełarusi i Litvie (u tym liku rodnaja žonka) čakaŭ, jak zbavieńnia, vajny pamiž Zachadam i SSSR dy prychodu amerykancaŭ, ale ŭsim hetym dy jinšym nia nadta pierajmaŭsia. I ŭ hetaj nieprycharošanaści aŭtapartretu ci nie haloŭnaja vartaść uspaminaŭ Kastusia Charaševiča. Tym bolš vierycca jahonym śviedčańniam pra čutaje i bačanaje.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Скарулис Арсений, Элла Скарулис. Швейцарский дневник.** – Менск: Логвінаў, 2005. – 152 с.

Расейскамоўная кніжка з жанру прыватна-сямейнай мэмуарыстыкі не пакіне абыякавымі ўсіх, хто ведаў і памятае Арсеня Скарулiса — адваката, які ўдзельнічаў ва ўсіх палітычных працэсах вясны 1996-га, пасьля эміграваў у Швайцарыю, дзе трагічна загінуў у сакавіку мінулага году, спрабуючы замацаваць бел-чырвона-белы сьцяг у швайцарскіх Альпах. Яна будзе цікавая і ўсім, хто пакутліва вырашае для сябе пытаньне «эміграваць ці не» — хаця, старанна занатоўваючы дзень у дзень свае ўражаньні ад перабываньняў у месцах часовых прытулкаў «азілянтаў», муж і жонка Скарулісы не імкнуцца знайсьці на яго адказ для кагосьці яшчэ, апроч самих сябе.

Урэшце, гэта кніжка пра горка-салодкае каханьне да сьмерці і пасьля яе, якое зьдзяйсьняецца штодня на тле суворай рэчаіснасьці побыту ўцекачоў з розных краінаў, што сустракаюцца ў «залатой» краіне. Даведкі пра распаўсюд па тэл. 251-99-64.

**Ціна Клыкоўская**




**Мудроў В. Пераўтвораныя ў попел.** — Менск: Логвінаў, 2006.

У выдавецтве «Логвінаў» выйшаў зборнік Вінцэся Мудрова «Пераўтвораныя ў попел». Кнігу склалі 19 твораў — сярод якіх «Пераўтвораныя ў попел», «Валеры Абадзінскі», «Конская сіла», «Каханьне Леві Штраўса». Наклад кнігі 700 асобнікаў. Зборнік будзе добрым падарункам як беларускай моладзі, так і тым, хто ў 1970-я слухаў музыку Абадзінскага, насіў джынсы і любіў гумовую жуйку.

**Аляксей Шалахоўскі**

# Паэты не паміраюць

Памяці Навума Кісьліка. Піша **Валянцін Тарас**.

Ён нарадзіўся 26 верасьня 1925 г. у Маскве, а як скончыў дзьве клясы, сям'я пераехала, дакладней, вярнулася ў Віцебск, родны горад Навумавых бацькоў. Расейскай школы ў тым раёне гораду, дзе пасяліліся Кісьлікі, не было (сёньня нават ня верыцца, што такое магло быць), і Навума запісалі ў беларускую.

Ён часта згадваў, як упершыню прыйшоў у тую школу, як уразіла, агаломшыла яго беларуская мова — мноства слоў тыя ж, што і ў расейскай, а гучаць зусім інакш, *дзэкаюць*, *гакаюць*, *аукаюць* (так ён успрыняў «у нескладовае»), некаторыя словы азначаюць зусім ня тое, што ў расейскай мове. Безьліч цалкам незразумелыя. А калі на адным зь першых урокаў настаўнік пачаў уголас чытаць дзецям нейкі клясычны мастацкі тэкст, учарашні маленькі масквіч ніводнага слова не зразумеў, спалохаўся і заплакаў: як жа ён будзе вучыцца? (Гэты эпізод зь дзяцінства Навум прыводзіў кожнага разу, калі пры ім хто-небудзь пачынаў даводзіць, што ніякай беларускай мовы не існуе, што яна — паўночна-заходні дыялект расейскай. Довады, якія мы штодня чуем і сёньня: «Одна история, один язык, одна нация». Навум іранічна прыжмурваўся на гэткае: «Чушь, голубчик!»)

Беларуская мова засталася ў ягоным багажы назаўсёды, але сталася так, што роднай мовай ягонай зрабілася расейская. Тут шмат чыньнікаў, у прыватнасьці, акалічнасьці часу: вайна разлучыла Навума зь Беларусьсю на пяць гадоў, закінула ў эвакуацыю ўглыб Расеі, і сталеў ён у расейскамоўнай стыхіі. І, натуральна, вершы пачаў пісаць па-расейску. На фронце. Ваяваў ён радавым пехацінцам, быў першым нумарам кулямётнага разьліку, летам 1943 г., у бітве на Арлоўска-Курскай дузе, быў цяжка паранены — разрыўная куля трапіла яму ў лоб. Адзнакай таго раненьня засталася на лбе глыбокая ўвагнутасьць і амаль сьляпое левае вока. Але менавіта вайна назаўсёды абвастрыла яго ўнутраны зрок, памяць аб вайне прадыктавала яму ўсе ягоныя кнігі вершаў — «Размова зь сябрамі», «Пошук», «Пазыўныя зямлі», «Аповесьць аб прасаваным пораху», «Верасьнёўская рака», «Успаміны пра вакзалы», «Галіны», «Зімовае сьвятло», «Першасьнежжа», «Сьвята сьнегападу», «Лесьвіца гадоў», «Памяці патэфона» (апошняя прыжыцьцёвая кніга). Хоць, вядома, не адна вайна жыве ў гэтых кнігах, ёсьць у Навума і лірыка каханьня, і філязофскія вершы — роздум на «вечныя тэмы». Ды ўсё ж асноўны матыў ягонай паэзіі — вайна, дакладней чалавек на вайне, і матыў гэты, трактоўка ваеннай тэмы ў паэта тыя ж, што ў прозе Васіля Быкава. Як і Васіль, Навум быў верны «акопнай праўдзе», не сказаў ніводнага слова маны, ніколі не станавіўся на катурны псэўдапатрыятычнага одапісальніцтва. Арганічна не выносіў афіцыйнага савецкага мажору ваеннага параду. Вось — у скароце — Навумаў верш «Загад 227» (маецца на ўвазе загад Сталіна аб стварэньні «загараджальных атрадаў», каб спыніць адступленьне Чырвонай Арміі):

Срез времени кровоточаще свеж,
вскрытый слой за слоем до денечка…
Этот вечный дательный падеж —
скудной пайки нудная дележка.
……………………………….
В мать и в душу, в бога и отца! —
ускользает доля, что обмылок.
Нету нормы только для свинца:
в лоб — чужого,
своего — в затылок.

Тот, что в лоб, и тот, что за спиной,
скрестятся на цели обоюдной,
растечется жижей кровяной
Судный День твой на земле бессудной.
……………………………………….
Ибо нету нормы для свинца,
нету на земле и нет на небе.
Поспрошать бы «друга и отца»,
чем мы заслужили этот жребий?

И пускай навечно грязь земли
Вбила в глотки гробовая зона,
допытаться б:
— Это разве мы
опозорили свои знамёна?!

Працягам уласнай творчасьці, арганічнай яе часткай ёсьць Навумавы пераклады на расейскую мову беларускай паэзіі і прозы. Ён падарыў расейскаму чытачу цэлы том вершаў і паэмаў Янкі Купалы, і гэта самы *натуральны* Купала «па-расейску», якога я ведаю. Гэтак жа натуральна, свабодна, так, што не заўважаеш, не адчуваеш, што гэта пераклад, гучаць у Навума вершы іншых беларускіх паэтаў. Найчасьцей перакладаў ён Рыгора Барадуліна, амаль усё, што выходзіла з-пад пяра Рыгора, быў зьвязаны з Барадуліным глыбокай дружбай. Як і з Валодзем Караткевічам. Натхнёна, бліскуча пераклаў Валодзеў раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» — сам Валодзя казаў, што бліскуча. А яшчэ Навум выдатна пераклаў «Дануту» Аляксея Карпюка. І найлепшы пераклад рамана Івана Мележа «Людзі на балоце» таксама зрабіў Навум.

…Амаль усё сваё пасьляваеннае жыцьцё ён пражыў у Менску, з 1952 г. — на вуліцы Фрунзэ, на першым паверсе дому №3. Гэта за якую паўсотню мэтраў ад Дому літаратара, і кожны з Навумавых сяброў ці добрых знаёмых, ідучы ў Дом літаратара альбо адтуль, стукаў Навуму ў шыбу, каб той выглянуў у фортку перамовіцца словам. Але звычайна ён махаў ру-



кою: «Зайди на минутку!» Ты заходзіў, і «минутка» ператваралася ў гадзіну, а то і ў дзьве. Адчыняла дзьверы Навумава маці, Ганна Навумаўна. І першым нязьменным ейным пытаньнем было: «Вы галодныя? У мяне сёньня цудоўны абед!»

Можна толькі зьдзіўляцца, як гэта Ганна Навумаўна, колькі б людзей ні ўвалілася ў хату, умудралася накарміць усіх. Навумаў дом, ягоны сьціплы рабочы пакой — кушэтка, пісьмовы стол і велізарны стэляж з добрай тысячай кніг — немалая частка жыцьця Навумавых сяброў, незабыўная наша выспачка свабоды ў колішнім несвабодным сьвеце, выспачка, дзе ўсе мы былі як родныя браты, дзе можна было выказвацца як на споведзі, ведаючы, што няма сярод нас ні стукачоў, ні крывадушных зласьліўцаў. Ды акрамя блізкіх сяброў Навума хто толькі ні пабываў у тым пакоі, хто толькі ні сядзеў за гасьцінным, шчодрым сталом Ганны Навумаўны! Калі б на тым доме па вуліцы Фрунзэ, 3 устанавіць памятныя шыльды з імёнамі знакамітых людзей, якія гасьцявалі ў Навума, то шыльды гэтыя занялі б ці ня ўвесь фасад. Але няма нават і адной — у памяць Навума Зіноўевіча Кісьліка. А на вокнах ягонай кватэры — жалезныя краты, іх паставілі людзі, якія цяпер там жывуць. Калі-нікалі спыняюся перад тымі вокнамі і чую, як там, у Навумавым пакоі, гучаць знаёмыя галасы: звонкі, задзірысты голас Алеся Адамовіча, стрыманы голас Васіля Быкава, усхваляваны голас Рыгора Бярозкіна; чую, як рагоча на ўсю кватэру Валодзя Караткевіч, як напорыста, дзёрзка чытае свае вершы Ігар Шклярэўскі, як бубніць свае Грыша Барадулін. Чую Федзю Яфімава, Ваню Бурсава, Алега Сурскага, Сямёна Букчына, Сашу Дракахруста, густы бас мастака Барыса Заборава… Чую галасы Янкі Брыля, Івана Мележа, Аркадзя Куляшова, Заіра Азгура, Канстанціна Ваншэнкіна, чую, як сьпявае на застольлі Навумавага дня нараджэньня Аляксандар Галіч… Гамана часу, які адшумеў, адышоў, заціх у тым Навумавым пакойчыку. І ўсе мы колішнія, і жывыя, і мёртвыя, засталіся на гэтай выспачцы свабоды, як у вязьніцы, у палоне былога.

Навум пайшоў з жыцьця 27 сьнежня 1998 г. Боль і горыч страты не праходзяць. Зрэшты, страты — таксама наша душэўнае багацьце. Аб гэтым сказаў сам Навум, думаючы пра вышэйшае прадвызначэньне чалавека. Таму што хто ён, чалавек?

Приговоренный к наивысшей мере —
жить на земле и обретать потери —
свой краткий срок отпраздную,
пока
не прогремит отмена приговора
и, наломав положенного вздора,
не поддадут последнего пинка,
а вслед —
не то «лети!», не то «катись!»…
Ну что ж, покатимся, прокатимся и канем.
А то, что на душе лежало камнем,
внезапной птицей устремилось ввысь.

«Набываць страты» — гэта, здавалася б, гучыць дзіўна. Але ў паэзіі ўсё дзіўна! Як у самім жыцьці, вынік якога — выпіты да дна келіх пакутаў з маленькім каліўцам шчасьця. Пакутаў, выпрабаваньняў і спакус, церазь якія душа пераскоквае, як цераз вогнішча ў Купальскую ноч, каб ачысьціцца, каб агонь спаліў усё часовае, прыземленае да карыта. Каб *прасьвятлець*. Такім прасьветленым чалавекам быў паэт Навум Кісьлік. Таму і застаўся з намі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Вадохрышча 2006 году было самым халодным за сто гадоў.**



# Знакі прыпынку

**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

* * *

Мы з братам спазьніліся… У бальнічнай палаце стаялі шэсьць жалезных ложкаў, і на пяці ложках ляжалі хворыя жанчыны, а шосты быў пусты, зусім пусты, зь яго нават матрац зьнялі, праз драцяную сетку віднелася пафарбаваная драўляная падлога, пад ложкам нявытаптаная, таму нібыта гусьцей пафарбаваная, чым пасярод палаты, дзе мы застылі, дапытліва пазіраючы на хворых старых жанчын, у якіх не было пра што пытацца, бо ўсё відавочна. Але я ўсё ж спытаўся: «А дзе Настасься Іванаўна?..» І пяцёра хворых старых жанчын неяк пасьпешліва, адна перад адной, я ніколі не забуду гэты хворы, старэчы хор, на розныя галасы прапелі, прамармыталі: «Памерла… памерла… памерла… памерла… памерла…»

Маці ляжала ў трупярні адна — зусім голая на высокай, мне па пояс, кушэтцы. Зрадзела-пасівелыя валасы, абветраны, сьнегам шэрпаны і сонцам палены твар, спрацаваныя, у вузлах і зморшчынах рукі, стаптаныя на падэшвах, стрэсканыя ногі і — ад грудзей па калені — гладкае-гладкае, белае-белае, маладое-маладое, яшчэ цёплае цела. Недагладжанае, недапешчанае, недалашчанае…

Мы купілі ёй самую прыгожую, якую толькі знайшлі ў Смаргоні, сукенку. Пры жыцьці пра такую яна і ня марыла.

Пры жыцьці, калі я пытаў: «Што падарыць табе на дзень нараджэньня?» — кожны раз адказвала: «А ты дай мне якую капейчыну, я сама сабе куплю што-небудзь…» І купляла парсючкоў. Каб вазіць мне і брату кілбасы, вяндліну… Цягала і цягала ў Менск тое мяса разам з трохлітровікамі марынаваных гуркоў, памідораў. Прыязджала з такімі клункамі, што не падняць. Калі мы казалі ёй, каб не гарбела, не цягала, бо ўсё ў крамах ёсьць, слухала, галавой ківаючы: «Ёсьць — і дзякуй Богу…»

Аднойчы, не паддаўшыся на яе хітрыкі з капейчынай, за якую сама сабе яна што-небудзь купіць, я завёў яе ў смаргонскую краму і купіў ёй футра. Назаўтра, калі мы справілі дзень яе нараджэньня і зьехалі, яна пайшла на кірмаш, прадала футра і купіла парсючкоў…

Днём ёй не было калі, а ўвечары, пакуль вочы бачылі, яна чытала… Беларускія кнігі, расейскія, польскія… Яе зьдзіўляла, што людзі ўсё пішуць і пішуць, калі ўжо ёсьць Сьвятое пісаньне, — і ёй цікава было: што ж яшчэ нехта можа прыдумаць, апроч таго, што прыдумаў Бог?

Трацiну жыцьця прарабіла яна бухгальтаркай у канторы машынна-трактарнай станцыі і расказвала майму малодшаму брату казку пра чарцяня зь іменем Бухгальтар, якое прыдумала бухгальтэрыю.

Бацька быў хворы на рак, сам ужо не ўставаў, і мы не казалі яму, што маці памерла, пакуль не прывезьлі яе дахаты ў труне. Вывелі яго, каб разьвітаўся, у пакой, дзе яна ляжала, і ён схіліўся да яе і спытаў, зь ёй жыцьцё пражыўшы: «Хто гэта?..» І я да сёньня — грудзьмі і сьпінай — помню, як працяло, наскрозь пранізала мяне гэтае, здавалася б, амаль вар'яцкае пытаньне.

Мы пахавалі маці ў Крэве, дзе яна нарадзілася і куды хацела вярнуцца на вечны спачын — да бацькоў, да дзядоў, да продкаў… Побач зь ёю пакінулі месца для бацькі.

Бацькавы продкі — на беразе Волгі, там ягоныя крэўныя магілы, і ён, ужо памёршы, не хацеў класьціся ў Крэве. Гэтак упарціўся, што, калі мы з братам везьлі яго ў труне зь Менску, спыняў нас, не даваў ехаць машыне, глушыў і глушыў, як спрактыкаваны мэханік, матор. Потым ён ляжаў, зьнясілены змаганьнем, у тым жа пакоі, у якім ляжала нядаўна маці, і я, стоячы на тым жа месцы, на якім ён разьвітваўся зь ёю, пытаўся, над труной схіляючыся: «Хто гэта?..»

…Некалі мы схіляліся з маці над хуткаплыннай вадой рэчкі Краўлянкі, адбіваліся ў ёй разам зь небам і аблокамі, і маці пыталася ў мяне, малога, на мой адбітак паказваючы: «Хто гэта?.. Ну, скажы, хто?..» Я кідаў у ваду, у неба з аблокамі камень — і ў кружным рабіньні на вадзе не ставала нікога.

* * *

Актрыса Ранеўская тэлефануе раніцой паэтцы Ахматавай і кажа, што ёй сьніўся Пушкін.
— Зараз жа еду, — адказвае Ахматава.

Калі мроіць нейкую супольнасьць, трызьніць нейкім (паэтавым над побытавым) узроўнем адносін, дык гэтакім.

* * *

Старацца казаць праўду, старацца пісаць праўду… А як бы гэта і казаць, і пісаць праўду, не стараючыся?..

## IN MEMORIAM



Памёр Ібрагім Ругова. Гэтага інтэлектуала ў заўсёднай шаўковай хусьцінцы , называлі балканскім Гандзі. Філёзаф, ён доўгі час узначальваў Саюз пісьменьнікаў Косава. Стаў лідэрам нацыянальна-вызваленчага руху, а пасьля прэзыдэнтам непрызнанай краіны. Дасягненьне незалежнасьці негвалтоўным шляхам ён лічыў галоўнай мэтай свайго жыцьця.



аповесьць

# Шлях дробнай сволачы

**ЕВА ВЕЖНАВЕЦ**

*Праўда сякеры — хлусьня для камля.*
*Праўды ў сьвеце няма. Ля-ля.*

**Любу, журналістку радыё «Вольная Беларусь», і яе сястру Віку, што працуе ў газэце «Савецкая Беларусь», нечакана выклікаюць дахаты бацькі. Успаміны дзяцінства хутка захінаюцца рэаліямі сучаснай Татаркі, дзе за яблык цкуюць сабакамі, а амурныя гісторыі нагадваюць старажытныя крывавыя баляды. На поплаве сёстраў перасьледуе дзіўная істота...**

**Працяг. Пачатак у № 2-3.**

Мы пабеглі ў лес, па каранях затарахцелі ровары. Кінуць іх мы не наважыліся — бацьк ўмелец сам зрабіў іх з ламачча (беражлівасьць і кемнасьць!). Пару разоў мы азіраліся і ўжо пачалі верашчаць на бягу — істота, прыгнуўшы лоб да нашых сьлядоў, валюхала ўсьлед. Хто гэта — ваўкалак, шалёны кундаль, рыжы забойца Іваські, вясковы вар'ят, прывід павешанага па восені пса? Гэтыя жахі мільгалі ў маёй галаве, і я ляцела ўсё хутчэй. Віка не адставала, аднак на бягу прапыхкала:

— Ён адзін, а нас двое, чаго мы ўцякаем?

— А ты насьмелісься зірнуць яму ў твар? — крынула я, і мы наддалі яшчэ.

Нейкім цудам праз дрэвы да нас данесьліся слабыя крыкі: «Любааа! Вікааа!» Крычаў мужчына.

— Любка, гэта чалавек! І наш чалавек! — усклікнула Віка.

Мы спыніліся і пачалі чакаць. Насустрач не пайшлі. Страх да канца не прайшоў.

— Чаго вы беглі? — запытаў знаёмы голас, і з-за дрэваў зьявіўся чалавек зь нейк дзіўна вывернутай галавой. Яна была нахіленая наперад, і чалавек выварочваў яе, каб пабачыць нас.

— Дзеўкі, гэта ж я так шыю зламаў, – сказаў мужчына, і мы пазналі нашага аднаклясьніка Рому. Рома рабіў інжынэрам па ТБ на крухмальню, а потым ажаніўся ды вярнуўся ў Дамашаны.

— Ромка, дзе ж ты так зьвярэдзіўся? — закрычалі мы.

— У Дамашанах мяне Квазымодам завуць. І анэкдот прыдумалі: «Стаяць два мэханізатары. Падыходзіць трэці, пытае: «Хлопцы, што гэта за Квазымода?» «А гэта наш інжынэр па тэхніцы бясьпекі».

Карацей, залетась упаў я са снопавязалкі. Тэхніка старая, дабітая, усё валіцца. Дый п'яны я быў. Ляжаў доўга, быццам зраслося, а потым перакрывіла так, што сьвету ня бачу. Далі інваліднасьць, дык я цяпер торфабрыкетны старажую. А чаго я гнаўся за вамі, дзеўкі: я тут запісаў словы пра Карачуна. Зусім гад заеў. Дык вы ж карэспандэнты — надрукуеце. Толькі майго імя не давайце. Ананімна. Я яму суд прайграў, хацеў, каб пэнсію далі, а ён даказваў, што я п'яны быў.



**Ева Вежнавец** — пісьменьніца. Жыве ў Менску.

— Карачун — дырэктар саўгасу?

— Гэта цяпер не саўгас, а «падсобнае хазяйства». Лукашэнка аддаў нас камбінату «Мінскдомбуд». А яны прывезьлі Карачуна старшынём. Хабар даў, паверце. Адукацыі няма, БіМСаХа завочна скончыў, ні вуха ні рыла не разьбірае, а ўжо як распанеў. Чацьвёртую жонку мяняе, у Менск мяхі шле, а людзям няма на што парсюка выкарміць. Вось я вам пакажу. Напісаў друкаванымі літарамі, ля клюбу раз павесіў, дык ён мяне сустрэў і кажа: «Рома, яшчэ раз убачу — зусім галаву адкручу!»

І Ромік працягнуў некалькі аркушаў са школьнага сшытка, сьпісаных старанным друкам. Там значылася:

«Жыцьцё калгасьнікаў в. Дамашаны пры дырэктару Карачуну Сяргею Іванавічу

Слова дырэктара для народу:

«У мяне ў калгасе дысцыпліна. Вось скажу бухгальтэрыі стаць ракам і насыпаць сабе пяску ў жопу — насыплюць».

«Маўчы, сука, бо застрэлю».

Прыехаў на торфаўчастак прыстраляць вінтоўку. Страляў па пустых пляшках. На полі працавала сям'я. Бацька й гаворыць: «Ну, а калі б, ня дай Божа, трапілі ў нас? Чаму не папярэдзілі, што страляцьмеце?» Дырэктар наставіў вінтоўку на дачку. Дзяўчынку доўга лячылі па бабках, крычала па начах.

Прыехаў дырэктар да буртоў. Палявода і кажа:

— Іванавіч, я працую ў выходныя, мне заробак трэба даць двайны.

— Раз табе належана, на табе, Ніна, на пляшку «Роднага кута», ды ідзі ты ў сраку.

І паляводка ўзяла дзьве тысячы, а потым доўга хадзіла ў пошуках роднага кута».

Унізе драбнюткім шрыфтам было напісана: «Пачытай і перадай другому».

Мы трымалі ў руках эмбрыён «Мужыцкае праўды». Праўда, выкідышам ён і застанецца. Не надрукуюць і не агучаць народную творчасьць ні ў «Вольнай», ні ў «Савецкай Беларусі». Для «Вольнай» гэта нефармат, ананімка, куды яе ўставіш? Дый ці не пра гэта мы вяшчаем удзень і ўночы? А «Саўбелія» не надрукуе, бо Карачун у вялікай ласцы. І ўвогуле, у дзяржпрэсы ёсьць правілы — каго валіць, а каго хваліць. Так і застанецца наш дамашанскі народ безгалосы. Ну, ля крамы ці ля клюбу павесяць, дый то наўрад. Пацерпяць-пацерпяць, а потым стог крыўдзіцелю падпаляць, сабаку яму атруцяць альбо самі павесяцца ці проста нап'юцца. Якое шчасьце, што ў Беларусі няма вольнага продажу зброі. Пачалася б партызанка па завугольлях — толькі пырскі ляцелі б. А так «беларускія вяскоўцы захоўваюць аптымізм і цярплівасьць», як піша «Звязда».

Мы нахлусілі Рому, што недзе пастараемся надрукаваць тэксьцікі, разьвіталіся ды пайшлі дахаты. Родненькія Дамашаны! Адмыцца ды ісьці на «Дажынкі». Сёньня мне ня трэба тыкацца зь мікрафонам да начальства — я апытаю сялян па хатах, Віка — менчукоў і Карачуна. Ля клюбу выстраіліся ў карэ прычапураныя камбайны і трактары, а таксама акуратныя МАЗы, што прыгналі на жніво менскія гаспадары. Снопавязалка, што скалечыла Рому, відавочна не прысутнічала. Наводдаль сталі легкавікі начальства, ачоленыя чыімсьці «мэрсэдэсам». Унутры камбайнава-трактарнага карэ гуло карэ людзкое. На прыступках клюбу ўзвышаўся стол зь белым абрусам, на ім — мікрафоны, хлеб-соль і стос тэчак з ганаровымі граматамі. За сталом з урачыстымі тварамі й выпнутымі жыватамі стаяла начальства — спрэс незнаёмае. Астатнія тры бакі карэ давалі цікавае відовішча — мясцовых камбайнэраў, паляводаў, трактарыстаў памяшалі з прыежджымі шофэрамі, і сінявата-барвовыя твары першых кантраставалі зь белымі здаровымі тварамі гараджанаў. Быццам мурыны й плянтатары зьмяшаліся ў адзіным парываньні. Зрэшты, аб'ядноўвалі іх чырвоныя стугі цераз плячо («участнік жатвы») ды выраз сьвяточнага чаканьня на тварах.

З жахам я пабачыла ў геройскіх шэрагах і свайго бацьку. Апошнія дні ён ляжаў на голых дошках з жорсткім прыступам радыкуліту. Пад сьпінай быў цьвікасты аплікатар Кузьняцова. І вось цяпер зьявіўся — не запыліўся, абы «Дажынак» не прапусьціць. Генэральская выпраўка сьведчыла, што на яго навязалі гарсэт і элястычныя пасы.

Віка ў пурпуровым нагавічным гарнітуры, прыгожая, быццам з таблёіду, стаяла з начальствам, сьмяялася і ківала галавою. Ледзь яна адышлася запісаць фанфары ды пад'ём сьцяга, які ажыцьцявілі сінятвары дзядзя Коля й малады менскі вадзіла, я злавіла яе і зашаптала: «Дзе будзе папойка — тут ці на Востраве?» «На Востраве», — адказала Віка. Вочы яе гарэлі, твар зьзяў. Узбуджаная, ладная Віка, яе возьмуць на сьвята. А мяне ня возьмуць на дажынкавы стол, дзеля якога скотнікі рэзалі цялушак і сьвіньняў, паляводы цягнулі капусту, буракі й гуркі, кухары са школьнай сталоўкі пяклі, варылі й смажылі, а канторскія бабы наразалі й накрывалі. Мяне ж, разам з адкідамі грамадзтва — настаўнікамі, паштаркамі, фэльчарыцаю, пэнсіянэрамі, дзецьмі й інвалідамі — на Востраў ня возьмуць і стужкі чырвонай праз плячо нам не навяжуць. Таму, паглядзеўшы на раздачу пашанотных грамат, я вярнулася да маці, сьціплай настаўніцы малодшых клясаў. Менш шаноўная частка нашай сям'і выпіла пляшку чырвонага віна і разышлася па пакоях. Я чытала, праслухвала свае запісы і нечакана заснула. Прачнулася ад трывожнага голасу маці. Яна званіла на сотавы Віцы.

— Што здарылася, мама? — запыталася я, выбегшы на лесьвіцу, дзе ў бацькоў вісеў тэлефон.

— Ноч на двары, сырасьць, аўтобусы вярнуліся, а твой бацька невядома дзе туляецца, і Віка ня ведае. Дый сама яна чортведама дзе — з кімсьці ў машыне, п'яная, я ж чую!

Востраў — сасновы лес з пагоркам, там стаіць помнік партызанам. На пляцоўцы за помнікам ладзяцца ўсе афіцыйныя папойкі. Чэпаць туды 9 км, таму ўдзельнікаў урачыстасьцяў заўжды развозіў саўгас. Адно зь дзьвюх — або тата пайшоў да кагосьці дагульваць, або недзе ляжыць на сырой зямлі з рэцыдывам радыкуліту.

Я загадала маці чакаць, апранулася і ўзяла ровар. Дзе таго бацьку шукаць? Звычайна ўдзельнікі «Дажынак» ці якога Дня мэханізатара перапіваліся так, што кагосьці забываліся ў лесе. Дык няўжо ж бацьку забыліся, як нейкага шараговага дзядзю Колю, і мне давядзецца пілаваць у той лес? Я ня надта сьмелая ў лесе. З роварам у руках я дайшла да суседзкага жываплоту. Там стаяла машына са згашанымі фарамі, а ля жываплоту нехта шабуршыўся.

— Гэй, хто там? — запыталася я.

— Цсссіха!!! — прашыпела Віка.

Я запаліла ліхтарык і пабачыла, што пакамечаная й распатланая сястрыца і нейкі гарнітурысты мужчынка падымаюць бацьку, які ляжыць на сырой перадвосеньскай траве! З радыкулітам!

— Што тут адбываецца?! — зараўла я.

— Ды цсссіха ты! Суседзі павылазяць, — зноў зашыпела сястра.

Зь яе аповяду я зразумела, што гэтыя сволачы развозілі людзей па хатах, выносілі й раскладалі ля весьніц, замяж перадаць сямейнікам. Вяскоўцы спалі сабе на сырой траўцы ў сваіх чырвоных стужках.

Мы ўтраіх ледзь узвалаклі бацьку на вэранду, далей не змаглі — мае габітус. З хаты выскачыла маці й загаласіла, праклінаючы бацьку, радыкуліт, «Дажынкі» й жыцьцё. Мы вынесьлі радыкулітныя дошкі й коўдры, ускацілі і накрылі непарушнае цела. Віка і яе ўхаджор падаліся дагульваць, маці легла, наплакаўшыся і папіўшы карвалолу, а я забаялася, што бацька ўночы затхнецца. Таму засталася на вэрандзе, слухаючы ягонае дыханьне. Заварыла каву, запаліла над ганкам ліхтар і села ля зашклёнае сьцяны, паглядаючы на бледную туманную вясёлку. Ангельцы адным і тым жа словам — туман — пазначаюць белыя хвалі, імглу, вадзяны пыл, няяснасьць, замяшаньне, невядомасьць, пацямненьне й зімовую атаву.

*Працяг будзе*


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Ціхі анёл над гняздом зязюлі

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

## Баляда пра трыццаць восьмы тралейбус

Трыццаць восьмы тралейбус запальвае свае бартавыя агні:
няма чаго болей рабіць на прыпынку — лепей на вышыні.

Палёты ўзімку? Ніколі. Ясна і крумкачу.
Але ў кіроўцы тралейбуса калядныя зоры ўваччу.

Надвор’е шэпча — нялётнае, і праўды няма ў крыле,
і сьвятлафор заікаецца на чырвоным сьвятле.

«Чырвоная Маска Сьмерці», — сказаў бы тут Эдгар По.
Але трыццаць восьмы тралейбус ня пойдзе сёньня ў дэпо.

У сьведкаў пад шапкай зімовай дыба ўстаюць валасы,
калі трыццаць восьмы ад ледзяной адрываецца паласы.

Як ад вальсу, галовы кружацца ў пасажыраў і іхных дам.
«*Тралейбус ляціць у неба. Наступны прыпынак — там…*

*Не забывайце аплачваць, — чуецца, як пароль, —*
*на паветранай лініі сёньня працуе кантроль…*

*Забараняецца размаўляць з кіроўцам увышыні…*
*Пераканаўчая просьба мацней падцягнуць рамяні…*

*Не кампастуйце талёнаў, маючы праязны…*
*Саступайце анёлам сталага веку, інакш саступяць яны…*

*Бізнэс-кляса для пасажыраў зь дзецьмі ды інвалі…*»
Болей абвестак зь неба не чуваць на зямлі.

Тралейбус ляціць уверсе, унізе плыве яго цень.
Нябесны дыспэтчар стаміўся лічыць:
трыццаць восьмы тралейбус за дзень!

## Валасы-2006

ціхі анёл праляцеў
над гняздом зязюлі

яшчэ адзінаццаць тысяч
тваіх маладых суайчыньнікаў
за цэлы год
не паглядзяць ніводнага фільму
Мілаша Формана

## Біятлён

Бітма набіты агульны вагон
сьпяшаўся за лякаматывам,
быццам караван біятляністаў
за лідэрам у зялёных штанах.

«Глядзі, мы абагналі сьвятлафор», –
узрадаваўся дзіцячы голас.
Ніхто не спрачаўся,
бо мы й напраўду набралі хуткасьць,
пакідаючы стадыён.

Папсовая музыка з дынамікаў
падбадзёрвала,
як галасы трэнэраў.

Дрэвы мільгалі за вокнамі,
як засьнежаныя
скандынаўскія заўзятары.

Сёй-той загадзя
рыхтаваўся да прыпынку,
папраўляючы заплечнік,
нібы вінтоўку за сьпінай.

А ты глядзела праз акно
на галінкі ў карунках шэрані,
а пасьля рамантычна прамовіла:
«Які сьнег!
Як там цяпер добра!
Зусім як учора ў Обэргофе,
па тэлевізары».

Я падумаў, што так, цяпер добра.
У Обэргофе.
У тэлевізары.
Учора.

# Перавагі сэксу на марозе




Адзіны ў нашых шыротах сваяк марское траскі робіць гэта цяпер. Піша **Сяргей Мікулевіч.**

### Рэкорд марозу пабіты

**Абсалютныя мінімумы тэмпэратураў зафіксаваны былі ў Менску 19 студзеня і ўначы з 19 на 20 студзеня. У чацьвер быў перасягнуты абсалютны мінімум дзённай тэмпэратуры: слупок тэрмомэтру не падняўся вышэй ад 22,6 градуса марозу. Дагэтуль рэкорд быў мінус 17,2 градуса (у 1969 годзе). А ўначы ў сталіцы пахаладнела да 28,6 градуса. Самая нізкая тэмпэратура ўначы на 20 студзеня раней была зафіксавана ў 1907 годзе (28 градусаў). Такім чынам, рэкорд быў пабіты праз 99 год. Агулам па краіне найхаладней было мінулай ноччу ў Езярышчы (Віцебская вобласьць) — 31,2 градуса марозу. Абсалютны ж мінімум студзеня для Менску — 39,1 градуса марозу (1940).**

У час, калі ўся беларуская зьверына, птаства і людзтва, стуліўшыся, чакаюць цяпла, у прадонных глыбінях, лябірынтах карчоў, таемных норах пачынаецца рух. Гэта абуджаюцца ментузы. Якраз цяпер у гэтае рыбіны — шлюбныя гулі. Сьцюжа ёй у смак: кроў іграе, калі паветра над вадою не праграецца больш за +5. Калі на паверхні +10, на ментузоў нападае мляўка. А поўная абыякавасьць да жыцьця надыходзіць пры +15: узьнікае неадольнае жаданьне залегчы пад корч і даць храпака.

Мянтуз — адзіны ў нашых шыротах сваяк марское траскі, цераз што мае пазялічаную (хоць і цалкам здаровую) пячонку. Вельмі спажыўную, дарэчы. Расьці гэты донны жыхар можа да неверагодных памераў. Бывае, пачуеш гісторыю пра ментуза, якога шчасьлівы рыбак, за жабры трымаючы, нёс на плячы, а хвост рыбіны па зямлі цягнуўся.

Кажуць, мянтуз ня мае костак. Удакладнім: лішніх ня мае. Адзін хрыбет. Іначай у донных барыкадах ня выжывеш. Селіцца гэтая дужая і плястычная рыбіна аднаасобна — у тапляках, пад берагамі, у быках мастоў, дзе найхаладнейшая вада. Як сапраўдны партызан, мянтуз камуфлюецца пад любое дно: на глеі ды тарфяніках ён чорны, на пясочку — жоўты ці леапардава-плямісты. У дадатак да такой вопраткі гэты фарсун мае вусы і мушкетэрскую бараду.

Калгасу мянтуз ня любіць. Харч здабывае сам-адзін. Паляваць выходзіць уначы — па халадку. І тады не трапляйся, жаба, у яго на дарозе.

# Забыты беларускі герой

**РУСЛАН РАВЯКА**

Я памятаю гэтага хлапца зь дзяцінства. Тады ён быў больш жвавы і папулярны сярод беларускай моладзі. За гэтыя гады ён аніяк не пасталеў, а паціху адыходзіць у нябыт.

Вася Вясёлкін — беларускі брэнд з прозьвішчам на расейскі лад. Ён мог быць Вясёлкам, Весялкоўскім, Весялковічам. Хлопчык, што нарадзіўся разам зь дзіцячым часопісам «Вясёлка», так і ня стаў вядомаю асобаю сярод малых беларусікаў.

Лёс Васі паказвае ўзровень нашых нядрэнных ідэяў. Яны ліпеюць, калі не канаюць. Вясёлкін мог бы падарожнічаць па стракатых коміксах на старонках «Вясёлкі», удзельнічаць у дзіцячых фэстах, музычных ці літаратурных конкурсах. «Залатым Вясёлкіным» маглі б узнагароджвацца маладыя таленты.

З усіх твораў мне вядома толькі «Казка пра цара зубра» Васіля Віткі пра прыгоды Васі Вясёлкіна ў Белавескай пушчы, дзе хлопец ледзь не пачынае вайну са зьвярыным царствам, але пры канцы зубр адпісвае на Вясёлкіна ўсё царства. Вася паўстае ў творы як сапраўдны савецкі супэрмэн:

> Меў Васіль наган пры боку
> Меў надзейны меч шырокі —
> Нержавеючы,
> Фанэрны,
> Да канца
> Герою верны...

На жаль, Васіль такі ж непапулярны сёньня, як і яго хатка — часопіс «Вясёлка». Супрацоўнікі дзіцячага выданьня прайграюць вайну расейскамоўным канкурэнтам, у якіх маюцца і коміксы з маляванкамі, і розныя выразанкі-складанкі. Вясёлкін застаўся на ўзроўні стандартаў БССР, сілкуючыся зь дзяржаўных грошай, ня здольны да канкурэнцыі.

Дарэчы, калі «Вясёлка» ня здолела скарыстацца перавагамі свайго брэнду, гэта зрабілі іншыя.

Гумовага Васю я набыў у баранавіцкім ўнівэрсаме «Радуга». (Вельмі сымбалічна, калі перакласьці назву на беларускую). Прычым не адразу. Маладая прадавачка мовіла: «Васю… Васю разабралі. Пачакайце, хутка будзе новы завоз». Яна расказала мне, што цацка вельмі добра прадаецца. Нехта сьцяміў, што Вясёлкіна добра прэзэнтаваць замежнікам. Розных гумовых сабак і вавёрак можна купіць па ўсім сьвеце, а Вася «жыве» толькі ў нас.

*Баранавічы*



# Бавіць жаба жабяня

Каля возера штодня
Бавіць жаба жабяня.
Абдымае лапкаю,
Называе жабкаю.

**З украінскае паводле Івана Малкавіча пераклаў Мікола Бугай**

# Калі пачынаць?

Анатоль Аніська мае першы разрад і па шахматах, і па шашках. Навучае правілам гульняў малых у цэнтры дзіцячай творчасьці аднаго з раёнаў сталіцы. «Зь якога ўзросту лепш пачынаць гуляць у шашкі?» «Зь любога, а найлепш — з 5—6 гадоў, — кажа сп.Аніська. — Лёгіка шашак прасьцейшая, чым у шахматах, таму навучыцца добра гуляць можна хутка».

Нетаропкія шашысты сядзяць у абароне — апошнім часам «на шашкі» не набіраецца групы. Сп.Аніська выкладае ў адной групе і шашкі, і шахматы. На яго думку, галоўнае, каб бацькі правільна арыентавалі юных шашыстаў у псыхалягічным пляне і ў выніку не было сьлёз, крыўдаў… «Бо прыходзіць хлопчык, у сваім двары ўсіх абыгрывае, а ў гуртку раз-другі пацярпеў паразу — і кідае гульню. Зрэшты, цяпер мала моцных гульцоў. Нядаўна праводзіў першынство раёну сярод настаўнікаў — дык яны гуляюць слабей за маіх вучняў».

**ВР**



Вучэбная пазыцыя ад менскага майстра Мікалая Грушэўскага. Белыя выйграюць камбінацыйным шляхам.

**Адказ:** 1. e3-d4! c5:c1 2. h4-g5! h6:f4 3. e1-d2! c1:e3 4. a3-b4 a5:c3 5.b2:d4:f6: d8:b6:f2 зь перамогай. Шашка f4 паслужыла «шлагбаўмам» для чорнай дамкі.

# Збор сродкаў на кнігу Сыса

У Рэчыцы (Гомельшчына) рыхтуецца зборнік паэзіі Анатоля Сыса. Сродкі можна пералічваць на рахунак аддзелу культуры Рэчыцкага райвыканкаму № 373 500 017 0040 у філіяле № 323 АСБ «Беларусбанк», УНН 400001176.

Кожны, хто дапаможа, прытуліцца да выданьня, будзе згаданы ў кнізе.

НАЖЫ для акуратнага разразаньня паперы прапануе ЦУМ.



Самы танны каштуе 550 рублёў, самы дарагі — 6000 рублёў.

# «Песьні свабоды»: складзем дыск разам!

Увага! Рыхтуецца да выданьня альбом беларускай музыкі «Песьні Свабоды».

Выдаўцы зьвяртаюцца да чытачоў «Нашай Нівы» з просьбай прапанаваць пяць песень, якія найбольш вартыя для гэтай складанкі.
Просьба запоўніць купон і даслаць на адрас: **а/с 5, 220085 Менск, (для Віталя). Таксама можна скарыстацца e-mail: pesni2006@tut.by.**

Кожны, хто дашле купон, атрымае ў ПАДАРУНАК кампакт–дыск! Дасылайце купон да 15 студзеня. Выканаўцы, што жадаюць прапанаваць свае творы, могуць зьвяртацца па вышэй пазначаных кантактах.

| **Назва гурту** | **Назва песьні** |
| --- | --- |
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |
| 5. | |
| **Імя** | **Кантакт (e-mail, тэлефон)** |



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Зрабі з газэты кнігу

«Нашу Ніву» ў новым фармаце зручна пераплятаць у квартальнікі ці гадавікі.



**Пераплётныя паслугі ў Менску:**

**«Апэратыўнае тыражаваньне»**
Тэл. 284–68–18, 284–72–17, 284–81–07,
8–029–6–400–100
Выезд, дастаўка.

**«Аўрора-плюс»**
Вул. Варвашэні, 3
Тэл.: 284–81–84,
284–32–72

**«Данарыт»**
Вул. Чарнышэўскага, 10, оф. 37а
Тэл.: 285–79–29,
8–029–645–99–54

**«Інфамаркет»**
Вул. Харужай, 3, оф. 307В
Тэл.: 284–37–07,
8–029–622–83–01,
8–029–622–83–04

**«Karandash.by»**
Падземны пераход паміж БДУ і БДПУ
Тэл.: 22–77–133
Працуюць і ў сьвяты, і ў нядзелі.

**«Паліграфічныя паслугі»**
Тэл.: 8–029–388–40–82,
8–029–570–74–11,
8–029–400–48–55

**«Фармат»**
Вул. Пугачоўская, 3, оф. 38 (рог Варвашэні і Чырвонай)
Тэл.: 8–029–758–06–16, 774–62–13,
8–029–341–17–29

**«Чэркас»**
Вул. Цэткін, 18
Тэл.: 211–00–63/64/65, 226–45–48,
8–029–643–80–77

Пераплёт таксама робяць **Нацыянальная бібліятэка** (вул.Чырвонаармейская, 7) і **Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа** (вул.Сурганава, 15).

## ВЫСТАВЫ

**Калесьнікаў**
**27 студзеня** (пятніца) а 18–й у галерэі візуальных мастацтваў Nova (Купалаўская бібліятэка, Менск, вул. Харужай, 16) — адкрыцьцё выставы фатаздымкаў Андрэя Калесьнікава «Ляндшафт, які зьнікае».

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**
**27** (пт) — «Парфён і Аляксандра».
**28** (сб) — «Чычыкаў».
**29** (ндз) — «Памінальная малітва».
**30** (пн) — «Сымон–музыка».
**ранішнія спэктаклі**
**29** (ндз) — «Афрыка».
**малая сцэна**
**27** (пт) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**29** (ндз) — «Баляда пра каханьне».

## КІНО НА DVD

**Master Records**
**Бясконцы адпачынак**
Драма, ЗША, 1980, рэж. **Джым Джармуш**.
У ролях: **Крыс Паркер, Сара Драйвэр.**
Паўнамэтражны дэбют Джыма Джармуша пра вакацыі юнага жыхара Мангэтана. Калярытныя пэрсанажы, абібокі — і чэхаўская туга…
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Матэматыка прыязнасьці й шаленства

**Доказ** (Proof).
ЗША, 2004, каляровы, 100 хв.
**Жанр:** драма паводле п’есы Дэвіда Обэрна.
**Адзнака:** 5 (з 10).

Па сьмерці бацькі, геніяльнага матэматыка–вар’ята (Энтані Хопкінз), Кэтрын (Гвінэт Пэлтраў) баіцца таксама звар’яцець. Гераіня сумняецца ў сваім розуме, і яе каханьне да маладога чалавека праходзіць выпрабаваньне.

Як і карціна «Гульні розуму», «Доказ» распавядае пра матэматыку й трызьненьне — і складаную прастату чалавечага жыцьця. Але фільм Джона Мэдэна («Закаханы Шэксьпір») статычны й тэатральны.

Замест параноі «Гульняў» — засяроджанасьць і гістэрыка, замест шызоідных ворагаў — клапатлівы прывід бацькі. І кіно набывае рысы мэлядрамы. Толькі мэлядрама гэтая рацыянальна–халодная, як апошнія праблёскі розуму, дзе доказ каханьня шукаецца ў формулах.

Любоў немагчыма даказаць алгебрай.

**Андрэй Расінскі**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 28 студзеня

**«Лад», 13.10**

«Маці ўрагану».

Беларусь—Чэхія, 1990, рэж. Юры Марухін.

Экранізацыя раману Уладзімера Караткевіча аб крычаўскім паўстаньні.

Рэжысэр — і апэратар — Юры Марухін надаў вялікую ўвагу візуальнаму вырашэньню.

Генадзь Гарбук нечаканы ў ролі Васіля Вашчылы.

**АНТ, 13.45**

«Пярсьцёнак цмока»

Італія, 1994, рэж. Ламбэрта Бава.

Казачны сэрыял.

Прынцэса Сальваджыя імкнецца завалодаць чароўным пярсьцёнкам, каб пераўтварыць ваўкоў у людзей. Злой чараўніцы замінае добрая сястра…

Рэжысэр тэлеказкі — аўтар культавых жахавак.

**БТ, 19.20**

«Як важна быць сур’ёзным».

Вялікабрытанія—Францыя, 2002, рэж. Адывэр Паркет.

Камэдыя паводле п’есы Оскара Уайлда.

Ролі выконваюць: Рупэрт Эвэрэт, Колін Фёрт, Фрэнсіс О’Конар.

**АНТ, 21.05**

«Малады Казанова».

Італія—Вялікабрытанія, 2001, рэж. Джакома Баціата.

Авантурная мэлядрама.

Пачатак кар’еры знакамітага палюбоўніка…

**СТВ, 23.40**

«Рэканструкцыя».

Данія, 2003, рэж. Крыстафэр Баэ.

Драма.

Пасьля праведзенай разам ночы мужчына й жанчына спрабуюць узнавіць мінулае…

«Залатая камэра» ў Канах і шчэ 16 узнагародаў. Крытыкі назвалі Крыстафэра Баэ творчым нашчадкам Ларса фон Трыера.

### Нядзеля, 29 студзеня

**БТ, 19.25**

«Насьця».

Расея, 1993, рэж. Георгі Данэлія.

Трагікамэдыя па казцы Аляксандра Валодзіна.

Насьця марыць быць прыгажуняй. Мясцовая бабулька–чараўніца мару спраўдзіла. Але шчасьце прыносіць не прыгажосьць…

**АР**

## калі б...

**...улады пачалі выкарыстоўваць перамогу беларускі на конкурсе «Супэрмадэль» у якасьці палітычнага піяру.**




«Чырвоны ж!
Куды ты глядзіш?!»

**...Цэнтравыбаркам вызнаў, што Лукашэнка, як і Мілінкевіч, вядзе папярэднюю выбарчую прапаганду, і забараніў яе.**



«Што за фігня?
Па БТ з ранку да вечара
паказваюць адно
«Наша лато».

**...у Беларусі ў выніку марозу надышоў ледніковы пэрыяд.**




«Прафэсар, ці не
здаецца вам, што
гэтая катастрофа
была сплянаваная?»

**Малюнкі і тэкст Лёліка Ушкіна**

## У НУМАРЫ


### Каму выгадная рэгістрацыя Пазьняка?



Гэтым разам уладзе не да элегантнасьці... **Старонка 6.**

### Як адбываецца сачэньне



Прыклады Зарамбюка й Кацоры сьведчаць: думайце, перш чым гаварыць па мабільніку. **Старонка 16.**

### Гангста-рэп зь Беларусі



Самы сакрэтны гурт краіны запісвае першы легальны альбом, каб выйсьці на эўрапейскі рынак. Піша Сяргей Будкін. **Старонка 18.**

### Перавагі сэксу на марозе



Адзіны ў нашых шыротах сваяк марское траскі робіць гэта цяпер. Піша Сяргей Мікулевіч. **Старонка 43.**

### Не шкадуй жывата свайго



Як беларускі хлопец Антон Анціпаў стаў амэрыканскай супэрмадэльлю. **Старонка 30.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Жанчына 38 гадоў** зь Менску пазнаёміцца з мужчынам-беларусам для сур'ёзных адносінаў. Т.: 272-32-54, 029-255-25-33. Наталя

### ЗГУБЛЕНАЕ

**Згублены студэнцкі** білет EHU 0042 на імя Рыдзеўскай Алены лічыць несапраўдным

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Газэту «Наша Ніва»** можна набыць у Гомелі штонядзелю. Т.: 45-11-51

**Распаўсюд.** Абмен. Гісторыя, фальклёр, постмадэрнізм, літаратура, псыхалёгія, канфэрэнцыі, круглыя сталы, кнігі, аўдыё, пошта, Інтэрнэт. Зьвяртайцеся на e-mail: alesknigi@mail.ru, 220030, Менск, а/с 195

**Зборнік «Яна і я.** Вершы і песьні пра каханьне» — файны падарунак да дня сьв. Валянціна

**Прадам кнігі:** Віньніцкі «З гісторыі беларускай эміграцыі на Нямеччыне 1939—1951», «Армія Краёва на Беларусі», «Тэўтонскі ордэн», І.Насовіч «Слоўнік беларускай мовы», факсым. выд. 1870 г., Ластоўскі «Кароткая гісторыя Беларусі» 1910 г., факс. ды інш., гісторыя, архітэктура, мастацтва. Т.: 753-70-05

**Прадам:** слоўнік Ластоўскага «Беларускія народныя строі» М.Раманюка, «Археалёгію Беларусі» (т.2, 3). Т.: 234-93-71, 707-40-01 (Сяржук)

**Прапаную:** «Беларускі клясычны правапіс», «Нашу Ніву» (факс. выд.), «Матэматычную энцыкляпэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753-91-96

### СПАЧУВАНЬНЕ

**Сябры выказваюць спачуваньне** паэту Юр'ю Гуменюку з прычыны сьмерці бацькі. Ігар Юзафавіч Гумянюк памёр 24 студзеня на 72 годзе жыцьця. На працягу амаль двух гадоў (2004–2005) у беластоцкім выданьні «Czasopis» друкавалася эсэ Юр'я Гуменюка «Прывід даўніх Крэсаў», прысьвечанае Горадні, — паэт напісаў твор паводле ўспамінаў бацькі, стварыўшы яму адмысловы помнік.

## ЖАРТЫ

— Матулька, а што такое таталітарызм?

— Гэта, дачушка, калі глядзіш БТ, а там тры дні запар пажар у Бразыліі паказваюць.

Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e-mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Коўна.** Горад гэты чыста літоўскі. Усюды чутно, як ліецца вольнай хваляй іх родная гутарка. Народ літоўскі — цяпер сьвядомы народ. Калісь ён, як і мы, быў цёмны і цураўся сваёй мовы і звычаяў, але апошнім часам зразумеў цану ўсяго свайго роднага, абудзіўся зь векавечнага сну і падняў высока сваё нацыянальнае знамя. Яны ўжо цяпер не стыдаюцца сваёй мовы.

У Коўні маюць вельмі важнае таварыства Saule. Штогод з курсаў гэтага таварыства выходзяць народныя вучыцелі — сьвядомыя грамадзяне і патрыёты. Яны ідуць у курныя хаты сваіх братоў, нясуць асьвету. Эх, браты! Цяжка жыць на чужой старонцы, сярод чужых людзей і звычаяў. Тут толькі пазнаеш, што такое родная мова і як яе трэба шанаваць. Эх! Так, здаецца, стаў бы сярод Нёману і паляцеў бы птушкай на Бацькаўшчыну Беларусь!

**Павал Аляксюк**

**«НН». №4, 27 студзеня 1911 г.**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**У.Рыс-цу.** З Вашым лістом азнаёмім Т.Горн.

**Юр'ю Г.** зь Менску. «Даставіць тры-чатыры дадатковыя асобнікі №3» пакуль ня можам — наклад увесь разышоўся падпісчыкам, на запас і на пункты продажу. Пашукайце тамака.




Хочаце адпачыць

**1 лютага?**

**19.00**

Для Вас у Філярмоніі лёгкая клясычная музыка. Ансамбль салістаў «Клясык-Авангард» прадстаўляе канцэртны дуэт: Алена Мальцава (скрыпка) і Ірына Аўдзеева (фартэпіяна). Прагучаць Сэн-Санс, Веняўскі, Крайсьлер, П'яцола, Шнітке, Гершвін ды інш.



**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 2521.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 21.00 25.01.2006.

Замова № 466.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а